№ 12 (418) 1 красавіка 2005 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы



### Піраны перазімавалі

ў Белым возеры. Зь веснавою вадою рыбы-эмігранткі непазьбежна трапяць у вадаёмы Палесься.

старонка 2

### Помнік камісарам

Да 75-годзьдзя Саюзу вызваленьня Беларусі. Артыкул Анатоля Сідарэвіча.

старонка 14

### Калі гучыць Стома

Пераадкрыцьцё геніяльнага кампазытара.

старонка 8

ПРЭЗЫДЭНТ-2006

### Набор у касманаўты

У сьпісе кандыдатаў на прэзыдэнцтва — спрэс партыйцы. Статкевіч, Колас, Вайтовіч не зарэгістраваліся паводле працэдуры, вызначанай «дзясяткай». **Старонка 3.**

АБМЕН ВОПЫТАМ

### Эфэкт лямпачкі

Паўгоду таму я набыў кватэру на апошнім паверсе дзевяціпавярхоўкі. Калі ў першы раз зламаўся ліфт, высьветлілася, што на лесьвічных пляцоўках не гарыць ніводная лямпачка. **Старонка 13.**

АДУКАЦЫЯ

### Фінская мадэль школы

Няма адказаў ля дошкі і нечаканых кантрольных. Пануе поўная свабода ў форме адзеньня. Вучні могуць слухаць музыку і хадзіць па кабінэце ў часе заняткаў. Сярэдняя зарплата настаўніка складае больш як 2700 даляраў. Школа мараў? Не — фінская школа. **Старонка 11.**

ЛІТАРАТУРА

### Сага пра выбарчую скрынку

Вось яны нам гавораць, што нават у гэтых азіятаў плястыкавыя скрыні для бюлетэняў, і ўсё відно, што там ляжыць і як. А нашая скрынка праверана часам. Накшталт пасылачнай. Экалягічна бясьпечная — выкінуў яе, і яна растворыцца ў прыродзе. Апавяданьне Сяргея Астраўца. **Старонка 18.**

### Дык падпісвайся!

Падпісны індэкс «Нашай Нівы» 63125. Падпіску на «НН» прымаюць на любой пошце, а ў Менску — і на шапіке «Белсаюздруку». Цана на месяц — 3820 рублёў на поштах або 3530 рублёў на шапіке «Белсаюздруку». «Наша Ніва» — гэта 24 старонкі без чужога слова штотыдзень. Чытай сваё!

# Дзьве Беларусі

Улады зрэагавалі на падзеі 25 Сакавіка стэрэатыпна — крымінальнай справай. Ніводзін мускул на твары АНТ ня выдаў, як шмат людзей пасьля падзеньня Акаева страпянуліся ад пачуцьця непазьбежнасьці пераменаў. Пратэстны патэнцыял Другой Беларусі высокі, і справа толькі за лідэрам, які пяройдзе Рубікон. На фота: твар у твар з амонаўцам Зьміцер Гарбуноў. Яго арыштуюць і прысудзяць да штрафу 1 мільён 200 тысячаў рублёў. Пераварот у Кіргізіі, пэрспэктывы Беларусі — **старонкі 2–6**.



PHOTO.BYMEDIA.NET

# Рост ці разьвіцьцё?

Ці ўстойлівы той эканамічны рост, які дэманструе беларуская гаспадарка? Ці адбываецца разам з ростам экономікі яе разьвіцьцё? Бо адзін колькасны рост нічога ня варты — расьці можа і сьметнік. Беларуская гаспадарка праз прызму тэорыі нобэлеўскага ляўрэата Саймана Кузьняца — артыкул эканаміста **Ўладзя Калупаева**.

Цягам дзесяці гадоў Беларусь апярэджвае па тэмпах эканамічнага росту разьвітыя краіны. Між тым адзіны сярод ураджэнцаў Беларусі нобэлеўскі ляўрэат у галіне эканомікі Сайман Кузьнец пісаў: любая краіна можа дасягнуць стану разьвітай рынкавай эканомікі, калі пройдзе стадыю так званага сучаснага эканамічнага росту (ключавы тэрмін, пакладзены ў назву ягонай кнігі «Modern Economic Growth», 1966). Для гэтага хуткі эканамічны рост (10% у год) павінен выклікаць працяглы «разбуральны» працэс — прывесьці да значных структурных зрухаў у гаспадарцы і сацыяльнай структуры грамадзтва, да кардынальных зьменаў ва ўмовах жыцьця і працы, а таксама да скарачэньня нараджальнасьці.

Ці выйшла Беларусь на стадыю сучаснага эканамічнага росту?

Працяг на старонцы 12.

## 50 РАДКОЎ РЭДАКТАРА

МАСТАЦТВА ІНДЫКА. Паводле зьвестак ураду, у 2004 годзе валавы ўнутраны прадукт перавысіў узровень 1990 году на 15,7%. У мяне няма вялікае веры статыстыцы, якая больш клапоціцца пра выкананьне плянавых паказчыкаў, чым пра фіксацыю рэальнасьці. (Адгадайце, шаноўныя купцы і плацельшчыцы, на колькі вырасьлі цэны за першыя два месяцы 2005 году? Правільны адказ: на 1,7%. Крыніца: Міністэрства эканомікі.) Аднак па мастацтве індыка, бязь вестак зьніклага зь беларускіх прылаўкаў, па здольнасьці ўражваць ворагаў выглядам мы, на шчасьце, яшчэ не вярнуліся да ўзроўню 1990 году. І, трэба меркаваць, што лічба +15,7 адпавядае рэальнасьці. Кампэнсацыйны рост прывёў да поўнага выкарыстаньня савецкага эканамічнага рэсурсу, а прыростам заўдзячваем большай эфэктыўнасьці працы рынкавай эканомікі ў параўнаньні з гаспадаркай савецкай, перавагам прыватнага сэктару, а таксама кампутарызацыі. Асноўнае пытаньне — як надоўга хопіць савецкага рэсурсу? Ці дастаткова ўнутраных інвэстыцый і крадзеных тэхналёгій для разьвіцьця? Артыкул эканаміста Ўладзя Калупаева — **старонка 12**.

БЕСПАРАДКІ. Узбуджаная крымінальная справа «па факце масавых беспарадкаў» на 25 Сакавіка. Як па-нармальнаму, правасудзьдзю варта разабрацца, хто правакуе беспарадкі, рэгулярна адмаўляючы грамадзянам у гарантаваным канстытуцыяй праве на свабоду сходу, хто кідае амонаўцаў супраць «узброеных» сьнежкамі пікетоўшчыкаў. На гэта няма спадзеву. Але хай справу зьбіраюць. Scripta manent. Хроніка супрацiву — **старонка 6**.

«СВБ». Артыкул Алеся Аркуша «Рызыкоўная змова намэнклятуры» выклікаў бурную рэакцыю, нават на старонках соннага «ЛіМу». Анатоль Сідарэвіч папраўляе Аркуша, але перадусім аднаўляе панарамную карціну падзеяў 1929—1930-га. Гісторыя Беларусі — **старонка 14**.

## ПОШТА РЭДАКЦЫІ

### Беларусы — народ прагматычны

25 сакавіка рэвалюцыі не адбылося. Не ўдалося. Рэвалюцыя ня можа выбухнуць з волі аднаго палітыка.

25 сакавіка на Кастрычніцкую плошчу выйшлі 2000 чалавек — прадпрымальнікі, студэнты, а таксама людзі, якіх можна ахарактарызаваць як «тыя, каму ня ўсё адно», людзі, для якіх Дзень Волі — сьвята. Але падчас акцыі было больш амапаўцаў, чым дэманстрантаў — суцэльная сьцяна з касак і шчытоў, такая шэрая сьцяна. Шэрая сьцяна страху. Страху перад магчымымі зьменамі. Страху страціць уладу.

У палітыкаў магчымы многія неймаверныя рэчы. Возьмем Кіргізію — сытуацыя ў Бішкеку кардынальна зьмянілася за лічаныя гадзіны, але — адчуйце розьніцу — хваляваньні ў Кіргізіі пачаліся з нагоды парлямэнцкіх выбараў, менавіта фальсыфікацыі падштурхнулі народ на вуліцы.

Беларускія рэаліі застаюцца беларускімі рэаліямі. Беларусы — народ прагматычны. Сьвята БНР можна адзначыць у больш прыемнай кампаніі, чым амапаўцы з дубінкамі. Было б жаданьне! Другая справа — выбары прэзыдэнта, тут магчымы іншы сцэнар разьвіцьця падзей.

**Дар'я Ліс, Менск**

Іншыя лісты — старонка 14.

# Рэвалюцыі аранжавыя, ружовыя і колеру круглага стала

Зьмена ўлады ў Кіргізіі была для беларусаў як гром сярод яснага неба. Каб усенароднаабранага прэзыдэнта асобныя хуліганствуючыя элемэнты павалілі за адзін дзень? Не, такога мы і ў страшным сьне сабе ўявіць ня можам.

Беларускія палітолягі таксама выявілі ў гэтым пытаньні свой акадэмізм. Шаноўны Віталь Сіліцкі ў сьвежым нумары часопісу «ARCHE» запэўнівае, што пасьля Ўкраіны пераваротаў у СНД чакаць ня варта. Вуліца можа мець значэньне, толькі калі на яе выйдуць сто тысяч чалавек, зьвіклі думаць палітолягі. Як і беларускія сацыёлягі, яны абсалютызуюць яго вялікасьць працэнт.

Між тым у кіргіскім выпадку апазыцыя нават не прэтэндавала на тое, што яна атрымала большасьць галасоў выбарцаў. У лепшым выпадку — чвэрць. А рэжым усё адно зваліўся — «як сьпелая груша», сказаў адзін расейскі публіцыст. Як раней у Кіеве ці Тбілісі, варта было рашучай, узброенай ідэяй меншыні выйсьці на плошчу і сказаць: «У адставку! Радзіма, свабода! Прэч!» — як рэжым паскідаў транты ў «мэрсэдэс» дый паслухмяна паехаў прэч. А плястыкавыя галовы АМОНу палічылі за лепшае расступіцца. Лепш атрымаць па галаве, чым застацца без душы.

Галоўная выснова з Кіргізіі: рэвалюцыю могуць зрабіць і некалькі тысяч рашуча настроеных людзей. Калі няма дэмакратыі. Калі няма свабодных выбараў як мэтаду вырашэньня грамадзкіх спрэчак. Бо ніякія вулічныя пратэсты няздольныя пахіснуць дэмакратычную ўладу, абраную на свабодных выбарах.

Чаму ж у Беларусі ў 1996-м 50-тысячныя дэманстрацыі не прывялі да рэвалюцыі? Адказаў напрошваецца тры. Першае і галоўнае — Лукашэнка тады быў абраны на свабодных выбарах, і нават пракудны Захад ня ставіў гэтага пад сумнеў. Па-другое, Лукашэнка тады цешыўся актыўнай падтрымкай большасьці грамадзянаў. Па-трэцяе, лідэры тагачаснай апазыцыі не былі гатовыя ўзяць на сябе адказнасьць за разьвіцьцё падзей у краіне, ім было зручней заставацца ў апазыцыі, у вечнай інтэлігенцкай апазыцыі.

Што мы маем сёньня? Падтрымка Лукашэнкі калі й ёсьць, дык пасіўная, і то вельмі-вельмі пасіўная. Яму не застаецца нічога іншага, як абапірацца на разбрынялыя і канкуруючыя сілавыя структуры, прынізьліва чапляючы ўзнагароду за ўзнагародай на грудзі аднаго шчыра праваслаўнага палкоўніка.

Пра справядлівасьць апошніх выбараў і рэфэрэндуму значная частка грамадзтва мае вельмі пэўную думку, і гэта адпаведным чынам адбіваецца на легітымнасьці гэтай улады у вачах грамадзтва.

На пытаньне ж пра лідэра апазыцыі адказалі падзеі 25 Сакавіка. Тыя людзі, што адгукнуліся на экстравагантны заклік Андрэя Клімава. Што выйшлі ня дзеля Клімава, а дзеля Дня Волі. Але што ня выйшлі б на Дзень Волі, калі б ня урвіс Клімаў. Тая палкасьць, зь якой гэтыя хлопцы кідалі выклік амону. Галоўная выснова з Дня Волі: патэнцыял пратэсту ў грамадзтве высокі, і справа, магчыма, толькі ў лідэры, які пяройдзе Рубікон.

Улады зрэагавалі на падзеі 25 Сакавіка стэрэатыпна — крымінальнай справай. Ніводзін мускул на твары АНТ ня выдаў, як шмат людзей пасьля падзеньня Акаева і нашага 25 Сакавіка страпянуліся ад пачуцьця *непазьбежнасьці* пераменаў.

Напэўна, нас чакае новы ўсплёск абмеркаваньняў, белай, залатой ці проста пад нацыянальным сьцягам ёй быць. Але ня трэба забывацца, што рэвалюцыя можа быць і колеру круглага стала. І такі кшталт, дарэчы, нашмат больш адпавядае беларускай палітычнай культуры.

Як ні стараліся, лукашэнкаўцы ня здолелі сьцерці другую Беларусь — Беларусь Быкава і Ліцэю, вясковых гаспадароў, рок-музыкаў. Ці лукашэнкаўцы акажуцца дастаткова разумнымі, каб зразумець гэта ўпару, як генэрал Ярузэльскі? На сумленьні ягоных малойчыкаў чарнелі жахлівыя злачынствы — і ксёндз Папялушка, і расстрэл рабочых у Радаме. Але, скарыстаўшыся з аслабленьня савецкага кантролю, генэрал Ярузэльскі арганізаваў круглы стол у час, калі «Салідарнасьць» была бледнай копіяй самой сябе. Польшча перайшла ў іншую якасьць, і замацаваў яе камсамолец Квасьнеўскі, а Ярузэльскі жыве на сваю генэральскую пэнсію…

Ці задумаецца пра гэта Лукашэнка, летучы 4 красавіка да Пуціна над стэпамі Ўкраіны, што абуджаюцца пад веснавым сонцам? Вядома, не, яшчэ раз не і сто разоў не, скажуць шаноўныя палітолягі, і прафэсар Манаеў падмацуе іх сваімі апошнімі зьвесткамі. І градус грамадзтва ня той, і тэмпэрамэнт прэзыдэнта, і Лукашэнкава палітычная эліта ў сваіх марах пакуль не глядзіць вышэй за крэсла кансультанта «Татнафты». І самае паскуднае, што ў гэтым выпадку палітолягі сапраўды маюць рацыю, а ідэя круглага стала належыць сфэры чыстых ідэяў… Хіба, яна будзе запатрабаваная не пры Лукашэнку, а ў невядомым *пасьля* Лукашэнкі. Хай хоць так.

Ня трэба параўноўваць Польшчы з Румыніяй, каб сказаць, што дэмакратызацыя праз самы абшарпаны круглы стол лепшая за дэмакратызацыю праз самую зыркую рэвалюцыю. Толькі ў Беларусі шанцы на круглы стол сыходзяць як дым. Вось пра што нагадалі падзеі ў Бішкеку і Менску, якія хочаш ня хочаш, а ўстаюць у адзін шэраг.

**Барыс Тумар**

### Аб скліканьні Трэцяга Ўсебеларускага сходу інтэлігенцыі

Шаноўнае спадарства, калегі, аднадумцы!

Сёньня мы з вамі вызначаем лёс нашай Радзімы на далёкую пэрспэктыву.

Менавіта ад нашай актыўнасьці, мэтанакіраванасьці і салідарнасьці залежыць будучыня нашага народу.

Інтэлігенцыя нясе галоўную адказнасьць за асэнсаваньне працэсаў у краіне, фармаваньне грамадзкай думкі, давядзеньне яе да народу і ўлады.

Мы з вамі ня можам ухіляцца ад гэтай важнай і адказнай місіі, якой бы цяжкай яна ні была ў сёньняшніх умовах.

У сучасных умовах, калі склалася, а часам нават небясьпечна мець сваю пазыцыю, адкрыта выказваць свае думкі, адстойваць свае прынцыпы, нам можа дапамагчы толькі наша кансалідацыя.

Нам неабходна абмеркаваць становішча, у якім апынулася навуковая, тэхнічная і творчая інтэлігенцыя, умовы, у якіх працуюць урачы і настаўнікі, асэнсаваць падзеі, што адбыліся пасьля парлямэнцкіх выбараў ды рэфэрэндуму 17 кастрычніка 2004 г., і сытуацыю, якая складаецца ў краіне напярэдадні выбараў прэзыдэнта Беларусі.

Гэтыя пытаньні будуць разглядаць на Трэцім Усебеларускім сходзе інтэлігенцыі, які адбудзецца ў Менску 14 мая 2005 г.

Заклікаем правесьці сходы па вылучэньні дэлегатаў на наш агульны форум, вызначыць у кожным рэгіёне тых, хто будзе прадстаўляць інтэлігенцыю вашага гораду або мястэчка, вёскі або пасёлку. Ад нас залежыць, наколькі пачуюць слова інтэлігенцыі беларускі народ і тыя, хто сёньня пры ўладзе.

Інфармацыю аб сходзе вы можаце знайсьці на сайце http://rada05.at.tut.by.

Сьпісы дэлегатаў, а таксама вашы думкі і пажаданьні просім дасылаць на адрас нашага аргакамітэту: а/с 109, 220002, Менск. E-mail: rada05@tut.by. Тэл.: 8-029-632-12-75; 8-029-771-01-39, факс: 8-017-229-59-03.

**Аргкамітэт**

Каардынатары па скліканьні Трэцяга Ўсебеларускага сходу інтэлігенцыі:
Гарадня — Віктар Сазонаў, т. 8-029-669-11-25, e-mail: sazonau@tut.by; Уладзімер Хільмановіч — т.: 8-029-676-04-67;
Гомель — Алесь Яўсеенка, т. 8-029-608-01-84.
Агульная каардынацыя — Вольга Данішэвіч, т. 8-029-632-12-37, e-mail: rada05@tut.by.
Па меры працы аргкамітэту сходу сьпіс каардынатараў будзе папаўняцца і абвяшчацца на сайце http://rada05.at.tut.by.

# Надзвычайны клопат для МНС

Рыхтуючыся да паводкі, супрацоўнікі МНС зь Бярозаўскага раёну сутыкнуліся зь незвычайнай праблемаю. Сёлета раёну пагражае ня столькі вялікая вада, колькі яе насельнікі. Драпежныя рыбы піраны (*Rooseveltiella nattereri*), якія летась завяліся ў вадасховішчах тамтэйшае ДРЭС, пра што пісалася ў газэтах увосень, пасьпяхова перазімавалі.


WWW.ZWIERZAK.COM

Гісторыя, што пачалася з кур'ёзу, можа павярнуцца непрадказальнымі вынікамі. Разам зь веснавою вадою рыбы-эмігранткі з Паўднёвае Амэрыкі, якія зьяўляюцца сапраўдным бедзтвам для тамтэйшай жывёлагадоўлі, непазьбежна трапяць у вадаёмы Палесься. На гістарычнай радзіме гэтыя рыбы вядомыя лютай хціваcьцю. Вядома безьліч выпадкаў, калі зграі піраньяў сваімі вострымі, бы лёзы, дробнымі зубамі ў лічаныя хвіліны пакідалі ад жывых істот шкілет.

Празь месяц у піраньяў пачнецца шлюбны сэзон. Адпаведна, у водах басэйну Дняпра могуць утварыцца сталыя папуляцыі нязванага драпежніка. Выглядае, беларуская зіма ім не зашкодзіць, бо непатрабавальнасьць да якасьці вады дазваляе ім вадзіцца і ў цёплых сьцёкавых водах, найперш паблізу ахаладжальных сыстэм, каля электрастанцый і гарадоў. Што ж адбудзецца з гэтымі рыбамі ў зоне радыяцыйнага забруджаньня, не бярэцца прагназаваць ніхто.

Нагадаем, ужо цяпер у вадаёмах Беларусі жывуць і плодзяцца няпрошаныя экзоты з Далёкага Ўсходу — прэснаводныя кітайскія крэвэткі й жоўтыя крабы, дробная драпежная рыба ратан. Шкодзячы мясцовай фаўне, гэтыя віды, аднак, не складаюць небясьпекі для людзей. Піраньня ж *Rooseveltiella nattereri* ўтварае рэальную пагрозу жыцьцю купальшчыкаў і найперш былда, што поіцца з адкрытых вадаёмаў.

Днямі дэлегацыя МНС выяжджае ў Брытанію, дзе летась таксама было адзначана зьяўленьне гэтых небясьпечных істот — у Тэмзе. Вынікам беларуска-брытанскага супрацоўніцтва мусяць стаць праграмы неадкладных захадаў па ліквідацыі магчымых нэгатыўных вынікаў для экалёгіі Эўропы.

**Сяргей Харэўскі, Белаазерск—Менск**

# Набор у касманаўты

У сьпісе кандыдатаў на прэзыдэнцтва — спрэс партыйцы. Статкевіч, Колас, Вайтовіч не зарэгістраваліся паводле працэдуры, вызначанай «дзясяткай».

28 сакавіка скончыўся тэрмін рэгістрацыі прэтэндэнтаў на ўдзел у працэсе выбраньня адзінага кандыдата ад дэмакратычных сілаў. (Ух, адразу й ня вымавіш!) Свае заяўкі на ўдзел у перадвыбарнай гонцы падалі толькі пяць чалавек: старшыні ПКБ Сяргей Калякін, АГП Анатоль Лябедзька, БСДГ Станіслаў Шушкевіч, вылучэнец ад «зялёных» і ПБНФ Аляксандар Мілінкевіч ды мала каму вядомы ўпырхлік Валер Грыцук, які некалі працаваў з фондам Лява Сапегі. Лёгка заўважыць: большасьць зарэгістраваных — людзі «Пяцёркі+». Астатнія засталіся за бортам, але па чыёй волі?

Няслушнымі выявіліся зьвесткі пра тое, што Мікола Статкевіч таксама трапіў у лік зарэгістраваных. «Мяне ў гэтым сьпісе няма», — кажа лідэр Эўрапейскай кааліцыі «Свабодная Беларусь». «Калі ня ўлічваць малавядомых экзатычных асоб, фактычна прагучалі толькі прозьвішчы чатырох кандыдатаў ад «Пяцёркі-плюс». А павінна было б быць чалавек 10—12». На думку Статкевіча, у працэсе вылучэньня адзінага кандыдата ёсьць дзьве хібы. Па-першае, ён ня ўлічвае магчымых дзеяньняў улады супраць патэнцыйнага кандыдата. «Рэгістраваць кандыдатаў фармальна — значыць даваць наводку ўладзе», — мяркуе Статкевіч. Другая хіба — тое, што гэты парадак не стварае дастатковай матывацыі для ўдзелу ў працэдуры вылучэньня патэнцыйных беспартыйных кандыдатаў. Але катастрофы ў тым, што адбылося, Мікола Статкевіч ня бачыць: «Калі недахопы ёсьць — іх трэба ліквідаваць. Пастаянна дзеючая нарада дэмакратычных сілаў павінна гэта зрабіць».

Для многіх было неспадзяванкай ня ўбачыць у сьпісе кандыдатаў Уладзімера Коласа. «Я сам зьдзіўлены, — кажа ён. — Але пакуль працэдура ня вельмі зразумелая — што падпісваць, куды аддаваць? Нейкі набор у атрад касманаўтаў атрымліваецца. Я лічу, што залішняя бюракратызацыя толькі шкодзіць. Нашы выступы на рэгіянальных канфэрэнцыях і будуць нашымі заяўкамі. Але мы, тыя, хто ня трапіў у сьпіс, не адмаўляемся ад удзелу, вядзём паміж сабой кансультацыі».

Уладзімер Страх, кіраўнік сакратарыяту Пастаянна дзеючай нарады дэмакратычных сілаў, супакойвае: «Пакуль ідзе агітацыйна-выбарная кампанія, асобы, якія жадаюць у ёй удзельнічаць, таксама могуць заявіць пра сябе. Але яны павінны будуць падпісаць адпаведныя заявы. Потым на «дзясятцы» шляхам кансэнсусу вырашаецца, ці можна гэтых асобаў уключыць у сьпіс. Такім чынам, масты яшчэ ня спаленыя».

Праўда, прайсьці тымі мастамі зможа ня кожны. Старшыня АГП Анатоль Лябедзька падыходзіць да гэтай праблемы прынцыпова: «Усе выдатна ведалі, якая будзе працэдура». На думку Лябедзькі, дзьверы застаюцца адчыненымі толькі для тых палітыкаў, якія дагэтуль не былі актыўна ўключаны ў працэс вылучэньня адзінага кандыдата. А вось з асобамі, якія вялі адпаведныя перамовы, але так і не падалі заявак у тэрмін, можна супрацоўнічаць, аднак не разглядаць іх у якасьці магчымых кандыдатаў. «Я ня ведаю прычын, паводле якіх той ці іншы чалавек не падаў заяўкі. Магчымы тры варыянты: яны рэальна ацанілі свае сілы, паезьдзіўшы па рэгіёнах; абавязкі, закладзеныя ў працэдуры, падаліся ім занадта складанай ношай; нехта прапанаваў тое, ад чаго яны не змаглі адмовіцца».

Магчыма, масты для аб'яднаньня высілкаў апазыцыйных палітыкаў яшчэ й сапраўды ня спаленыя. Але іх, відавочна, давядзецца рэканструяваць ці будаваць абыходныя шляхі, інакш кожны паплыве да выбараў у сваёй лодачцы.

**АК**


# Чысты Чацьвер

**99 гадоў «Нашай Ніве», 7 гадоў часопісу «ARCHE»**

## сустрэча з чытачамі

Сьпявае постамэрыканскі Лявон Вольскі.
Выступаюць рэдактары і аўтары Першай Беларускай Газэты і Новага Беларускага Часопісу

**28 красавіка 19:00** Вялікая заля Дому літаратара. Уваход вольны


## Беларусы двух гатункаў

Асобны конкурс для абітурыентаўвяскоўцаў Магілёўшчыны й Гомельшчыны мае праводзіць сёлета галоўная ВНУ краіны. Як паведаміла «Комсомольская правда», у БДУ плянуюцца тры конкурсы для абітурыентаў. Адзін — для гараджанаў, другі — для вяскоўцаў, а трэці — для вяскоўцаў з Магілёўшчыны й Гомельшчыны. Для іх выдзеляць квоты на самых прэстыжных спэцыяльнасьцях — права, эканоміка, дыпляматыя.

Матывацыя такіх падтрымчых мераў тая ж, што і ў «пазытыўнай дыскрымінацыі» афраамэрыканцаў у ЗША: маўляў, студэнтаў гэтых спэцыяльнасьцяў з Магілёўскай і Гомельскай абласьцеў усяго 5%.

Як вядома, прэзыдэнт Лукашэнка — магілёўскі, а прэм'ер Сідорскі — з Гомелю. На апошніх свабодных выбарах менавіта ў гэтых абласьцях самы высокі працэнт выбарцаў галасаваў за прасавецкіх кандыдатаў.

**БТ**

## Эксклюзіў у пагонах

На заплянаваны марш нэанацыстаў, пра які шырока паведамілі «Народная воля» і радыё «Свабода», не прыйшоў ніхто, акрамя саміх журналістаў.

Пішчыць мабільнік. Дзень Волі пачынаецца з SMSкі ад калегі па цэху «нячэсных» карэспандэнтаў: «Ідзеш на марш нэанацыстаў?»

Шукаючы словы для адказу, апранаюся ды зьбіраю рэчы. Дыктафон — як заўсёды, пашпарт — натуральна, грошай менш — рэвалюцыя ўсё-такі, усякае можа здарыцца. Сунуся да пракуратуры — месца анансаванага рандэву «фашыкаў». Пуста. Мо яшчэ зарана? Абыходжу па пэрымэтры комплекс КДБ — паводле іншых зьвестак, марш нэанацыстаў можа пачацца недзе там. Цішыня, сонейка, мінакі шыбуюць некуды па сваіх справах.

Нарэшце, а 14-й насупраць пракуратуры зьбіраецца купка людзей. Ведаю ўсіх — каго ў твар, каго асабіста. Адны журналісты. Арыйцы так і не зьявіліся. Мы рагочам, а самім прыкра. Хоць ты калашыны падкасай да каленяў, каб фотажурналістам ды тэлеапэратарам было каго паздымаць.

Мы ўдарна папрацавалі ў апошні месяц. Ажанілі вязьня Марыніча, ператварыўшы ягонае асабістае жыцьцё ў сьвецкую хроніку. Мы амаль паставілі Лукашэнкавага сына губэрнатарам Баранавіч ды намесьнікам дырэктара трэцяга мабільнага апэратара. Людзі, якія спрабуюць займацца беларускім піярам, у прыватных размовах ужо гавораць пра тое, што Віктара Лукашэнку, магчыма, пачынаюць «раскручваць». Калі так пойдзе далей, дык пад 2011 год мы забясьпечым інфармацыйную падтрымку стварэньню манархіі.

Але лепш за ўсё ў нас атрымліваецца ладзіць шэсьці брытагаловых — нават калі тыя сядзяць па хатах. А потым дзяржаўнае тэлебачаньне гаворыць пра тое, што павышаныя захады бясьпекі былі зробленыя ў адказ на зьяўленьне зьвестак пра заплянаваныя акцыі нэанацыстаў. Не такі дурны гэты рэжым, калі ён так лёгка выкарыстоўвае нас у сваіх мэтах.

Што нас чакае наперадзе? Напэўсьце мухі цэцэ акурат на «Чарнобыльскі шлях»? Які чарговы «эксклюзіў у пагонах» падораць нам «ананімныя крыніцы»?

Мы хапаемся за любую інфармацыю, нават калі гэта відавочны «зьліў» адпаведных структур, нібыта яна дапаможа нашым чытачам ды слухачам лепш зразумець сытуацыю. Так, мы галодныя. Але ці значыць гэта, што нам трэба есьці гнілыя яблыкі?

**Алесь Кудрыцкі**

СЬЦІСЛА

### Пратэст нямецкай амбасады

Дыпляматычнае прадстаўніцтва Нямеччыны выступіла ў сувязі з публікацыяй у «Советской Белоруссии», у нумары за 10 сакавіка, артыкулу «Дранг нах Остэн-2». Аўтар артыкулу на першай паласе, што падпісаўся як Вольга Нікіціна, папракнуў немцаў у падрыхтоўцы «інструкцыі для рэвалюцыі» ў Менску. Нямецкія дыпляматы спрабавалі адшукаць карэспандэнта, але высьветлілася, што журналіст з указаным прозьвішчам раней у газэце не друкаваўся і рэдакцыі невядомы. Адказу з «СБ» таксама няма.

### Газ падаражэе

**Кіраўніцтва «Газпрому» абяцае налета падняць цэны на газ для Беларусі. Хутчэй за ўсё, за тысячу кубамэтраў давядзецца плаціць $55—60 замест $46,68. «Газпром» вымагае ад расейскага ўраду 22-адсоткавага павышэньня ўнутраных тарыфаў на газ ці наагул адмены рэгуляваньня газавых цэнаў. У такім выпадку непазьбежны рост цэнаў на экспартаваны з Расеі газ. Пытаньне цэнаў на наступныя два гады вырашаецца ў Маскве гэтымі днямі.**

### Лёс лётчыкаў

На просьбу беларускага боку для правядзеньня консульскіх дзеяньняў і афармленьня неабходных дакумэнтаў у Мванзу (Танзанія) камандзіраваны консул расейскай амбасады ў Дар-эс-Саляме. 23 сакавіка ў Танзаніі разьбіўся самалёт малдаўскай авіякампаніі. З васьмі чалавек экіпажу шасьцёра былі грамадзянамі Беларусі. Дастаўка на радзіму цел загінулых магчыма толькі пасьля расшыфроўкі «чорных скрыняў», апазнаньня і афармленьня ўсіх дакумэнтаў.

### Штрафы і пэнсіі ўзрастуць

1 красавіка, паводле пастановы Саўміну, на 6,25% павышаюцца тарыфная стаўка першага разраду й базавая велічыня. Базавая велічыня складзе 25 500 рублёў (была 24 тыс.), тарыфная стаўка — 51 000 (48 тыс.). Павысяцца з 1 красавіка і пэнсіі. Максымальная зараз складзе 309,3 тыс. руб. ($143,7), мінімальная працоўная — 96,6 тыс. ($44,9).

### Грып адступіў зь Менску

З 30 сакавіка ў сталіцы адменены супрацьэпідэмічныя меры, выкліканыя пад'ёмам узроўню колькасьці захворваньняў на грып і ВРВІ.

### Украінскі досьвед

Трое абвінавачаных ва ўчыненьні фальсыфікацыяў падчас выбарчай прэзыдэнцкай кампаніі ва Украіне атрымалі ад трох да трох з паловай гадоў пазбаўленьня волі з адтэрміноўкай прысуду. Усе яны вінаваціліся ў спробе арганізацыі так званых «арэляў» — галасаваньня па фальшывых бюлетэнях.

**АГ, svaboda.org, afn.by**

# Прага волі



**ВІТАЛЬ ТАРАС**

Даўно заўважана — чым далей журналіст ад месца падзей, тым прасьцей пісаць пра гэта. За савецкім часам журналісты-«амэрыканісты» дасканала разьбіраліся ў праблемах палітыкі рэспубліканскай або дэмакратычнай партый і зь лёгкасьцю выдавалі прагнозы на абраньне чарговага прэзыдэнта ЗША. Адказнасьці ніякай, бо міжнародныя аглядальнікі залежалі не ад гледачоў, а толькі ад начальства і лініі кіраўніцтва КПСС у той канкрэтны момант. З таго часу мала што зьмянілася, варта толькі паглядзець БТ. Навошта пасылаць карэспандэнта ў Рыгу, каб ён пагутарыў там наконт «вызваленьня Латвіі» савецкімі войскамі як з латышамі, так і з расейскамоўнымі жыхарамі? Усё значна прасьцей — бярэцца «карцінка» шэсьця вэтэранаў вафэн-СС і накладаецца прапагандысцкае клішэ: у Латвіі працьвітае фашызм.

Што ўжо казаць пра далёкі Кыргызстан? Кадры рабаваньня ўнівэрмагаў у Бішкеку ў камэнтарах расейскіх і беларускіх тэлежурналістаў адразу зьліліся ў агульную песьню на стары матыў: «Паглядзіце, што такое ваша рэвалюцыя і на што здольная ваша апазыцыя». Падзеі ў Кыргызстане імгненна былі пастаўлены ў адзін шэраг з падзеямі ў Грузіі і ва Ўкраіне. Між тым і ў Тбілісі, і ў Кіеве рэвалюцыі былі абсалютна бяскроўнымі і выключна мірнымі. Але гэтая акалічнасьць папросту ігнаруецца. Факты не адпавядаюць канцэпцыі? Тым горш для фактаў!

### Шырокая кааліцыя, альбо «Тэорыя змовы»

Ва ўсіх трох выпадках ёсьць нешта супольнае, свайго роду схема ці, кажучы мовай спэцыялістаў, архетып падзей. Падставай для актыўных дзеяньняў апазыцыі становіцца фальшаваньне вынікаў выбараў (прэзыдэнцкіх ці парлямэнцкіх) з боку ўладаў. У выніку масавых акцый пратэсту частка ці большасьць чынавенства пераходзіць на бок апазыцыі, а судовыя органы ці пракуратура прызнаюць факт фальшаваньня выбараў. Вынік — падзеньне прагнілага рэжыму ды прыход ва ўладу новых (або адносна новых) асоб.

Што яшчэ кідаецца ў вочы, дык гэта шырокая кааліцыя сіл, якія ўступаюць у супрацьстаяньне з рэжымам. Пад сьцягамі апазыцыі могуць выступаць побач нацыяналісты і камуністы, тэхнакраты і лібэралы, рэлігійныя артадоксы і рэфарматары. Але гэта парадаксальна толькі на першы погляд. Бо ў аўтарытарным грамадзтве дэмакратычныя партыі ня могуць аформіцца і дзейнічаць звычайным, законным парадкам. Апазыцыянэры проста вымушаны, каб процістаяць рэжыму, дзейнічаць разам. І аб'ядноўвае апазыцыю не абавязкова «адзіны кандыдат». Гэта можа быць і «супольны вораг», аднолькава ненавісны ўсім.

Што прыходзіць на зьмену старому ладу — асобнае пытаньне, якое кожная краіна вырашае пасвойму.

Варта адзначыць, што расейскія палітолягі і афіцыйныя асобы, уключна з прэзыдэнтам, спрабуюць звальваць усё з хворай галавы на здаровую. Паводле іх лёгікі, гэта ня ўлады мусяць несьці адказнасьць за фальшаваньне выбараў, выкарыстаньне адміністрацыйнага рэсурсу, падман выбарцаў, парушэньне закону, а апазыцыя, якая нежаданьнем прызнаць такія выбары легітымнымі дэстабілізуе сытуацыю.

Некаторыя «палітолягі» ідуць далей. Прыклад такой палітлёгіі падала нядаўна «Советская Белоруссия», апублікаваўшы аналітычную нататку нейкага навукоўца з Санкт-Пецярбургу аб сытуацыі ва Ўкраіне. Заканамернасьці, пра якія казалася вышэй і якія праявіліся падчас аранжавай рэвалюцыі, ператвараюцца ў аналітыка ў зламысны сцэнар, распрацаваны замежнымі спэцслужбамі. Гэтае адкрыцьцё мала чым адрозьніваецца ад усіх астатніх «тэорый змовы», у тым ліку тэорыі аб тым, што развал СССР быў сплянаваны і зьдзейсьнены ЦРУ (або «Масадам», або масонамі). Калі пагадзіцца са згаданай тэорыяй, дык яе аўтары павінны прызнаць, што галоўнай зброяй у руках варожых сіл былі КГБ, ваенна-прамысловы комплекс і частка кіраўніцтва КПСС, якія ўчынілі бяздарны пераварот у жніўні 1991 г.

Зразумела, што ў ЗША, як і ў ЭЗ, як і ў Расеі, ёсьць свае інтарэсы ва Ўсходняй Эўропе і Цэнтральнай Азіі. У.Пуцін, між іншым, днямі фактычна прызнаў, што СНД зьяўляецца на сёньняшні дзень анахранізмам. Такім самым анахранізмам трэба было б прызнаць і Дагавор аб калектыўнай бясьпецы, зь якога вынікае, што Беларусь павінна турбавацца пра ахову паўднёвых межаў Кыргызстану. А Кыргызстан тады павінен дапамагаць Беларусі ў процістаяньні NATO? Але ж яшчэ Акаеў зразумеў, што ня толькі супрацоўніцтва з Масквой, але і прыязныя дачыненьні з Вашынгтонам здольныя прынесьці карысьць ягонай краіне, і даў дазвол на разьмяшчэньне ў Кыргызстане амэрыканскай авіябазы. Пры захаваньні аналягічнай расейскай…

### Кругазварот страху ў прыродзе

Што да вышэйшага беларускага кіраўніцтва, дык яно не абцяжарвае сябе развагамі ды аналізам сытуацыі ў краінах СНД. Яно дзейнічае, хутчэй, чыста рэфлекторна. Доказам таму — узмоцненыя нарады АМОНаўцаў і сабраўцаў, якія запаланілі цэнтар Менску 25 сакавіка. Змаганьне ўзброеных да зубоў, натрэніраваных спэцназаўцаў зь дзецьмі ўражвае ня столькі сваёй жорсткасьцю, колькі несувымернасьцю дзеяньняў і рэальных пагроз. Уявіць сабе, што некалькі соцень хлопцаў і дзяўчат, узброеных лядзякамі, здольныя пайсьці на штурм прэзыдэнцкай адміністрацыі, ня ў стане нават хворы розум. З другога боку, упартасьць, зь якой менскія хлопцы спрабавалі вярнуцца на Кастрычніцкую плошчу, нягледзячы на зьбіцьцё й затрыманьні дзясяткаў чалавек, сьведчыць, што прынамсі частка маладога пакаленьня перастае баяцца ўлады. Ці ня хоча зьмірыцца



са страхам. Прынамсі, такога ўпартага процістаяньня менавіта ў Дзень Волі на вуліцах Менску даўно не назіралася.

А далей узаемазалежнасьць простая — чым менш у грамадзтве страху, тым больш яго становіцца ва ўладаў. А страх — благі дарадца. Аднак, шлях да пераадоленьня страху беларусаў перад уладай яшчэ вельмі й вельмі доўгі. Бо для пераадоленьня яго патрэбна ня толькі мужнасьць. Хто асьмеліцца назваць беларусаў нямужным народам? Патрэбен, перш за ўсё, моцны стымул, жаданьне стаць свабодным. Яно сёньня нараджаецца — сярод вучняў і студэнтаў, прадпрымальнікаў. Дарэчы, частка тых, хто на пачатку сакавіка страйкаваў на прыватных рынках, пры канцы месяца, у дзень нацыянальнага сьвята, таксама выйшлі на Кастрычніцкую плошчу. Тое, што гэты дзень як бы праспалі палітыкі, якія прызвычаіліся ў апошнія гады адзначаць Дзень Волі ў падпольлі ці на імпрэзах, — таксама ня страшна. Ініцыятыву яшчэ можна перахапіць. І няважна, ад каго яна будзе зыходзіць. Самы вялікі грэх — грэх адчаю. Ён і ў палітыцы грэх. А падлік дывідэндаў — хто, чаго, колькі й на кім зарабіў — можна пакінуць і на потым. Калі застанецца жаданьне…

Застаецца, як заўсёды, адвечнае пытаньне — цана свабоды. І цана перамогі. Цынічнымі выглядаюць развагі некаторых палітыкаў і журналістаў наконт «азіятчыны», якую нібыта прадэманстравалі кіргізы. Гэтыя выказ-

> Падзеі ў Кыргызстане БТ паставіла ў адзін шэраг зь мірнымі рэвалюцыямі ў Грузіі і ва Ўкраіне. Факты не адпавядаюць канцэпцыі? Тым горш для фактаў!

ваньні гучаць асабліва недарэчна з вуснаў расейскіх палітыкаў пасьля таго, што яны нарабілі ў Маскве ў кастрычніку 1993-га. Або ў Чачэніі цягам апошніх дзесяці гадоў. Альбо на тле сучасных паведамленьняў пра зьбіцьцё і забойствы скінхедамі армян, азэрбайджанцаў, казахаў, жыхароў азіяцкіх і афрыканскіх краін у абедзьвюх сталіцах Расеі.

Марадэры былі і ёсьць ня толькі ў Бішкеку. Яны былі і ў старажытным Багдадзе пасьля падзеньня рэжыму Хусэйна. Яны былі і ў Менску, калі яго пакінулі савецкія войскі ў 1941-м. Але гэта ніякі не паказчык маральных якасьцяў таго ці іншага народу. Гэта паказчык крызісу, які гэты народ перажывае.

### Поступ Каранара

Рэвалюцыі бываюць не ад добрага жыцьця. Аб тым, як жыў кіргіскі народ у апошнія гады, мы маглі толькі здагадвацца паводле ўскосных зьвестак. Афіцыйная велічыня гадавога даходу — меней як 270 эўра на душу насельніцтва — была самая нізкая ў СНД. Магчыма, Акаеў і быў больш лібэральным дыктатарам, чым ягоныя суседзі па Цэнтральнай Азіі. Але ж прэзыдэнт павінен несьці поўную адказнасьць перад людзьмі за вынікі 14 гадоў свайго праўленьня. Праўленьня, якое яму двойчы ўдавалася падоўжыць нібыта легітымным шляхам. Толькі народ у гэтую легітымнасьць не паверыў. Перамога прыхільнікаў Акаева на парлямэнцкіх выбарах стала піравай перамогай. Улада, якую адмовіўся прызнаваць народ, абрынулася. І для гэтага апазыцыі не спатрэбіўся нават харызматычны лідэр.

Магчыма, у адсутнасьці лідэра таксама ёсьць праблема новай кіргіскай улады. А магчыма — перавага. Для таго каб меркаваць аб будучыні Кыргызстану, сёньня не стае інфармацыі. Але ў любым выпадку вызначаць свой лёс будзе сам кіргіскі народ. 1991 год быў толькі фармальным пачаткам незалежнасьці былых рэспублік СССР. Цяпер сапраўдная гісторыя, а не інэрцыя былых дзесяцігодзьдзяў уступае ў свае правы, і хто будзе тут першым, а хто апошнім, сказаць немагчыма. Ясна толькі, што закансэрваваць старыя савецкія парадкі ў новай форме, пад выглядам уяўнай стабільнасьці, захаваць сацыялістычную, псэўдаінтэрнацыянальную сьвядомасьць надоўга ня ўдасца. Марная праца.

Рэвалюцыя ў Кыргызстане зусім не падобная, нават зрокава, на экранах тэлебачаньня, на рэвалюцыю ва Ўкраіне ці Грузіі. У яе няма нават агульнапрызнанага колеру ці сымбалю. Хіба што сымбалем можа лічыцца вершнік, што нясецца галопам па вуліцах Бішкеку?

Але прыгадваецца яшчэ адзін вобраз — з Чынгіза Айтматава. У нашумелым некалі рамане кіргіскага пісьменьніка «Буранны паўстанак» два галоўныя героі — Едыгей і ягоны белы вярблюд Каранар. Вярблюд гэты — сапраўдны прыгажун і асілак сярод вярблюдаў — увесь час працаваў на свайго гаспадара, выносіў разам зь ім усе цяжкасьці і трывогі, быў прывязаны да яго і па-свойму любіў. І гаспадар любіў свайго Каранара. Але раз на год, калі пачыналася вясна і прачыналася пустыня, Каранар рабіўся дзікім і неўтаймоўным. Ніякая сіла не магла тады стрымаць яго…

Што такое свабода як «усьвядомленая неабходнасьць», многія вывучалі ў школе. Але што ёсьць свабода як такая, як нязломная прага да жыцьця і волі, дадзеная жывым істотам ад нараджэньня?.. Ці трэба тлумачыць, што ня толькі ў зьвяроў, але і ў чалавека ніхто ня мае права адбіраць волю ні пад якой умовай. А ўжо як чалавек выкарыстае свабоду, а значыць, і паклапоціцца пра свой лёс — вырашаць толькі яму самому.

# Змаганьне за трубу

Расея здабыла падтрымку Нямеччыны ў справе пабудовы газаправоду па дне Балтыйскага мора. Польшча, Літва і Латвія загадзя крытыкуюць праект як палітычную акцыю, што мае на мэце маргіналізаваць і падпарадкаваць Усходнюю Эўропу. Украіна лабіруе альтэрнатыўны праект.

Заходнія краіны схіляюцца да падтрымкі пабудовы нітку газаправоду, што злучыць па дне Балтыйскага мора Санкт-Пецярбург і нямецкі Грайфсвальд (зямля Мэкленбург — Пярэдняя Памэранія). Хоць канкрэтных дамоваў пакуль няма, гэты праект ужо выклікаў занепакоенасьць Польшчы, Літвы й Латвіі.

Урады Польшчы, Літвы і Латвіі мяркуюць, што пракладаньне труб абыдзецца значна даражэй, чым па сушы, будзе чыста палітычнай акцыяй ды небясьпечнае ў экалягічным пляне. Яны нават называюць праект новым пактам Молатава—Рыбэнтропа, які спрычыніцца да перадзелу Эўропы, гэтым разам на энэргетычныя анклявы.

Прэм’еры трох краін зьвярнуліся зь лістом да старшыні Эўракамісіі Жазэ Мануэла Барозу. Яны просяць ЭЗ падтрымаць пляны пабудовы альтэрнатыўнага газаправоду праз Польшчу. Газаправод «Amber» («Бурштын») мае цягнуцца з Расеі праз Латвію, Літву, Калінінградзкую вобласьць, Польшчу ў Эўропу.

Аб’ёмы перапампоўваньня газу па абодвух праектах аднолькавыя — 20—30 млрд кубамэтраў у год. Але пабудова «марскога» газаправоду будзе каштаваць на 7 млрд даляраў болей (10,3 млрд супраць 3,3 млрд). Колісь у «Газпрому» былі пляны па пабудове газаправоду праз Польшчу, але яны засталіся на паперы.

У Расеі свая рацыя. Яны даводзяць, што пры будаўніцтве газаправоду праз Польшчу і краіны Балтыі ўзьнікне «рызыка ў гэтых краінах». Таму канцэрн «Газпром» пачаў актыўна лабіраваць «марскі» праект у Нямеччыне, Францыі і Вялікабрытаніі, куды і плянуецца пампаваць газ. Зерне ўпала на ўрадлівую глебу, і шмат хто з заходнікаў ужо лічыць новапрынятыя краіны Эўразьвязу ненадзейнымі, далучаючыся да расейскай прапановы.

Польскія аналітыкі апэлююць да гісторыі: 66 гадоў таму лёс балтыйскіх краін і Польшчы быў вырашаны дамовай паміж савецкай Расеяй і нацысцкай Нямеччынай.

Інвэстыцыі «Газпром» хацеў бы распачаць ў 2007 г. Паводле некаторых чутак, расейскі канцэрн зьбіраецца агаварыць частку гэтых грошай у бюджэце ЭЗ на 2007—2013 г. Паклаўшы на стол Эўракамісіі альтэрнатыўны праект газаправоду, Польшча, Літва і Латвія мяркуюць, што Брусэль зьверне на іх увагу і больш пільна паставіцца да прапановы «Газпрому». Гэта змаганьне за інвэстыцыі і палітычную вагу аднычасова.

Свае газавыя праекты лабіруе Ўкраіна. «Нафтагаз Украіны» атрымаў крэдыт ад Deutsche Bank на 2 мільярды эўра пад мадэрнізацыю сваёй газатранспартнай сыстэмы. Задумай стварэньня новага газатранспартнага кансорцыюму для дастаўкі ў Эўропу вуглевадароднае сыравіны з радовішчаў Цэнтральнае Азіі апякуецца асабіста прэзыдэнт Віктар Юшчанка. Цікава, што перад сваім візытам у Нямеччыну, калі была дасягнутая дамоўленасьць аб нямецкім крэдыце, аранжавы лідэр Украіны прызначыў новым кіраўніком «Нафтагазу» старшыню Кангрэсу ўкраінскіх нацыяналістаў Аляксея Іўчанку.

Украінцы прапануюць далучыць да газатранспартнага кансорцыюму ў складзе «Газпрому» й «Нафтагазу» яшчэ й «Ругаз» як патэнцыйнага спажыўца дый кампаніі зь іншых краінаў Эўропы. Ініцыятывы Ўкраіны знаходзяць водгук, бо прыход казаскага, туркмэнскага і нават іранскага газу дазволіў бы дывэрсыфікаваць крыніцы паставак энэрганосьбітаў у Эўропу.

Дагэтуль асноўны паток расейскага газу цячэ ў Эўропу праз Украіну. Тым часам Беларусь, адзін з найбольш рацыянальных шляхоў транзыту газу, працягвае разглядацца эўрапейцамі як непажаданы партнэр праз антыэўрапейскую і антыдэмакратычную пазыцыю цяперашняга беларускага кіраўніцтва.

**Руслан Равяка**

# Пракурор падтрымаў галадоўшчыкаў

Супрацоўнік пракуратуры Анатоль Бяржанін крытыкуе падатковую інспэкцыю і Камітэт дзяржкантролю. «Дзе гэты Аўтуховіч возьме 600 мільёнаў рублёў? Лічу, што пракуратуры трэба было б унесьці пратэст на рашэньне падатковай інспэкцыі».

21 сакавіка ў Рэспубліканскім інстытуце вышэйшай школы пры БДУ пачаліся двухтыднёвыя курсы пра грамадзкую небясьпеку карупцыі. Лекцыі пэдагогам са сталічных і рэгіянальных ВНУ ды тэхнікумаў ужо прачыталі эканамісты (адна з выкладчыц хвалілася, што пры канцы 1990-х пакінула салігорскіх шахцёраў без законна набытых доляў маёмасьці ў «Беларуськаліі»), ідэолягі і нават работнік КДБ. Сказаў антыкарупцыйнае слова і кандыдат юрыдычных навук, начальнік упраўленьня пракуратуры Анатоль Бяржанін. Пры гэтым прысутнічаў карэспандэнт «НН».

Часам прамова Бяржаніна была досыць эмацыйнай: «У Ваўкавыску падатковая інспэкцыя спаганяе 600 млн руб. з прадпрымальніка Мікалая Аўтуховіча. Ён і яго кіроўцы цяпер галадаюць. Падумайце, дзе гэты «аўганец» возьме столькі грошай? Лічу, што пракуратуры трэба было б унесьці пратэст на рашэньне падатковай інспэкцыі, і маю пазыцыю падзяляюць юрысты з Канстытуцыйнага суду. На жаль, новае кіраўніцтва рэспубліканскай пракуратуры мяне не падтрымала».

Высокапастаўлены пракурор восем гадоў працаваў поруч з Шэйманам. Летась А.Бяржанін праз «Советскую Белоруссию» прапаноўваў заводзіць крымінальныя справы ў дачыненьні да тых, хто падазраваў яго шэфа ў выкраданьні людзей, а гэтым разам жорстка раскрытыкаваў чыноўнікаў сярэдняга зьвяна з Камітэту дзяржкантролю, якія завышаюць памеры санкцый да прадпрыемстваў, фактычна спыняючы іх дзейнасьць. «Калі гаворка ідзе аб мільярдах, санкцыі павінен накладаць толькі намесьнік старшыні КДК ці сам старшыня», — сказаў ён, прайшоўшыся таксама па няўрымсьлівых кантралёрах, якія ладзяць «рэйдавыя» праверкі без прадпісаньняў. Парада пракурора бізнэсоўцам: «На парог не пускайце такіх правяральнікаў».

Слухачак цікавіла пытаньне аб кветках, што дораць ім студэнты (у Сьветлагорску кіраўніцтва тэхнікуму забараніла прымаць букеты пад сьцягам «барацьбы з карупцыяй»). «Бярыце сьмела», — сказаў выкладчыцам сп.Бяржанін. Праўда, не ўдакладніў, ці зоймецца яго ведамства працаўладкаваньнем пэдагогаў, звольненых за непадпарадкаваньне загадам «зьверху».

У час курсаў слухачам ня раз даводзілася пацепваць плячыма і дзівіцца, наколькі супярэчаць адно аднаму меркаваньні прадстаўнікоў кіроўнай эліты.

**ВР**

## Белнэт — за белую рэвалюцыю

У Інтэрнэце стартавала агітацыйная кампанія за «белую» рэвалюцыю. Ідэя належыць вядомаму інтэрнэт-фундатару Ветру Мэханічнаму, стваральніку парталу «Fromby.net», на якім месяцца зь дзясятак інтэрнэт-рэсурсаў. Адразу ж па старце кампаніі да яе пачалі далучацца як іншыя інтэрнэт-рэсурсы, так і звычайныя карыстальнікі.

Паводле слоў Ветра Мэханічнага, белы колер — колер беларусаў: «Трэба не зважаць на моду, а толькі заставацца самімі сабой. Бо белы — гэта колер новае пары, сьветлае й пакуль не заплямленае. Гэта колер дыялёгу, адкрытасьці й яднаньня. Гэта колер веры. Колер надзеі. Колер памяці».

Навуковае абгрунтаваньне пазыцыі ён знайшоў і ў даведніку «Беларуская міталёгія». Там зазначаецца, што белы — у традыцыйнай культуры беларусаў адзін з найбольш пашыраных колераў. Нароўні з чырвоным і чорным ён складае асноўны спэктар каляровай сымболікі ў мітапаэтычнай мадэлі сьвету, гэты колер выступае як апазыцыя чырвонага, які сымбалізуе жыцьцёвы пачатак, нараджэньне і статуснае перараджэньне.

**СБ**

## ГАСПАДАРКА СЬЦІСЛА

### Бавоўна без ПДВ

Паводле прэзыдэнцкага ўказу, бавоўнянае валакно, што ўвозіцца ў Беларусь для апрацоўкі, ня будзе абкладацца ПДВ. Прадпрыемствы, якія выкарыстоўваюць гэтую сыравіну, знаходзяцца ў цяжкім фінансавым стане — таму ўлада пайшла ім насустрач. А вось прыватныя прадпрымальнікі адмены ПДВ так і не дамагліся.

### Зьніжэньне нафтапошліны

Урад плянуе зьнізіць экспартную пошліну на нафту з $87,9 за тону да $83. Цікава, што Расея наадварот павышае пошліну на экспартную нафту. Рэч у тым, што Беларусь экспартуе ўласную нафту, а рэнтабэльнасьць яе здабычы невысокая. Дзяржаўны манапаліст «Беларусьнафта», які пампуе чорнае золата, ня здужае плаціць вялікія пошліны.

### Калійныя рэкардсмэны

«Уралкалій» прапанаваў «Беларуськалію» стварыць сумеснае прадпрыемства. Яно будзе займацца продажам калійных угнаеньняў на міжнародным рынку. Ня выключана, што да яго далучыцца таксама расейскае ААТ «Сыльвініт». У такім выпадку група зробіцца найбуйнейшым вытворцам калійных угнаеньняў у сьвеце. Лукашэнка паставіўся да прапановы досыць стрымана: Беларусь ужо стварае ўласную кампанію, што будзе прадаваць калійныя ўгнаеньні за мяжу без пасярэднікаў.

### Новая біржа

Сёлета 1 чэрвеня адчыніцца Беларуская ўнівэрсальная таварная біржа. Пасьля яе адкрыцьця ўсе юрыдычныя асобы ў краіне павінны будуць заключаць зьдзелкі на суму, большую за 10 тыс. эўра, толькі на біржавых таргах. Гэта датычыць гандлю лесаматэрыяламі, шэрагам вырабаў з жалеза, сталі ды чорных мэталаў.

### Манэты не для крамы

Срэбная манэта «Беларускі балет» вартасьцю сто рублёў, адбітая Літоўскім манэтным дваром,



атрымала тытул «Манэта году-2005» на конкурсе, які ладзіцца амэрыканскім выдавецтвам «Краўзэ Паблікейшнс». Яна ж прызнаная найбольш дасканалай па сваім мастацкім вырашэньні. Іншая манэта вартасьцю 20 рублёў з выявай лебедзя-шыпуна атрымала тытул «Каралеўская манэта». Яе чаканілі ў Варшаве.

### Электраэкспэрымэнт

Беларусь дамовілася з урадам Цімашэнкі распачаць экспэрымэнт па пастаўцы электраэнэргіі з Украіны. Будуць зноў запушчаны ў дзеяньне лініі электраперадач, якія зьвязваюць ЧАЭС з Мазыром ды Чарнігаў з Гомелем. Яны стаялі бяз працы з 1989 г. Калі экспэрымэнт будзе ўдалым, па гэтых лініях Беларусь зможа імпартаваць да 2,5 млрд кіляват-гадзін электраэнэргіі ў год. Таксама распачнецца будаўніцтва яшчэ адной лініі электраперадач, якая зьвяжа Ровенскую АЭС зь Пінскам.

**АК, АФН**

## КУРСЫ ВАЛЮТ

на **31 сакавіка:**
1 амэрыканскі даляр — 2 153 рублі
1 эўра — 2 791,26 рубля.
1 латвійскі лат — 4 010,43.
1 літоўскі літ — 808,43.
1 польскі злоты — 677,94.
1 расейскі рубель — 77,37.
1 украінская грыўна — 406,76.

**Паводле Нацбанку**


PHOTO.BYMEDIA.NET

# КДБ вэрбуе маладафронтаўцаў

Супрацоўнікі спэцслужбаў увесну актывізаваліся: за апошнія тыдні кадэбісты намаўлялі на сустрэчы некалькіх актывістаў незарэгістраванага «Маладога фронту». Пра гэта журналістам распавёў прэсавы сакратар МФ Барыс Гарэцкі. Некалькі разоў да яго й Руслана Харкевіча тэлефанаваў супрацоўнік Руслан (нумар мабільнага тэлефону 751-25-16), прапаноўваў супрацоўніцтва. Угаворваць Гарэцкага нават прыйшоў у політэхнічны каледж, дзе хлопец навучаецца. Харкевічу абяцаў добрую працу ў рэклямным агенцтве за інфармацыю пра «МФ». Абодва ад далейшых кантактаў адмовіліся.

А Павал Севярынец знаёміцца з шасьцю тамамі крымінальнай справы па вулічных дэмастрацыях пасьля рэфэрэндуму: ён праходзіць як падазраваны. Падазраваныя й адвакаты могуць вывучаць матэрыялы цягам месяца, столькі ж — судзьдзя. Таму пры канцы вясны або на пачатку лета можна чакаць пачатку судовага працэсу. Сваю справу Павал называе палітычнай: «Ніводнай заявы ні ад грамадзянаў, ні ад кіроўцаў, якія нібыта стаялі ў «заторах», ні ад жыхароў, ні ад прахожых у справе няма. Гэта справа, ініцыяваная ўладамі. Сьведкамі па ёй праходзяць міліцыянты і тыя вадзіцелі, якіх удалося адшукаць». Крымінальную справу супраць сябе й Статкевіча лідэр «МФ» зьвязвае з магчымым датэрміновым правядзеньнем выбараў прэзыдэнта. «Момант ісьціны», на ягоную думку, надыдзе 9 мая.

Другой задачай судовага працэсу Севярынец лічыць «нэўтралізацыю» вулічных лідэраў і запалохваньне патэнцыйных завадатараў. Гэта рэакцыя на рэвалюцыі ў СНД.

Аднак моладзевыя лідэры ня падаюць духам. На 2 красавіка, «Дзень яднаньня народаў Беларусі й Расеі», маладафронтаўцы плянуюць павіншаваць пасольства Расеі з «каляровымі» рэвалюцыямі. Наступная акцыя — Чарнобыльскі шлях. «Калі лідэры партыяў ня змогуць павесьці за сабой, мы гатовыя ўзначаліць калёну — з расьцяжкамі, сьцягамі й лёзунгамі», — сказаў Б.Гарэцкі.

**Аркадзь Шанскі**

Суд Цэнтральнага раёну Гомелю 22 сакавіка пакінуў без разгляду пазоў дэпутата гарсавету **Юр’я Глушакова** да гарвыканкаму — у лютым дэпутат падаў заяўку на мітынг супраць павышэньня камунальных плацяжоў, прымусовых кантрактаў, меркаванага пяцігадовага разьмеркаваньня студэнтаў. Гарвыканкам, дазволіўшы сьпярша мітынг, за два дні да сходу забараніў яго. Судзьдзя адхіліў пазоў на падставе таго, што заяўнікі не абскарджвалі рашэньня гарвыканкаму ў аблвыканкаме.

22 сакавіка кіраўніцтва жаночага **ГА «Любава»** (Горкі) прыняло рашэньне пачаць працэс ліквідацыі: арганізацыя ня ў стане зарэгістраваць юрыдычны адрас згодна з новым законам. Такое ж рашэньне прыняло **Бялыніцкае краязнаўчае таварыства**.

Пастара царквы «Новае жыцьцё» Аб’яднаньня суполак поўнага Эвангельля **Вячаслава Ганчарэнку** 22 сакавіка суд Маскоўскага раёну Менску аштрафаваў на 30 б.в. (720 тыс. руб.) за незаконны сход вернікаў.

Ленінскі райсуд Берасьця 22 сакавіка адмовіўся задаволіць пазоў старшыні БСДП (НГ) **Анатоля Ляўковіча** да адміністрацыі Берасьцейскага ўнівэрсытэту: звольнены выкладчык хацеў, каб зь яго зьнялі незаконную, на яго думку, вымову рэктара.

У віцебскім абласным гаспадарчым судзе 23 сакавіка ў адсутнасьць міліцыі была закрытая справа ў дачыненьні да прадпрымальніка **Барыса Элькіна**, у якога міліцыянты канфіскавалі 9 000 асобнікаў кнігі «Выпадковы прэзыдэнт». Аднак судзьдзя вярнула міліцыянтам заяву, каб яны маглі перагледзець фармулёўку абвінавачаньня. Кнігі пакуль застаюцца пад арыштам у Віцебскім райаддзеле.

Актывістку незарэгістраванай арганізацыі «Зубр» **Вераніку Лазоўскую** затрымалі 11 сакавіка на акцыі, а 21 сакавіка запрасілі прыйсьці на размову ў Фрунзэнскае раённае ўпраўленьне КДБ «для размовы».

Адміністрацыйная камісія барысаўскага выканкаму 23 сакавіка вынесла папярэджаньні актывістам «Зубра» **Аляксандру Малчанаву** і **Міхаілу Старавойтаву**, затрыманым месяц таму пры зборы подпісаў у падтрымку Міхаіла Марыніча. Пры вынясеньні рашэньня камісія не спаслался ні на адзін закон.

23 сакавіка **Павал Севярынец**, абвінавачаны ў арганізацыі масавых беспарадкаў у кастрычніку, даў падпіску аб нявыезьдзе зь Віцебску, дзе ён прапісаны ў кватэры бацькоў.

Падчас раздачы бюлетэню, прысьвечанага Дню Волі, 24 сакавіка затрымалі непаўналетніх навучэнцаў Беларускага ліцэю **Франка Вячорку** і **Вольгу Гудкову**. За распаўсюд бюлетэню ў той самы дзень затрыманы намесьнік старшыні ПБНФ **Аляксей Янукевіч**, на якога склалі пратакол, а таксама актывісты ПБНФ **Юрась Карэтнікаў**, **Алесь Крупко**, **Андрэй Пахомаў**, **Аляксей Скуратовіч**.

Актывістаў незарэгістраванага руху «Лімон» — студэнтку **Юлю Сівец** і рабочага **Аляксандра Гехта** — затрымалі 24 сакавіка каля Гомельскага ўнівэрсытэту за раздачу ўлётак арганізацыі.

У пракуратуру 24 сакавіка выклікалі рэдактара крычаўскай недзяржаўнай газэты «Вольны горад» **Сяргея Няроўнага**: яму прад’явілі ўлётку зь ягоным партрэтам і заклікам ехаць у Менск на акцыю Андрэя Клімава. Улётку Няроўны, паводле яго слоў, бачыў упершыню.

У рэдакцыі газэты **«Згода»** 24 сакавіка міліцыя канфіскавала ўсе кампутары па падазрэньні, што ў офісе рэдакцыі разьмяшчаецца падпольная друкарня, што друкуе антыўрадавыя матэрыялы.

Менскі абласны суд 24 сакавіка разгледзеў касацыйную скаргу ў справе незаконна звольненага з ААТ «Слуцак-Модуль» актывіста РЭП **Усевалада Сьцяцова**. Паводле рашэньня Слуцкага суду, у лютым ён быў адноўлены на працы з выплатай заробку за вымушаны прагул і кампэнсацыі ў 200 тыс.руб. за маральную шкоду, з чым не пагадзілася адміністрацыя прадпрыемства. Менскі суд прызнаў слушнасьць рашэньня пра аднаўленьне Сьцяцова.

У Магілеве 25 сакавіка затрыманы актывісты ПБНФ **Рыгор Кастусёў**, **Віталь Макаранка**, **Зьміцер Салаўёў**, актывіст незарэгістраванага «Маладога фронту» **Сяржук Нягацін**.

Каб не пусьціць актывістаў у Менск на вулічную акцыю, міліцыянты правялі шэраг затрыманьняў у рэгіёнах. У Жодзіне затрыманы актывісты «Маладога фронту» **Яўген Ваўкавец**, **Павал Красоўскі**, **Сяржук Слабуха, Алесь Смольскі** — іх падазраюць у вывешваньні бел-чырвона-белых сьцягоў. Аўтамабіль кіраўніка салігорскай філіі ГА «Пэрспэктыва» **Аляксандра Цацуры** зь пяцьцю пасажырамі міліцыянты спынілі на паўдарозе й заявілі, што машына лічыцца скрадзенай.

У Наваполацку 25 сакавіка падчас распаўсюду ўлётак — віншаваньняў з Днём Волі — затрыманы актывіст ПБНФ **Аляксей Трубкін**. Міліцыянтаў выклікаў рэктар Полацкага ўнівэрсытэту Дзьмітры Лазоўскі, якога Трубкін зайшоў павіншаваць.

Вярхоўны суд 25 сакавіка даў адказ на наглядную скаргу адваката зьняволеных **Валер’я Леванеўскага** і **Аляксандра Васільева**: прысуд пакінуты ў сіле.

Суд над старшынём Берасьцейскай абласной арганізацыі Свабоднага прафсаюзу **Валянцінам Лазарэнкавым**, прызначаны на 25 сакавіка, перанесены: міліцыянты, якія вінавацілі яго ў арганізацыі несакцыяванага мітынгу, адклікалі матэрыялы справы для ўдакладненьня.

Лідэра прадпрымальнікаў у Баранавічах **Мікалая Чарнавуса** 25 сакавіка абвінавацілі ў арганізацыі несанкцыянаванага мітынгу 1 сакавіка, у час страйку прадпрымальнікаў, і ў дзейнасьці ад імя незарэгістраванай арганізацыі. За гэта ён аштрафаваны на 10 б.в.

За распаўсюд бюлетэню «Дзень Волі» 25 сакавіка затрыманы актывіст ПБНФ **Аляксей Казлоўскі**.

28 сакавіка ў судзе Цэнтральнага раёну Менску прайшлі суды над затрыманымі на Дзень Волі. На 15 сутак асуджаныя **Карэн Акопаў**, **Вячаслаў Сіўчык**, **Юры Фабішэўскі;** на дзесяць сутак — **Вадзім Таптуноў, Анатоль Ціхановіч;** на сем сутак — **Сяргей Логінаў,** на пяць сутак — **Георгі Байкоў**, **Канстанцін Кароль** (атрымаў чэрапна-мазгавую траўму); **Дзяніс Краўчонак;** на трое сутак — **Уладзіслаў Бародка, Юры Бугаёў**, **Іван Быкоўскі**, **Сяргей Бяжанаў**, **Алег Мінулін**, **Павал Мятліцкі**, **Віктар Новікаў**, **Ігар Новікаў**, **Аляксей Падневіч; Пётар Сакольчык**, **Аляксандар Хаперскаў** (атрымаў чэрапна-мазгавую траўму — амонавец спрабаваў у яго вырваць пірсынг на твары). Штрафы па 50 б.в. (1 млн. 200 тыс.) атрымалі **Зьміцер Гарбуноў, Віктар Савіцкі, Валянцін Сямак.** Граф **Аляксандар Прушынскі** пасьля мітынгу быў затрыманы, але са спэцпрыёмніку трапіў у больніцу, бо ў яго пачаліся праблемы з сэрцам і была вывіхнута рука. Па факце сутыкненьняў зь міліцыяй распачата крымінальная справа. Затрыманы ўдзельнік акцыі актывіст «Зубра» **Андрэй Баранаў** 28 сакавіка дастаўлены ў больніцу з моцнымі траўмамі галавы, пасьля чаго асуджаны на пятнаццацера сутак. Журналістку газэты «Згода» **Натальлю Валакіду** амонаўцы некалькі разоў ударылі, не зважаючы на журналісцкі бэдж.

Вярхоўны суд 25 сакавіка прыняў рашэньне ліквідаваць ГА **«Аб’яднаньне беларускіх скаўтаў»**. Пазоў накіраваў Мінюст, які абвінаваціў арганізацыю ў парушэньні патрабаваньняў закону адносна юрыдычнага адрасу й нелегітымнасьці Сойму, праведзенага ў 2002 г.

У Віцебску 25 сакавіка падчас вулічнай акцыі былі затрыманы актывісты КХП-БНФ **Ігар Мацьвееў**, **Аляксандар Салаўян**, **Барыс Хамайда**, усім вынесьлі судовыя папярэджаньні. Затрыманы зь імі **Алесь Пазьняк** пакараны ня быў.

25 сакавіка стала вядома, што з актывістам БСДП (НГ) зь Віцебску **Аляксеем Гаўруцікавым**, які працаваў вядучым юрыстам прадпрыемства кацельняў і цеплавых сетак, і зь ягонай **жонкай**, якая працавала тамсама, не падоўжылі кантракт.

Канцэрт рок-гурту **«Нэйра Дзюбэль»** у менскім клюбе «Рэактар», прызначаны на 1 красавіка, адменены: адміністрацыя клюбу адмовілася даваць памяшканьне.

**АШ**

# Беларускія дарогі: поўны кош праблем

На II Агульнаэўрапейскай канфэрэнцыі па транспарце (Крыт, 1994) вызначылі дзесяць прыярытэтных міжнародных калідораў. Два ідуць праз Беларусь: калідор №2 (Бэрлін—Варшава—Менск—Масква—Ніжні Ноўгарад) і №9 (Хельсынкі—Санкт-Пецярбург—Масква/Пскоў—Кіеў—Кішынёў—Бухарэст—Дзімітраўград—Александрапаліс) з адгалінаваньнем №9В (Кіеў—Вільня—Коўна—Кляйпэда/Калінінград).

Агульная сетка аўтадарог Беларусі складае 81 471 км (15 441 км рэспубліканскіх і 66 030 км мясцовага значэньня), нормам адпавядаюць 7 965 км. Зношанасьць дарог складае 35%, мастоў — 19%. Працягласьць дарог зь недастатковай трываласьцю і дэфэктамі пакрыцьця — 6 387 км, толькі 440 км здольныя прапускаць нагрузкі ў 11,5 тоны на вось, 7 056 км — у 10 тон, 1 644 км вытрымліваюць нагрузкі ня больш як шэсьць тон на адну вось аўто.

Фінансы дазваляюць сёлета капітальна адрамантаваць 2,7% ад патрэбнага. Каб вырашыць праблему, дэпартамэнт «Белаўтадар» пляную вызначыць на дзяржмяжы пункты пропуску транспарту агульнай масай звыш 24 тон. Агульная працягласьць дарог, на якіх увесну уводзяцца абмежаваньні нагрузкі на вось, — 9 260 км.

Адзначаецца неабходнасьць удасканальваньня сыстэмы зьбіраньня платы за праезд па трасе М1/Е30 Берасьце—Менск—мяжа РФ, бо стаўкі платы за праезд пакрываюць выдаткі на 50%.

Спэцыялісты Дасьледчага цэнтру Інстытуту прыватызацыі і мэнэджмэнту мяркуюць: каб палепшыць стан дарожнай гаспадаркі, трэба павялічыць паступленьні ў дарожныя фонды праз выкананьне дзьвюх умоў: павелічэньне транзытнага грузапатоку церазь Беларусь ды пашырэньне абавязковай аплаты праезду па магістралі М1/Е30 на ўсе катэгорыі карыстальнікаў. Калі другая ўмова ўжо выканана — з 1 сьнежня мінулага году за праезд па магістралі сталі плаціць і беларусы, то істотнае зьніжэньне тэмпаў росту транзытных перавозак праз Беларусь само ператварылася ў вялікую праблему, вымагае вырашэньня на найвышэйшым узроўні.

**Міхал Чарвінскі**


PHOTO.BYMEDIA.NET

## Павезьлі цягнікі

У апошнія 10 гадоў ідзе плянамерная і масавая высечка лясоў. У Пастаўскім раёне не засталося сьпелых сасновых бароў. Бяруцца ўжо за бярозы.

Апошнім часам афіцыйныя СМІ настойліва навязваюць стэрэатып: у Расеі ня ўсё добра з эканомікай. Хоць нафтадаляраў там хапае. А вось у Беларусі ўсё добра. І толькі за кошт павышэньня эфэктыўнасьці вытворчасьці. Мы для сваіх нашчадкаў рыхтуем разьвітую, высокатэхналягічную эканоміку, пакінем некранутай прыроду. Дазвольце не пагадзіцца. Думаю, што так па ўсёй Беларусі, але пішу пра свой, Пастаўскі раён. У апошнія 10 гадоў тут ідзе плянамернае і дзікунскае зьнішчэньне лясоў.

На невялікі па плошчы рэгіён працуюць аж дзьве дзяржаўныя арганізацыі. Лясгас і вытворчы ўчастак аб'яднаньня «Маладэчналес». Працуюць з інтэнсіўнасьцю і напружаньнем круглы год. Дастаткова сказаць, што кожная арганізацыя адпраўляе ў месяц дзясяткі і дзясяткі вагонаў лесу. Менавіта лесу — добра калі ён расьпілаваны на брусы ці дошкі. І ідзе гэты лес у Фінляндыю і Расею, багацейшыя лесам, чым мы. Ідзе ў іншыя краіны замежжа. У нашым раёне нарыхтоўваць сталі нават бярозу — пэўнай таўшчыні, памераў. І ідзе яна для камінаў у Швайцарыю. Пра такую ж пароду, як сасна, і гаварыць няма чаго. Практычна зьнікні сасновыя бары на Пастаўшчыне. Шматгадовыя аматары ціхага паляваньня, трапляючы ў мясьціны, якія палюбілі зь дзяцінства, не пазнаюць іх.

Ня толькі гэтыя дзяржаўныя арганізацыі займаюцца высечкай. У Паставах ды і ў некаторых вёсках раёну ёсьць напаўафіцыйныя тартакі, якія ня так інтэнсіўна пераганяюць бярвёны ў тыя ж брусы. Але іх шмат! Яшчэ некалькі гадоў такой работы — і сьпелага лесу ў раёне ня будзе. Ды яго ўжо практычна і няма. Хоцькі-няхоцькі ўспамінаецца клясычны верш Максіма Танка. Цягнікі з сасной і бярозай вязуць рэсурс нашых нашчадкаў, якім прыйдзецца плаціць па рахунках.

Прадпрымальныя людзі зь лесавысечкі даўна асвойваюць новыя рэгіёны. Як, напрыклад, прыватнае прадпрыемства Бабічава і Савіцкага, якое разгарнулася так, што мае ўжо больш за 200 работнікаў. Але справядліва трэба зазначыць, што прадпрыемства адпраўляе за межы краіны не лесасыравіну, а гатовыя дзьверы.

Нехта павінен жа займацца і аднаўленьнем лесу? Хоць бы той жа Пастаўскі лясгас. І паводле справаздач лесу высаджваецца больш, чым высякаецца. Хаця ў прыватных размовах работнікі прадпрыемства толькі рукамі махаюць. Галоўная задача ў іх — секчы. Нават калі справаздачы слушныя, нельга не заўважыць: для таго, каб сасна стала сьпелай, каб вырас сапраўдны бор, патрэбна пад сто гадоў. Дык колькі пакаленьняў наступнікаў мы пазбаўляем найгалоўнейшай нашай прыгажосьці — некранутых, адвечных бароў?

Так што з расейскіх нафтадаляраў можна пасьміхнуцца. Але ж тады дайце справаздачу: колькі даляраў прыносіць дзяржаве штогод беларускі лес?

**Міхал Гіль, Паставы**

СЬЦІСЛА

### Тэлефануйце ў Воршу па-новаму

5 красавіка Аршанскі раённы вузел электрычнай сувязі пяройдзе на шасьцізначную нумарацыю, што абумоўлена неабходнасьцю рэарганізацыі тэлефоннай сеткі гораду і раёну. На пачатку году ў Воршы праведзена замена ўстарэлай АТС-2 на новую электронна-лічбавую. Памяняліся тэлефоны ў дзесяці тысяч абанэнтаў (усе, што пачыналіся з двойкі). Пяцізначная нумарацыя вычарпала сябе. На ўзор Віцебску, Полацку і Наваполацку Ворша будзе мець шасьцізначную нумарацыю. Анулюецца і стары міжгародні код гораду — 02161. Цяпер трэба будзе набіраць 0216, а затым новы шасьцізначны нумар, які будзе зь лічбы 2. Як запэўніваюць сувязісты, пасьля рэарганізацыі сувязь значна палепшыцца. Пакуль жа абанэнты маюць адны клопаты. Адразу ўстарэлі і два выдадзеныя летась тэлефонныя даведнікі. Адзін зь іх нават не распрададзены.

### Жніво СНІДу

У Воршы зарэгістраваны першы выпадак нараджэньня дзіцяці ад ВІЧ-інфікаванай маці. Цяпер немаўля знаходзіцца пад наглядам дактароў, і толькі праз некалькі месяцаў можна дакладна вызначыць, як адбілася хвароба маці на ягоным здароўі. Дарэчы, у Віцебскай вобласьці нарадзілася ўжо больш за 20 дзетак ад ВІЧ-інфікаваных мацярок. Апошняй тэрмінальнай стадыяй ВІЧ-інфэкцыі зьяўляецца СНІД. Зыход гэтай хваробы заўсёды трагічны. У Беларусі на сёньня афіцыйна зарэгістраваныя 543 сьмяротныя выпадкі сярод ВІЧ-інфікаваных, зь якіх 77% складаюць наркаманы.

**Яўген Жарнасек, Ворша**

### Найбольш сухотнікаў — на памежжы з Расеяй

У Гомелі прайшло пасяджэньне круглага стала па пытаньнях прафіляктыкі сухотаў. Намесьнік начальніка ўпраўленьня аховы здароўя аблвыканкаму Міхаіл Прыступін канстатаваў, што найболей хворых на сухоты — на беларуска-расейскай мяжы — у Чачэрскім, Добрускім, Веткаўскім, Буда-Кашалеўскім раёнах. Тут зафіксавана 909 хворых, ці 60,6 чалавека на 100 тыс. (У 2003 г. было 842 хворыя). Урачы мяркуюць, што неспрыяльная абстаноўка зьвязана з высокай міграцыйнай актыўнасьцю насельніцтва. У групе рызыкі — работнікі галін жывёлагадоўлі, мэдыцыны і гаспадарчы пэрсанал школ.

### Алей замест тлушчу

У войску пашыраны асартымэнт прадуктаў, што ўваходзяць у салдацкі паёк. Пра гэта заявіў намесьнік міністра абароны па тыле — начальнік тылу Ўзброеных сіл генэрал-маёр Івар Чыкал. З 1 студзеня ў агульнавайсковы паёк уведзены такія прадукты, як булачка з пшанічнай мукі першага гатунку — 100 грамаў, каўбасныя вырабы — 80 грамаў. Апроч таго, замест раней належных 20 г жывёльнага тлушчу салдаты атрымліваюць 20 г алею. Паводле інфармацыі сп.Чыкала, калярыйнасьць набору прадуктаў па агульнавайсковым пайку складае 4170 кілякалёрый.

**Паводле БелаПАН**

# Калі гучыць Стома

Гэта быў геній, якім яго апісваюць у падручніках мэдыцыны. Адзін з самых яркіх беларускіх кампазытараў XX стагодзьдзя. Пры гэтым ён ня меў ніводнага прыжыцьцёва выдадзенага ў Беларусі запісу. Ягоная «Бел-чорна-белая» п'еса застанецца такім сама вечным сьведчаньнем пра лукашэнкаўскую эпоху-сынкопу, як Блякадная сымфонія Шастаковіча — пра нацысцкую аблогу Ленінграду. Стома нарадзіўся ў Літве, заўжды размаўляў толькі па-беларуску і правёў 11 апошніх гадоў жыцьця ў Польшчы наладчыкам музычных інструмэнтаў.



Гэта быў геній, якім яго апісваюць у падручніках мэдыцыны. Ён усё жыцьцё вучыўся. Меў філялягічную і музычную адукацыю, цікавіўся мэдыцынай, атрымаў дыплём мастацтвазнаўцы. У Кансэрваторыю паступіў, калі ўжо скончыў Інстытут замежных моў. Ведаў францускую, нямецкую, польскую, ангельскую, расейскую, літоўскую і лацінскую мовы.

Выдавец Міраслаў Адамчык, які езьдзіў з кампазытарам у адну з фальклёрных экспэдыцый у 1986 г., прыгадвае, што імі, 20-гадовымі, навучэнец «кансы» 32-гадовы Стома ўспрымаўся як дзед: «Доўгая барада і лысіна, дзівак, але які аўтарытэт! Ён заходзіў у касьцёл за Нарачччу, сядаў і граў на аргане».

Сябар Стомы Ўладзіслаў Ахроменка, які жыў зь ім на адным паверсе ў кансэрваторскім інтэрнаце на Старавіленскай, усьміхаецца: «На выгляд ён быў Карабасам Барабасам». «У свой пакойчык, — прыгадвае кампазытар Зьміцер Лыбін, іншы калега Стомы па кансэрваторыі, — Мікола цягнуў даведнікі і слоўнікі на розных мовах. Той жа пакой служыў цэнтрам сучаснай музыкі, куды выпісваў з-за мяжы каштоўныя музычныя запісы, якіх па тым часе дастаць у Беларусі было немагчыма».

Стома быў з падвіленскага шляхецкага роду, чым вельмі ганарыўся, пісаўся ва ўсіх дакумэнтах палякам, марыў жыць у Вільні, але размаўляў выключна па-беларуску. Калі ў яго нехта пытаў, чаму ён карыстаецца беларускай мовай, адказваў: «Таму што беларус». У.Ахроменка згадвае: «У тыя часы ў кожнай кансэрваторскай групе быў яркі нацыяналіст. Асабліва вылучаліся Кастусь Сакалоўскі, Ларыса Сімаковіч і, вядома, Стома».

## Іншае жыцьцё

Па заканчэньні кансэрваторыі ў 1991 г. Мікалай Стома зьяжджае ў Варшаву, дзе працягвае навучаньне ў Варшаўскай музычнай акадэміі. У Менск ён так і не вярнуўся.

У Варшаве кампазытар пражыў 11 год — у кастрычніку 2002 году яго ня стала. Яго сямейнае жыцьцё ня склалася: жонка і сын жылі ў Літве, Стома — пераважна ў аднапакаёўцы ў Варшаве. Меў два грамадзянствы — польскае і літоўскае.

Працаваў ён наладчыкам каштоўных інструмэнтаў у Варшаўскай і Беластоцкай музычных акадэміях, у Варшаўскай ён выкладаў па клясе фартэпіяна.

Ён заўсёды радаваўся гасьцям зь Беларусі. Калі беларускія музыкі прыяжджалі на «Польскую музычную восень» — выступаў для іх у якасьці перакладчыка. Зьміцер Лыбін бачыўся са Стомам за некалькі дзён да яго сьмерці, той быў у дэпрэсіі праз праблемы са зрокам, але па-ранейшаму шмат працаваў.

## Несаюзны кампазытар

Некаторыя ягоныя творы гучаць на Беларускім радыё, некаторыя вывучаюцца ў дысэртацыях сёньняшніх навучэнцаў Беларускай акадэміі музыкі. Сам Стома так і ня стаў сябрам Беларускага саюзу кампазытараў. Кажуць, што праз адсутнасьць патрэбнай гнуткасьці, бо ніколі ня ўтойваў сваіх меркаваньняў. Затое Стома стаяў ля вытокаў Беларускага таварыства сучаснай музыкі, заснаванага ў 1990 г.

Зьміцер Лыбін, які цяпер зьяўляецца старшынём гэтага таварыства, кажа, што Стома — адзін зь першых беларускіх кампазытараў, які пачаў вызіраць з-за рамак музычнага сацрэалізму і карыстацца сучаснымі музычнымі сродкамі, якіх за савецкімі часам не выкарыстоўвалі. «У нас жа музычная адукацыя досыць акадэмічная застаецца і дагэтуль», — кажа Лыбін.

Прафэсар Дзьмітры Смольскі, у клясе якога на катэдры кампазыцыі вучыўся Стома, гаворыць: «Пісаў ён няшмат, у асноўным камэрныя творы для аднаго-двух выканаўцаў. Гэта эстэцкія творы, не для масаў. Падобную музыку па-сапраўднаму могуць ацаніць толькі прафэсіяналы». Прафэсар Смольскі, магчыма, памыляецца. Творы Стомы ў аматарскіх запісах разыходзіліся між простых аматараў музыкі. Яны філясафічныя і кранальныя адначасова.

## Камэрнасьць і эстэцтва

Стома стаўся адным зь першых беларускіх кампазытараў, твор якога выканалі на буйным фэстывалі «Сусьветныя дні музыкі», што праходзіць штогод у розных краінах. Гэта здарылася ў 1992 г., калі фэстываль праходзіў у Польшчы. «Усяго за гісторыю беларускай музыкі кампазытараў, якіх выконвалі на «Сусьветных днях...», было пяцёра. І Стома ў гэтай славутай пяцёрцы», — кажа Зьміцер Лыбін. Стома мог атрымаць сусьветнае прызнаньне, калі б на раскрутку такіх, як ён, працавала пэўная сыстэма. Але, як экспэрымэнтатар і нонканфарміст, у сыстэму ён не пападаў.

Затое ўплываў на калег. Кампазытарка Ганна Кароткіна лічыць яго настаўнікам сваім і цэлага пакаленьня маладых.

Ягоныя «Повязі для дзьвюх флейтаў» і Бел-чорна-белая п'еса (якую можна параўнаць з «Ноччу на Лысай гары» Мусаргскага) выконваюцца на менскіх канцэртах, запісы захоўваюцца ў бібліятэцы Дзяржаўнай акадэміі музыкі. Аднак творы Стомы недаступныя для шырокай публікі. Каб выдаць дыск тысячай асобнікаў зь якаснай паліграфіяй і ўпакоўкай, трэба пад 800 даляраў. «У нас такіх сродкаў няма», — разводзяць рукамі яго менскія сябры...

І беларускія, і польскія сябры Стомы саматужна выдалі дыскі зь ягонымі творамі. У прадмове да аднаго зь іх напісана: «Гэта магчымасьць аддзячыць чалавеку, які ня меў ніводнага выдадзенага запісу пры жыцьці. Мажліва, гэта музыка будзе найлепшым напамінам пра яго. Гэта, на жаль, пасьмяротны дыск для цябе, Мікола, дзе б ты ні быў. Мажліва, ты спачываеш там у спакоі».

**Сяргей Будкін**

## Плывец з Троцкіх азёраў

Яшчэ ў брэжнеўскія часы мне пашчасьціла пазнаёміцца зь Міколам Стомам на сходках «Майстроўні», што адбываліся ў Палацы прафсаюзаў. Ужо сваім выглядам ён абарачаў на сябе ўвагу: ссутулы, худы, доўгабароды, з даўгімі нэрвічнымі пальцамі, ён заўсёды нібы крыху ўсьміхаўся. Але тады я нават не наважваўся зь ім гутарыць, бо меркаваў, што ён нашмат старэйшы. Хоць у ягоных, дарэчы, вельмі артыстычных, паводзінах не было ніякага дыстансу ад маладзейшых.

Шмат пазьней мне даводзілася бачыцца са Стомам у незалежнай ужо Літве, грамадзянінам якое ён стаў. Аднаго сьпякотнага летняга дня ён зьявіўся ў віленскай Рэдакцыі «НН» — цыбаты, бледны, але ўсё з той жа паўусьмешачкай у вачах. Тады, разгаварыўшыся як сьлед, дазналіся, на свой подзіў, што ён моцна захапляецца спортам і пры кожнай магчымасьці імкнецца на Троцкія азёры плаваць. А наагул ён бываў у Літве вельмі часта, у падвіленскім мястэчку Лендварова (цяпер Lentvaris), дзе жылі ягоныя бацькі. Адкрыцьцём для мяне было ягонае вольнае валоданьне літоўскай моваю й веданьне на памяць плоймы польскіх клясычных вершаў. Зь беларускай жа літаратуры ён шанаваў Быкава, Караткевіча, але перадусім — Уладзімера Арлова. Ён надзвычай ганарыўся сваёй шматкультурнасьцю, нават выпінаў гэта, нібы знарок дражнячы беларускіх, польскіх, расейскіх (ягоная жонка была з Уралу) ды літоўскіх нацыяналістаў.

Мікола Стома быў першым зь беларускіх кампазытараў, хто пачаў пісаць музыку на кампутары, на самым пачатку 1990-х гадоў. Лішне казаць, што ў музыцы ён быў надзвычайным эрудытам. Пішучы цалкам «сур'ёзную» музыку, меў вельмі шырокі дыяпазон захапленьняў, ад «Pink Floyd» да аматарскіх выкананьняў этнічнае музыкі. Запісы ягоных твораў «Повязі», «Строфы», «Блуканьні» гучалі найперш за Бугам. Так сталася, што кампазытара Стому сёньня ведаюць найперш у Варшаве, у Лёндане (дзе ён рабіў запісы свае музыкі) ды Вільні. Чаму не ў Беларусі, зь якою ён быў неадзельна зьнітаваны? Хто-хто, а колішнія сябры й калегі па Беларускаму Таварыству Сучаснай Музыкі выдатна ведаюць кампазытара Міколу Стому, але...

**Сяргей Харэўскі**

# Невядомы кампазытар

«Works». Творы Мікалая Стомы.

Неймаверныя часам трапляюцца дыскі! Збор твораў заўчасна памерлага кампазытара і піяніста Мікалая Стомы прыносіць некалькі твораў, якія дэманструюць рознабаковасьць яго творчых памкненьняў і адначасова даюць адчуць глыбіню сапраўднага таленту музыкі.

Народжаны ў 1954 годзе, ён з часам набыў глыбокія веды ў розных галінах, у тым ліку ў гісторыі, атрымаў адукацыю як піяніст і кампазытар, у 1991 годзе пераехаў у Польшчу, дзе хутка набыў аўтарытэт у Варшаўскай акадэміі музыкі, чытаючы лекцыі ды выступаючы з канцэртамі. Ён быў сапраўды сучасным музыкам, пісаў як для традыцыйных інструмэнтаў, так і для сынтэзатара, ягоная музычная мова ня ведала абмежаваньняў. Пры гэтым як творца ён ня жыў замкнёна ад таго, што адбывалася навокал. І тое, што Зянон Пазьняк прысьвяціў музыку верш «Музыка Міколы Стомы», таксама шмат пра што гаворыць. Дастаткова праслухаць гэты дыск, каб нават ня дужа апантаны сучаснай акадэмічнай музыкай чалавек зразумеў, якога творцу страціла Беларусь.

Дыск складзены з адрэстаўраваных запісаў Стомы розных гадоў, зробленых у розных месцах. Адкрываецца альбом этудам для арфы — надзвычай сьветлым, калярыстычным творам, які літаральна прыадчыняе таямніцы і магчымасьці гэтага інструмэнта найперш для тых, хто раней ня чуў яго сола. «Повязі» для дзьвюх флейтаў — віртуозны твор камэрнага пляну. «Blanche-Noire-Blanche» выконвае на фартэпіяна сам аўтар. А інакш і быць не магло: гэты праграмны твор, вельмі драматычны паводле зьместу, нават змрочны, прысьвечаны сучаснай Беларусі, рэаліям жыцьця ў «самай дэмакратычнай» краіне сьвету. Шчыра кажучы, зь ліку сучасных кампазытараў нават цяжка й прыгадаць што-небудзь больш пранізьлівае. Магчыма, і ёсьць падобнага зьместу творы, ды дзе ж ты іх пачуеш?! Мо толькі ў Варшаве…

Дзьве п'есы гучаць у выкананьні арганіста Канстанціна Шарава, «Au petit bonheur» выконвае Дзяржаўны сымфанічны аркестар пад кіраўніцтвам Юр'я Цырука, «Строфы для фартэпіяна» — піяністка С.Эштэні (канцэртны запіс). Завяршаюць праграму альбому дзьве п'есы для сынтэзатара, у якіх выразна адчуваецца ня толькі цікавасьць да новай гукавой палітры, але й адкрытасьць аўтара да новых музычных тэхналёгій наагул. Шчыра кажучы, варта было б гэтыя мініятуры паслухаць усім тым айчынным выканаўцам электроннай музыкі, хто прэтэндуе на пазыцыі лідэраў гэтага напрамку. Прынамсі, не пашкодзіць. А мо шмат чаму й навучыць.

Зважаючы на зборны характар альбому, на якасьць запісу некаторых твораў можна не зьвяртаць увагі. Яны ўжо — гісторыя, дакумэнт, хоць варта верыць, што творы гэтыя будуць яшчэ гучаць і гучаць. Шкада таксама, што на ўкладцы ў альбом не стае вельмі неабходнай у такой сытуацыі інфармацыі, хоць бы адносна гадоў напісаньня твораў. Затое згаданы электронны адрас, праз які можна атрымаць больш інфармацыі і набыць копію альбому: yarblokes@yahoo.com. Шчыра кажу: варта мець гэты альбом.

**Зьбянтэжаны СЛУХАЧ**

### Мікалай Стома

Творы

1. **Etude pour l'harpe** — 7:10 *Д.Шышкоўска* (арфа), запіс 1994—1995 г.
2. **Poviazi pour 2 flutes** — 3:47 *Якаў Гелер і Сяргей* Махаў (флейта), запіс 1989 г.
3. **Blanche-Noire-Blanche** — 9:53 *Мікалай Стома* (фартэпіяна)
4. **Deux berceuses I** — 3:29
5. **Deux berceuses II** — 1:44 *Канстанцін Шараў* (арган)
6. **Marche «Au petit bonheur»** — 9:09 Беларускі дзяржаўны сымфанічны аркестар, дырыжор Юры Цырук
7. **Strophes pour piano** — 11:38 *С.Эштэні* (фартэпіяна), канцэртны запіс з «Варшаўскіх сусьветных музычных дзён», 1992
8. **Deux esquisses pour synthétiseur I** — 4:33
9. **Deux esquisses pour synthétiseur II** — 3:55

Зь ліку сучасных кампазытараў нават цяжка й прыгадаць што-небудзь больш пранізьлівае.

**ЗЯНОН**

### Музыка Міколы Стомы

Над далёкімі лясамі
Сіні арэол.
Таемны згук і галасы з дарог.
Цягнік па стыках,
Як табун, прабег.
Кляпаюць косы.
І рокат трактароў,
І мроіва над зямлёй,
І далячынь — шчымлівая струна —
Мінулы час пра Беларусь,
Пра Беларусь гучыць...




# Усё гэта містычна

Мікалай Стома нарадзіўся 6 ліпеня 1954 г. у Дварцы (Гарадзеншчына). Яго маладосьць прайшла ў Беларусі, хаця ў студэнцкія гады ён пападарожнічаў па прасторах былога СССР. У 1976 г. атрымаў дыплём спэцыяліста ў галіне замежных моў. У 1982 г. ён пайшоў па сапраўднае пакліканьне, паступіўшы ў Менскую музычную вучэльню і працягнуўшы адукацыю ў Менскай кансэрваторыі ў 1986 г. Пад канец гэтага пэрыяду ён зрабіўся выдатным піяністам і неардынарным кампазытарам. У 1991 г. Мікола пераехаў у Польшчу, краіну сваіх продкаў, спадзеючыся зарабіць там на дом для сваёй жонкі, якая часова засталася ў Вільні. Годам пазьней, ужо стаўшы бацькам, паступіў у Шапэнаўскую акадэмію музыкі ў Варшаве, выступаў як піяніст. Адораны дасканалым слыхам, ён зрабіўся наладчыкам фартэпіяна. Ён таксама чытаў лекцыі, выступаў з канцэртамі, даваў прыватныя ўрокі музыкі і пастаянна займаўся перакладамі, каб практыкавацца ў шасьці замежных мовах, якімі ён дасканала авалодаў раней. Валоданьне гэтымі мовамі было таксама ягоным ключом да багацьцяў літаратуры і гісторыі, якімі ён так захапляўся.
Ягоная нечаканая сьмерць 6 кастрычніка 2002 г. стала шокам для ўсіх, хто любіў гэтага сяброўскага, сьціплага, неардынарнага чалавека. Ён быў цалкам аддадзены музыцы, але не адрываўся і ад жыцьця, таму заўсёды быў першым жартаўніком і прамоўцам тостаў на сьвяточных вечарынах. Ён быў пахаваны ў Вільні, дзе жыў са сваёй жонкай Янінай і сынам Мікалаем.
Матэрыял гэтага кампакт-дыску рэмасьціраваны з касэты, якую Мікола падарыў нам незадоўга перад сваёй сьмерцю. Ад задуменнага «Blanche-Noire-Blanche» (асуджэньне лукашэнкаўскай дыктатуры ў Беларусі) да мадэрнісцкіх «Deux esquisses pour synthétiseur» запісы з гэтай стужкі ілюструюць разнастайнасьць Міколавай творчасьці. Ён таксама папрасіў нас адсканаваць для яго тры фатаграфіі, але, на жаль, так і ня ўбачыў выніку. Для нас усё гэта выглядае ў нейкай ступені містычна, бо, наколькі мы ведаем, ніякіх іншых запісаў яго твораў не існуе.

**МБ, АГ**

КАЛЯНДАР

# Красавік

**1** — 100 гадоў з дня нараджэньня Лешка Асоўскага (1905—1996), польскага мовазнаўца, дасьледніка беларускае мовы.

**2** — 200 гадоў з дня нараджэньня Ганса Хрысьціяна Андэрсэна (1805—1875), дацкага пісьменьніка.

**6** — 50 гадоў таму выйшаў першы нумар газэты «Голас Радзімы» (1955). Да 1960 г. выходзіла пад назвай «За вяртаньне на Радзіму».

**7** — Дабравешчаньне ў праваслаўных.

**7** — 125 гадоў з дня нараджэньня Вікенція (Вінцаса) Міцкявічуса-Капсукаса (1880—1935), камуністычнага дзеяча, старшыні Саўнаркаму і наркама замежных справаў Літоўска-Беларускай ССР.

**11**— 150 гадоў з дня нараджэньня Арсена Маркевіча (1855, Берасьце — 1942), архівіста, літаратуразнаўца, аўтара прац па археалёгіі й гісторыі Крыму, чальца-карэспандэнта АН СССР.

**14** — 125 гадоў з дня нараджэньня Язэпа Дылы (1880—1973), пісьменьніка, тэатразнаўца. У студзені—лютым 1919 г. — камісар працы ў Часовым рабоча-сялянскім савецкім урадзе БССР. З 1924 праваздзейны сябар і вучоны сакратар Інбелкульту. У 1930 г. быў рэпрэсаваны й высланы ў Саратаў.

**15** — 75 гадоў з дня нараджэньня Расьціслава Платонава (1930—2001), гісторыка, дасьледчыка рэпрэсій.

**21** — 50 гадоў з дня нараджэньня Ўладзімера Дзянісава (1955), гісторыка культуры, менскага краязнаўца.

**23** — 100 гадоў з дня нараджэньня Савелія Сьвідзерскага (1905—1977), Героя Савецкага Саюзу, удзельніка Другой сусьветнай вайны.

**27** — 75 гадоў з дня нараджэньня мастака Мая Данцыга (1930).

**29** — 150 гадоў з дня заснаваньня Віленскага музэю старажытнасьцяў (1855—1914). Адчынены 1 сьнежня 1856 г.

СЬЦІСЛА

### Кулінковіч: «Я ў шоку...»

Канцэрт «Нэйра Дзюбэлю», заплянаваны на 1 красавіка, не дазволены. Кіраўніцтва клюбу, дзе мусіў адбыцца канцэрт, спасылаецца на аддзел культуры Менгарвыканкаму, чыноўнікі кажуць, што нічога не адмянялі. Адмена выступу стала шокам для музыкаў, бо дазвол на правядзеньне канцэрту ўжо быў дадзены, грошы на рэкляму ўкладзеныя, палова квіткоў раскупленая. Аляксандар Кулінковіч кажа: «Я ў шоку, ня ведаю, што будзе далей, гэта ж не палітычная акцыя, а наш сольны канцэрт». Дазвол на правядзеньне імпрэзы давала ўпраўленьне культуры Менгарвыканкаму. Начальнік аддзелу гэтага ўпраўленьня Ўладзімер Хамянкоў пацьвярджае гэты факт: «Дачыненьня да адмены канцэрту мы ня маем і дазволу не скасоўвалі; відаць, у арганізатараў зьявіліся нейкія праблемы і яны вырашылі не праводзіць канцэрту», — дадае ён. Між тым, кіраўніцтва «Рэактару» спасылалася менавіта на тэлефанаваньне з упраўленьня культуры… Які б дурань ні забараніў — няважна. Усё адно ён толькі дадасьць групе Кулінковіча культавасьці.

**Сяргей Будкін**

### Надсану — прэмію Багушэвіча

Літаратурную прэмію імя Францішка Багушэвіча Беларускі ПЭН-цэнтар сёлета прысудзіў а.Аляксандру Надсану за кнігу «Біскуп Чэслаў Сіповіч: сьвятар і беларус». Як сказаў старшыня ПЭН-цэнтру Лявон Баршчэўскі, журы выбірала з чатырох прэтэндэнтаў. Кнізе Надсана аддалі перавагу як наватарскай: «У нас звычайна па гісторыі беларускай царквы выдаюцца абагульняльныя працы, а тут усё паказана на прыкладзе жыцьця і дзейнасьці аднаго чалавека». Прэмію ляўрэату мяркуюць уручыць падчас ягонага найбліжэйшага прыезду ў Беларусь.

### «Залаты апостраф»

«Залаты апостраф» — прэмію недзяржаўнага часопісу «Дзеяслоў» — атрымалі сёлета Людмiла Рублеўская (у намінацыі «проза»), Алесь Пісьмянкоў (пасьмяротна, у намінацыі «паэзія») і аўтар «НН» Усевалад Сьцебурака (у намінацыі «дэбют»). Узнагароджваньне адбылося ў Дзень Волі.

### Кінаклясыка для ўсіх

«Кінавідэапракат» мяркуе ўвосень аднавіць у Менску кінавідэасалён клясычных фільмаў. Год таму яго зачынілі, бо рамантавалі дом, у якім ён месьціўся. Цяпер салён атабарыцца ў адным са сталічных кінатэатраў.

**АВ**

# Краіна ТАКаНЕ



**АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ**





**Армэнія. Краіна, зь любога пункту якой можна ўбачыць біблійны Арарат. Гара знаходзіцца ў Турцыі, але застаецца духоўным сымбалем і сусьветна вядомым брэндам Армэніі. Краіна, дзе максымумы характару можна вытлумачыць асаблівасьцямі рэльефу. ТАКаНЕ. Такі відэаверш нарадзіла ў мяне Армэнія.**

**Няма ў чорна-белых армян паўколераў, паўінтанацый, няўпэўненасьці ў самаўспрыманьні. Усе ў гарнітурах у чорна-белую палоску, скураных чорных куртках, радзей — дублёнках. Кожны — энцыклапэдыя армянскай гісторыі. З зайздрасьцю слухаў аповеды пра армянскія карані вядомых ва ўсім сьвеце асоб, пра якія тут ведаюць абсалютна ўсе. «Калі б мы актыўна не прапагандавалі нашай культуры — даўно б зьніклі з мапы сьвету і незалежнай краіны ня мелі б». Калі багаты — палац на ўзгорку Ерэвану, належыць «Дурному Гаго», побач — пэрсанальная царква, «Майбах» не хаваецца ў гаражы (як у багатых менчукоў), а, не кіруючыся ніякімі правіламі дарожнага руху, імчыць на чырвонае сьвятло. Кіроўца толькі крычыць ды маша рукамі: «Адыдзі!» У маршрутках, калі няма месца, усе пасунуцца, потым яшчэ, і яшчэ, і яшчэ раз...**



**Мова адразу незразумелая, потым пачынаеш вітацца «барэў дзэс» («добры дзень» па-нашаму) і дзякаваць у рэстарацыях «шнора калюцюн». Рэстарацый, бараў і кавярняў у Ерэване шмат, значна больш, чым у Менску. І яны абсалютна розныя. Ад начнога клюбу «Монтэ-Крыста», дзе зьбіраюцца геі і лесьбіянкі, замежнікі і творчая моладзь ды танчаць на сталах, да эстэцкага бару «The Club», дзе можна папіць гарбаты, лежачы на падушках. Ёсьць яшчэ супэрдарагія джазавыя, мэксыканскія і кітайскія...**





**«Армэнія — цьвік у ісламскім сьвеце...» — кажуць пра сябе жыхары краіны. Мо таму і ёсьць лёгкі налёт ісламскіх традыцый. Гарадзкія, а тым больш вясковыя жанчыны рэдка ядуць разам з мужчынамі. Выняткі складаюць тыя, хто працуе на замежныя кампаніі і фундацыі, якіх даволі багата.**

**Вёска працавітая, але бедная. Сем'і вялікія, жывуць усе разам, пакуль не зьявіцца свая, а зь ёй — асобны дом.**

**Далягляды Арменіі — гэта горы. Усюды. З гор краіна пачынаецца, гарамі і канчаецца.**






**Царква свая — Армянская Апостальская. У полі на азэрбайджанскай мяжы пад Мазрофам — пабудова: толькі сьцены, няма акон і дзьвярэй. Каплічку нашу нагадвае. Цэрквы IV—V стагодзьдзяў не зачыняюцца, няма аховы, абразоў, толькі зрэдку захаваўся старажытны роспіс на сьценах ды крыжы.**

**Армэнія — краіна старажытная, якая і беларуса робіць самім сабой.**

# Фінская мадэль школы

Няма адказаў ля дошкі і нечаканых кантрольных. Пануе поўнае свабода ў форме адзеньня. Вучні могуць слухаць музыку і хадзіць па кабінэце ў часе заняткаў. Строгія касьцюмы не абавязковыя нават падчас выпускных экзамэнаў. Школа мараў? Не — фінская школа.

Нягледзячы на адносна невялікую колькасьць вучэбных гадзін у тыдзень і досыць кароткую праграму навучаньня на кожным узроўні, фінская адукацыйная сыстэма можа лічыцца ўзорам для Эўропы. Фінляндыя паказвае найлепшыя вынікі ў навуцы, а пэдагагічныя спэцыяльнасьці тут такія ж папулярныя, як прафэсіі ў сфэры інфарматыкі.

Паводле зьвестак Міжнароднай праграмы ацэнкі вучняў (PISA), сярод прадстаўнікоў 41 краіны ў прыродазнаўчанавуковых пытаньнях найлепш арыентуюцца фіны. Тое самае зь лінгвістычнымі ведамі. Калі ж гаварыць пра здольнасьць спраўляцца з матэматычнымі задачамі, фінаў апярэджваюць толькі карэйцы. Другое месца прадстаўнікі Фінляндыі занялі таксама ў досьледах, на мэце якіх было прадэманстраваць уменьні рашаць праблемы. Для параўнаньня — польскія школьнікі апынуліся толькі на 26 месцы, перад Латвіяй і адразу за Нарвэгіяй.



### Бясстрэсавае выхаваньне

Пры галоўным уваходзе адной са школ з швэдзкай мовай навучаньня ў Хельсынкі мяне чакае настаўніца, зь якой я папярэдне дамовілася пра сустрэчу па тэлефоне. Яна вядзе мяне на свой урок у дзявятай клясе. Ідучы праз школьны вэстыбюль, я ўглядаюся ў велізарныя вітрыны, за якімі адно пры адным стаяць чучалы зьвяроў.

— Гэтага льва, ільвіцу і гэтую мартышку нам падарыў заапарк, рэшту экспанатаў школа зьбірала на працягу многіх год, — тлумачыць мая суправаджальніца. — Вучні нават на перапынках маюць магчымасьць падвучыць біялёгію, — усьміхаецца яна.

У кабінэце матэматыкі ўжо сядзяць некалькі вучняў. Настаўніца зачыняе дзьверы, падыходзіць да графпраектара і на празрыстай плёнцы накідае абрысы двух тэлевізараў. Збоку падае дзьве цаны, зь якіх адна большая. Заданьне — падлічыць, на колькі працэнтаў адзін тэлевізар таньнейшы за другі.

Вучань, які сядзіць перада мной, выцягвае з заплечніка слухаўкі ад плеера і надзявае іх. Другі пачынае хадзіць па клясе. Трэці школьнік завяршае сваё другое сьнеданьне. Дзьве дзяўчыны побач размаўляюць. Настаўніца ў поўным спакоі раздае ксэракопіі з чарговым заданьнем. Ня робіць заўваг, не крычыць на занадта шумных вучняў.

— Ганна-бананна! — жартам гукае раптам настаўніцу вучаніца з густым макіяжам на твары — не разумее заданьня, патрабуе дапамогі…

### Наш прынцып — цярпімасьць

Пасьля ўроку настаўніца тлумачыць, што гэтая кляса трохі слабейшая ў матэматыцы. На пытаньне, чаму яна дазваляе на занятках вучням займацца ўсім, чым яны хочуць, пэдагог адказвае:

— Наш прынцып — цярпімасьць.

Фінская сыстэма адукацыі істотны націск робіць на так званае бясстрэсавае выхаваньне. Адсутнасьць рэакцыі на пэўныя непажаданыя паводзіны падчас уроку ці дазвол на стаўленьне да настаўніка як да равесьніка са школьнай парты — гэта толькі два аспэкты ўжыванага мэтаду.

За бясстрэсавасьць даводзіцца плаціць. Згодна з дасьледаваньнямі, што праводзяцца па даручэньні міністэрства адукацыі, з году ў год расьце колькасьць выпадкаў агрэсіі ў школах. Непакоіць тое, што да росту сумнай статыстыкі прычыняюцца дзеці, маладзейшыя за 15 год.

— У нашай школе толькі аднойчы здарылася, што адзін з вучняў ня здолеў справіцца са сваёй злосьцю на настаўніка і ўкусіў яго. Іншых такіх экстраардынарных здарэньняў, на шчасьце, не было. Той інцыдэнт скончыўся для вучня размовай з псыхолягам. Таксама нам удалося выклікаць бацькоў, — расказала дырэктар.

— Затое ў школах няма праблем з алькаголем ці наркотыкамі. Мне не даводзіцца таксама наймаць для школы ахову, — дадае яна.

Сярэдні заробак фінскага настаўніка чыстымі — больш як 2700 даляраў.

У кожным кабінэце ёсьць тэлевізар, графпраектар, дошка, на якой пішуць флямастэрамі, а ня крэйдай.

— Ніколі не было, каб я на некага накрычала. Нас вучаць, што гэта недапушчальна, — кажа настаўніца Тар'я.

— Сьпісваць нявыгадна, бо можна «завваліць» экзамэн і атрымаць сярод таварышаў рэпутацыю махляра, — кажа вучань.

Дзяржава забясьпечвае кожнага вучня падручнікамі, канцтаварамі і нават гарачым абедам.

### А як у правінцыі?

Саарэла — невялікая мясцовасьць за некалькі кілямэтраў ад Оўлу — гораду ў цэнтральнай Фінляндыі. Тут навокал лес, драўляныя дамы, менш руху на вуліцах. Будынак базавай школы і ліцэю ў Саарэле нашмат меншы за той, што давялося бачыць у Хельсынкі. Большасьць дзяцей адзета сьціпла, радзей можна сустрэць нафарбаваных дзяўчат.

На гэтым адрозьненьні паміж школай у сталіцы і ў правінцыі канчаюцца.

Клясы абсталяваны аднолькава. У кожным кабінэце ёсьць тэлевізар, графпраектар, дошка (на якой малююць флямастэрамі, а ня крэйдай). Маркеры, карткі, папера для ксэракопій — таксама за кошт школы.

На ўроках той самы гармідар і лібэральныя настаўнікі. Вучні, якія слухаюць на занятках музыку ці займаюцца сваімі справамі, не зьяўляюцца аб'ектамі для крытыкі ці карных захадаў.

— Я ведаю, што шмат што залежыць ад мяне. Заўжды сачу за паводзінамі вучняў і, калі яны пачынаюць размаўляць з прыяцелямі на пабочныя тэмы, мяняю тактыку — стараюся хутка прыцягнуць нечым іх увагу. Ніколі не было, каб я на некага накрычала. Нас вучаць, што гэта недапушчальна, — тлумачыць Тар'я, настаўніца фінскай мовы ў саарэльскім ліцэі.

### Вучыся для сябе

У Фінляндыі экзамэны на атэстат сталасьці — самыя паважныя з усіх, якія здаюць вучні і студэнты. На іх здачу можа давацца да трох спроб на працягу году. Вынікі экзамэнаў, пералічаныя ў балы, даюць права прадоўжыць адукацыю ў любой установе па ўсёй краіне. Да вышэйшай ступені сярэдняй школы (працягласьць навучаньня тры гады) вучань допускаецца толькі на падставе адзнак, выстаўленых у атэстаце. Дадатковыя тэсты праводзяць толькі тыя навучальныя ўстановы, жаданьне вучыцца ў якіх выказваюць надта шмат вучняў.

— Сярэднія школы давяраюць нашым спосабам кантролю ведаў вучняў. Вызначаючы графік тэстаў на некалькі месяцаў наперад, мы ставім вучняў у празрыстую сытуацыю, прымушаючы тым самым да бесьперапыннага ўдасканальваньня ведаў. Такая сыстэма, — сьцьвярджае Лі-Лі Садэрхольм, дырэктарка адной з базавых школ, — абмяжоўвае непатрэбны стрэс і выхоўвае вельмі важнае пачуцьцё, што ўсё, што вучань робіць дзеля сваёй адукацыі, ён робіць выключна для сябе.

У такіх рэаліях папулярныя сямтам сьпісваньні ці шпаргалкі перастаюць існаваць.

— Сьпісваць нявыгадна, бо праз гэта можна ня толькі «заваліць» экзамэн, але і атрымаць сярод таварышаў рэпутацыю ашуканца і махляра, — гаворыць адзін з вучняў.

Задачы, якія ставяцца перад школьнікамі, заўсёды пабудаваны такім чынам, каб вучні пры іх рашэньні праяўлялі самастойнасьць мысьленьня і крэатыўнасьць.

Графік праверачных тэстаў не зьяўляецца канчатковым, яго можна карэктаваць.

### Усе роўныя

Важнай асаблівасьцю адукацыйнай палітыкі ў Фінляндыі зьяўляецца выраўноўваньне ўзроўню навучаньня паміж асобнымі школамі. Таму ў прыватных школах займаецца толькі адзін працэнт вучняў.

У Фінляндыі не засноўваюць прыватных школ і зь іншай прычыны. Такая ініцыятыва папросту не акупляецца. Тут ня трэба прыкладаць высілкі для таго, каб уладкаваць дзіця ў абсталяваную на прыстойным узроўні школу. Бясплатны доступ да ксэраксу ці Інтэрнэту, як і забясьпечаньня разнастайнай аўдыёвізуальнай тэхнікай кабінэты, — гэта стандарт. Усе курсы, што арганізуюцца як для вучняў, так і для настаўнікаў, бясплатныя. На заробкі пэдагогам таксама не выпадае наракаць, бо сярэдняя зарплата настаўніка чыстымі складае больш як 2700 даляраў.

Ня трэба турбавацца пра цэны на падручнікі, сшыткі ці канцылярскія прылады. Да дасягненьня 16 гадоў дзяржава забясьпечвае кожнага вучня ня толькі ўсім гэтым, але і штодзённым гарачым абедам.

### Абавязковыя дзевяць клясаў

На першы погляд, фінская сыстэма адукацыі нічым асаблівым не адрозьніваецца ад мадэлі, прынятай у большасьці эўрапейскіх краін. Навучаньне ахопліваe дзяцей, пачынаючы зь сёмага году жыцьця. Спачатку ідзе дзевяцігадовая базавая школа, у якой першыя шэсьць год вывучаюць матэматыку, фінскую і швэдзкую літаратуру, прыродазнаўства, мастацтва і замежныя мовы. Потым, на ўзроўні сёмае клясы, пачынаюцца факультатыўныя заняткі, на мэце якіх — спэцыялізаваць і паглыбіць веды вучня ў той сфэры, якая яго цікавіць.

На гэтым этапе адбываецца адыход ад апісальных спосабаў ацэнкі ведаў. Зьяўляюцца балы. Уводзіцца таксама сыстэма інтэнсіўных курсаў па выбраных дысцыплінах, якія працягваюцца ад 4 да 6 тыдняў і па заканчэньні якіх вучань атрымлівае сэртыфікат. Гэта могуць быць нават заняткі па фатаграфіі, мастацтве ці кампутарнай графіцы.

Далей ідуць тры гады вучобы ў вышэйшай ступені сярэдняй школы (якая адпавядае па нагрузцы нашай гімназіі ці ліцэю) ці прафэсійных каледжы. Пасьля іх заканчэньня можна ісьці ва ўнівэрсытэты. Дадатковым выбарам для тых, хто ня можа пахваліцца высокімі адзнакамі, зьяўляюцца вышэйшыя тэхнічныя школы (аналяг нашых політэхнічных інстытутаў). Чым гэта ўсё ня ўзор для беларускай школы?

**Паводле «Gazety Wyborczej»**

# Рост ці разьвіцьцё?

Працяг са старонкі 1.

## Структурныя зрухі ў гаспадарцы

Яскравай праявай пераходу да гэтай стадыі, паводле С.Кузьняца, зьяўляецца зьмяншэньне колькасьці працаўнікоў у сельскай гаспадарцы да 5%, у прамысловасьці і будаўніцтве — агулам да 30% і канцэнтрацыя астатніх 65% на вытворчасьці паслуг.

У Беларусі колькасьць працаўнікоў у сельскай гаспадарцы скарацілася з 19,1% у 1995 да 11,3% у 2003, але да вызначанага С.Кузьняцом парогу яшчэ далекавата. Доля працоўнай сілы ў прамысловасьці і будаўніцтве за гэты час скарацілася ўсяго на 1% і складае 34%. Такім чынам, на вытворчасьці паслуг у сёньняшняй гаспадарцы засяроджана значна меней працаўнікоў ад патрэбнага — каля 55%.

Вага вытворчасьці паслуг у ВУП за 2003 год у Беларусі была яшчэ меншай — 45,9% і за апошнія дзесяць гадоў прырасла на 3,7% (для параўнаньня, у Даніі яна цяпер складае 72,1%). Павелічэньне адбылося галоўным чынам за кошт скарачэньня ўдзельнай вагі сельскай гаспадаркі з 15,1% у 1995 г. да 7,7% у 2003 г., а таксама прамысловасьці — з 27,6% да 25,5% (**мал.1**). Будаўніцтва ж вырасла з 5,4% да 6%. Вага іншых галін (у замежнай статыстыцы іх называюць «іншыя паслугі») вырасла нязначна — з 22,4% да 25,6%. У Даніі на іншыя паслугі прыпадае 50,9% ВУП. Астача ў 5,7% лягла ў прырост чыстых падаткаў. Такім чынам, структура гаспадаркі сапраўды мяняецца ў бок паслуг, але калі тэмпы гэтых зьмяненьняў застануцца такімі ж марудны, то ўзору той жа Даніі эканоміка дасягне толькі праз 25 гадоў (**мал.1**).

Неразьвітасьць сфэры паслуг у народнай гаспадарцы пацьвярджаецца і статыстыкай замежнага гандлю. Іх доля ў агульным аб'ёме экспарту склала летась 14,8%, у той час як у сусьветным гандлі на паслугі прыпадае каля 30%. Прычым беларусы гандлююць ня самымі навукаёмістымі паслугамі. У сусьветным гандлі на першае месца выходзяць паслугі, што грунтуюцца на найноўшых сучасных тэхналёгіях, — гэта інфармацыйныя, фінансавыя, кансалтынгавыя паслугі. На гэтую групу прыпадае 47% сусьветнага гандлю паслугамі, у той час як у экспарце Беларусі яе доля складае 22% (**мал.2**).

Яшчэ адна група — турызм — ахоплівае трацiну сусьветнага гандлю паслугамі, але на паездкі ў Беларусь прыпадае ўсяго 17% экспарту паслуг. Больш за тое, сярод краін ЦУЭ Беларусь разам з Малдовай дзеліць апошняе месца па ўдзельнай вазе турыстычных паслуг ва ўтварэньні ВУП — 0,1% (для параўнаньня, у Чэхіі, Польшчы і Славакіі гэтыя паказьнікі складаюць адпаведна 6,6%, 5,0% і 2,4%). Затое вага ня самых навукаёмістых транспартных паслуг у сусьветным гандлі паступова скарацілася ўжо да 22%, але ў беларускім экспарце яна штогод расьце і складае цяпер 61%. Станоўчае сальда ў гандлі паслугамі за 2004 год (743,9 млн даляраў) на 91% было забясьпечана транспартнымі паслугамі.

Такім чынам, відаць, што эканамічны рост цягам апошніх дзесяці гадоў не прывёў да істотных структурных зрухаў у гаспадарцы, якія мусілі праглядацца ў значным павелічэньні сэктару паслуг. Аднак трэба адзначыць, што доўгатэрміновая тэндэнцыя на скарачэньне сельскай гаспадаркі і прамысловасьці і павелічэньне сфэры паслуг ёсьць. Хоць эканамічная палітыка ўвесь гэты час была скіравана на падтрымку вытворчасьці тавараў, а вытворчасьць паслуг дагэтуль застаецца без увагі.

**Мал.1. Структура народнай гаспадаркі, %**




**Мал.2. Структура экспарту паслуг за 2004 год, %**




## Вага вясковых жанчын

Сайман Кузьнец даводзіць, што паляпшэньне ўмоў жыцьця і працы, пасьля працяглага эканамічнага росту, прыводзіць да скарачэньня нараджальнасьці, якому папярэднічае эпоха кардынальных зьмен у геаграфіі расьсяленьня людзей — калі пераважная іх частка канцэнтруецца ў гарадах. Тое самае тычыцца і Беларусі.

Галоўным фактарам, які вызначае скарачэньне насельніцтва ў Беларусі з 1993 году, зьяўляецца не пагаршэньне ўзроўню жыцьця, а рэгіянальная структура пражываньня жанчын у дзетародным узросьце: чым буйнейшы населены пункт і большая гушчыня насельніцтва, тым меншая нараджальнасьць. Цягам апошніх сарака шасьці гадоў удзельная вага вясковых жанчын у агульнай колькасьці жанчын рэпрадукцыйнага ўзросту (15—49 гадоў) скарачалася тэмпамі 1% у год. Калі ў 1959 г. іх колькасьць была 65%, то ў 2003 г. — ужо 21,7%. Нягледзячы на тое што сёньня колькасьць дзетародных жанчын складае 2,67 млн (больш, чым у 1960—1970-х, і прыкладна столькі ж, колькі ў 1980-х гадах), у сельскай мясцовасьці са сваёй высокай нараджальнасьцю (у 1,4 разу вышэйшай, чым у горадзе) іх пражывае такі мінімум, які ня ў стане забясьпечыць агульнага прыросту насельніцтва.

Калі б удзельная вага сельскіх жанчын сёньня была роўная ўзроўню 1989 году, то тыя самыя жанчыны, якія пераехалі за гэты час у горад, нарадзілі б у 2003 годзе дадаткова 60 тысяч дзяцей. Пры гэтым індэкс нараджальнасьці склаў бы +0,5 замест сёньняшняга –5,0.

Агульны працэс урбанізацыі распачаўся ў Беларусі раней і быў выкліканы не эканамічнымі прычынамі, якія адзначыў Кузьнец у іншых краінах, а, хутчэй, гістарычнымі — ліквідацыяй у Беларусі 400 тыс. хутароў за два гады да і пасьля Другой сусьветнай вайны.

## Пасьля перамогі над сялянамі

Былыя савецкія рэспублікі, дзе бальшавікі перамаглі ў вайне зь сялянамі, сёньня маюць самыя вялікія адмоўныя індэксы нараджальнасьці (Украіна: –7,5, Расея: –6,2) у параўнаньні з тымі постсацыялістычнымі краінамі, дзе калектывізацыя мела непасьлядоўны характар (Польшча: –0,1, Славаччына: –0,1, Чэхія: –1,5). Немагчымасьць атрымліваць зь зямлі рэнту, якая б забясьпечвала прыстойнае жыцьцё, а ня беднасьць гэтага жыцьця, зьяўляецца галоўнай прычынай таго, чаму людзі імкнуцца пакінуць сельскую мясцовасьць.

У Чэхіі і сёньня няма вялікай розьніцы, дзе весьці жыцьцё — у горадзе або ў сельскай мясцовасьці. Таму насельніцтва Прагі за апошнія 10 гадоў скарацілася на 100 тыс. жыхароў. На поўначы Польшчы звычайна сем'і маюць чацьвёра і болей дзяцей, каб пасьпяхова весьці сялянскую гаспадарку. Эканамічны рост апошніх дзесяці гадоў у Беларусі быў дугасным фактарам і ня здолеў унесьці якіхсьці кардынальных зьмен у даўно складзены працэс міграцыі сельскіх жыхароў у горад.

## Эканамічны рост і міграцыя

Пры гэтым патрабуе тлумачэньня рэзкае зьніжэньне каэфіцыенту нараджальнасьці ў Беларусі ў апошнія 15 гадоў (у тым ліку і ў сельскай мясцовасьці — з 2,5 дзіцяці на адну жанчыну ў 1989 г. да 1,6 у 2002-м). Прычынамі гэтаму могуць быць зьніжэньне каэфіцыенту дзіцячай сьмяротнасьці або працэс рынкавай трансфармацыі, які прымусіў многіх людзей мяняць звыклы лад жыцьця ды працы і прыстасоўвацца да новых умоў.

Эканаміст Мітрафан Доўнар-Запольскі казаў, што, «працуючы над паляпшэньнем структуры гаспадаркі, насельніцтва ў той жа час можа затрымліваць тэмп нараджальнасьці ў мэтах падтрыманьня дабрабыту наяўных пакаленьняў».

Пойдзем на рызыку і паспрабуем прадказаць, што прыпыненьне пераходу да рынкавай эканомікі і стан няпэўнасьці — галоўная прычына сёньняшняга зьніжэньня нараджальнасьці, а яе стабілізацыя на ўзроўні, прынамсі, іншых краін ЦУЭ адбудзецца разам з усталяваньнем функцыянуючай рынкавай гаспадаркі. Людзі стануць ахвотней нараджаць дзяцей, каб весьці ўласны сямейны бізнэс. Пра тое, што скарачэньне нараджальнасьці ня выклікана пагаршэньнем ўзроўню жыцьця, сьведчыць такі прыклад. У 1990 г. у горадзе, дзе людзі маюць больш высокія даходы, на адну тысячу насельніцтва прыпадала ў 1,23 разу больш народжаных дзяцей, чым на 1 тысячу ў вёсцы, а сёньня — толькі ў 1,09 разу, хоць за гэты час колькасьць жанчын дзетароднага ўзросту ў вёсцы скарацілася на 5%.

## Эканамічны рост і размеркаваньне народнага прыбытку

С.Кузьнец вывеў заканамернасьць, якая ў сусьветнай эканамічнай навуцы атрымала назву «закону Кузьняца»: у першыя дзесяць гадоў інтэнсіўны эканамічны рост у краіне, што стала на шлях разьвіцьця, суправаджаецца рэзкім павелічэньнем няроўнасьці даходаў і багацьця, пасьля чаго пачынаецца працэс зьмяншэньня няроўнасьці. Асабліва гэта павінна быць характэрна для краін, якія ня маюць вялікага прытоку замежных інвэстыцый. Калі верыць «закону Кузьняца», у Беларусі апошнія дзесяць гадоў павінна была павялічвацца дыфэрэнцыяцыя даходаў насельніцтва. Аднак гэтага практычна не адбывалася. Нягледзячы на тое што Беларусь 10 гадоў таму мела самы нізкі ў сьвеце квінтыльны каэфіцыент (перавышэньне даходаў 20% самых багатых над даходамі 20% самых бедных жыхароў краіны), роўны тром (у 3 разы), ён павысіўся нязначна і па выніках 2002 году быў роўны чатыром. Для параўнаньня, у Польшчы, якая сярод пераходных краін увесь гэты час займала першае месца па прыцягненьні замежных інвэстыцый, квінтыльны каэфіцыент вырас з 4 да 6, а ў Малдове — з 6 да 10. Нагадаем, што квінтыльны каэфіцыент разьлічваецца на падставе апытаньняў хатніх гаспадарак і акрамя асноўных даходаў улічвае даходы, атрыманыя ў ценявым сэктары.

Такім чынам, адметнасьцю Беларусі застаецца вельмі роўнае пераразьмеркаваньне народнага прыбытку паміж насельніцтвам. Гэта добра з пункту гледжаньня каштоўнасьцяў сацыялізму, але дрэнна, калі ставіць на мэце пераход да разьвітай эканомікі, бо няма той сярэдняй клясы, якая б за кошт зробленых раней ашчаджэньняў спрыяла сваімі інвэстыцыямі далейшаму разьвіцьцю народнай гаспадаркі.

## Калі беларусы будуць жыць, як немцы

Відавочна, што пэўныя структурныя зрухі ў гаспадарцы, дэмаграфіі і даходах адбываюцца, але яны, хутчэй, выкліканы геапалітычнымі і геаэканамічнымі зьменамі, што адбыліся ў нашым геаграфічным рэгіёне ЦУЭ, чым зьяўляюцца вынікамі ўнутранага эканамічнага росту. Гэтыя структурныя зрухі носяць такі марудны характар, бо адбываюцца як бы насуперак устаноўкам эканамічнай палітыкі. Беларусь яшчэ ня выйшла на стадыю сучаснага эканамічнага росту і, калі нічога ня зьменіцца, у найбліжэйшай пэрспэктыве наўрад ці гэта зробіць.

# Дзяўчынкі і коткі гуляюцца па начы

Вольця жыве ў Менску. Ёй 19, яна зь перапэцканымі ў розныя колеры рукамі, шчакамі ды ідэямі. Кожны дзень малюе і штодня імкнецца ня памятаць пра тое, што «самавучак ніхто ня любіць».

На ейных карцінах — коткі і маладыя кабеты, дзяўчаты і хлопцы, дрэвы з райскімі яблыкамі, Менск-мэгаполіс, матылькі і людзі, якія наталяюць смагу жоўтай поўняй, сарванай зь неба.

Вольця малюе дзе хочаш і чым хочаш: «Хто пад руку патрапіў, таму не пашанцавала!». А трапляюць пад руку палатно, кардон, ДВП ды розныя фарбы — акрылавыя, пастэль, масьляныя крэйдачкі, туш… толькі не гуаш, бо гэта Вольця ня любіць, і лепш для гуашы не трапляцца на вочы. Свой стыль Вольця называе экспэрымэнтальным, з сучасных менскіх мастакоў паважае Руслана Вашкевіча, любімыя мастакі ўсіх часоў і народаў — Босх, Клімт, Гаген і Янсэн. Пра свой стыль жыцьця Вольця апавядае мне, шмат сьмеючыся і папіваючы чырвонае віно.



**Вольця:** Усё пачалося тады, калі я для кагосьці штосьці намалявала і ўжо не змагла спыніцца. Я хадзіла ў дзьве студыі — пры Ўнівэрсытэце культуры і пры ПК трактарнага заводу, але зьбегла. Гісторыя выйшла сьмешная: нас увесь час прымушалі маляваць адзін і той жа жудасны гаршчок, але я парвала малюнак, бо хацела маляваць самавар. Прыйшла і сказала, што хачу самавар замест гаршка, а мне кажуць, каб зноў бралася за гаршчок. І я сышла. Усё гэта жахліва: гаршчочкі розныя, кубікі-рубікі… ня ведаю, хто іх церпіць, але я ня дзеля гэтага… Тое, што я малюю, — мая ўласная знаходка.

(На адным зь яе малюнкаў у куточку — «накаляканае» простым алоўкам: «У мяне няма ні кропелькі жаданьня сачыць за правіламі прапазыцыі і правіламі пэрспэктывы!», другі падпісаны: «Wake up and draw!», на наступным чырвоныя літары: «Why do I love you so much?»).

**Тэда Лі: Думкі і пачуцьці лягчэй выказваць малюнкамі ці ўсё яшчэ словамі?**

**В:** Малюнкамі. Чым больш гэтым займаесься, тым горш. Іншы раз, калі ў гэтым стане праводзіш шмат часу, бывае цяжка два словы зьвязаць.

**ТЛ: Колькі выставаў табе ўдалося зрабіць?**

**В:** Пакуль толькі адну, у бібліятэцы на вуліцы Казінца. Была выстава сумесная зь менскімі фатографамі, выстаўляліся каляжы. Яна выйшла як першы блін сабаку. Прыйшлі свае людзі. Мы ня надта стараліся рэклямаваць падзею. Надрукавалі пару дзясяткаў афішак.

**ТЛ: Што трэба такому мастаку, як ты, каб зладзіць наступную выставу?**

**В:** Шмат працаваць і знаёміцца зь людзьмі. Бо ўсё ў нас на сувязях. Бяз сувязяў нікуды не правесься. Вось на Нямізе адчынілася новая галерэя, дзе нікога выстаўляць ня стануць, калі яго не прызналі за мяжой. А выстаўляюцца ў іх беларускія мастакі. Выходзіць, спачатку ты мусіш ехаць за мяжу, каб цябе палюбілі, а потым ужо зможаш паказвацца на Радзіме.

**ТЛ: Гэта не падштурхоўвае цябе ехаць за мяжу?**

**В:** За мяжой я б хацела найперш пападарожнічаць. Хоць у нейкі момант я ўсьвядоміла, што і прадаваць працы — таксама не галоўнае. Галоўнае, каб цябе паважалі як мастака. Дарослыя дзядзькі-мастакі ўспрымаюць мяне як маленькую дзяўчынку, а не як чалавека, які робіць сваю справу. Жанчына ў гэтай сфэры як быццам ня можа быць раўнапраўным чальцом грамадзтва. Мне не падабаецца відавочная дыскрымінацыя.

**ТЛ: Як зьбіраесься жыць у будучыні?**

**В:** Маю мару адчыніць мастацкую школу з псыхалягічным ухілам. З агульнай ідэяй: творчасьць разьвівае асобу. Я ўжо і трактат напісала, і кучу людзей зацікавіла, але пакуль задума адклалася.

**ТЛ: Такое нельга ажыцьцявіць у Беларусі?**

**В:** Праект мае быць сумесным. У сьвеце нямала людзей, каму ідэя здалася б цікавай. Мне бракуе пэдагагічных ведаў, але прыйдзецца набыць іх, калі я сур'ёзна захаплюся гэтай справай…

Да ейных прац людзі ставяцца вельмі неадназначна. Нехта адразу загарыцца ідэяй набыць адну з карцін і павесіць над канапай, іншыя раяць больш ніколі ня брацца за пэндзлі… Абыякавых няма, што дае падставы меркаваць, што дзяўчына дасягне посьпеху, нягледзячы на абставіны супраць яе. Куды б яна ні зьвярталася з працамі і прапановамі, паўсюль кажуць, што яна — «нідзе не пазначаны мастак». Гавораць: «Нас не хвалюе — можа ты і геній, але спачатку пакажы паперку, дзе гэта напісана».

Усё, што жыве з Вольцяй, робіцца падобнымі да яе. Размалёўваюцца старыя шафы, крэслы і дзьверы, малюнкі зьяўляюцца на яе вопратцы, а туалетная папера робіцца матэрыялам для шэдэўраў. Калі б у нас было прынята здымаць сюжэты для тэлебачаньня пра незвычайныя жытлы незвычайных суайчыньнікаў, як гэта часта бывае за мяжой, Вольця стала б гераіняй адной зь іх.

Другая (гэтым разам пэрсанальная) Вольціна выстава мае адбыцца на пачатку вясны ў Вільні. Сярод безьлічы карцін ёсьць малюнак з надпісам «NO PORNO». Спачатку яна так і плянавала назваць выставу, але вырашыла, што назва мусіць быць казачнай, як і большасьць ейных прац — дзявочых і пяшчотных, з анёламі і каляровымі коткамі.

Можа быць, у некага зьявіцца жаданьне «палюбіць мастака за мяжой», каб пасьля можна было бесьперашкодна любіць яго ў Беларусі…

**Тэда Лі**

# Эфэкт лямпачкі

Зрабіць наша жыцьцё сьвятлейшым нескладана — было б жаданьне.

Паўгоду таму я набыў кватэру на апошнім паверсе дзевяціпавярховікі ў адным з спальных раёнаў сталіцы. Калі ў першы раз зламаўся ліфт, высьветлілася, што на лесьвічных пляцоўках не гарыць ніводная лямпачка. Паразмаўляў з суседзямі і даведаўся, што лямпачкі крадуць і б'юць, таму ўкручваць новыя бессэнсоўна. Вырашыў праверыць. Набыў дзесяць лямпачак і асьвятліў лесьвічную клетку. Пры гэтым ва ўсіх патронах былі выяўленыя перагарэлыя лямпачкі. Думка пра скрадзеныя лямпачкі аказалася стэрэатыпам. Лямпачкі проста перагаралі, але ніхто з жыльцоў не праяўляў ініцыятывы замяніць. Кожны чакаў, што гэта зробіць нехта іншы.

Ліфт зноў не працуе. Два дні перад рэфэрэндумам. Падымаюся да сябе наверх. Сусед зьнізу заўважае, што мне пашчасьціла падымацца па асьветленай лесьвіцы, бо ЖЭС перад рэфэрэндумам па ўсім пад'езьдзе ўкруціў лямпачкі. Не хачу расчароўваць чалавека і пагаджаюся.

Праз тры тыдні адзначаны першы факт крадзяжу. Замест лямпачак магутнасьцю 60 Вт укручваю лямпачкі магутнасьцю 150 Вт. Крадзяжы не паўтараюцца. Трохі неэканамічна, але сьветла, як у сонечны дзень. Пераходны пэрыяд патрабуе дадатковых высілкаў і выдаткаў.

Настае першая круглая дата — тры месяцы поўнага бесьперапыннага асьвятленьня лесьвічнай клеткі. Вырашаю адсьвяткаваць падзею. Набываю яшчэ 10 лямпачак і асьвятляю на ўсіх паверхах пляцоўкі каля ліфтоў. Пры гэтым увесь час наўмысна пакідаю на першым паверсе дзьве «кантрольныя» перагарэлыя лямпачкі.

І вось нарэшце эфэкт спрацоўвае. Увечары, вяртаючыся дадому, бачу, што нехта запаліў дзьве кантрольныя лямпачкі. Відаць, гэты нехта зразумеў, што ЖЭС ні пры чым, і вырашыў падтрымаць гульню ў добрыя справы. Бо ад добрай справы чалавек атрымлівае ня меншую асалоду, чым ад спажываньня якіх-небудзь даброт.

Прайшло паўгоду. У пад'езьдзе наладзілася сапраўдная канкурэнцыя. Лямпачкі перагараюць досыць рэдка, а зрабіць добрую справу хочацца шмат каму. Аднойчы вяртаюся дадому і бачу, што перагарэла лямпачка. Падымаюся да сябе на апошні паверх, бяру новую лямпачку, спускаюся ўніз, але не пасьпяваю… — ужо гарыць. На чарзе «эфэкт карціны», бо ў асьветленым пад'езьдзе добра выглядаюць карціны на сьценах.

**Уладзь Каліна, Менск**

# Трыюмвіры,

У артыкуле Алеся Аркуша «Рызыкоўная барацьба намэнклятуры» (НН, №7 за 18 лютага) зноў актуалізуецца пытаньне: ці існаваў «Саюз вызваленьня Беларусі» ў рэальнасьці? І ці маглі нацыянал-дэмакраты ўзяць уладу ў свае рукі на мяжы 1920-х і 1930-х? З Алесем Аркушам палемізуе **Анатоль Сідарэвіч**.

Перш чым паспрабаваць выказацца на гэтую тэму, адзначу недакладнасьці. Аўтар піша, што ў 1930 г. «межы закрыліся». Нават вельмі яшчэ не закрыліся. Пра гэта мы можам прачытаць, напрыклад, ва ўспамінах Мікалая Ўлашчыка (гл.: Улашчык М. Выбранае. Менск: Беларускі кнігазбор, 2001. С.365—366). У 1930—1931 г. нямала сялян уцяклі цераз гэтую мяжу ад высылкі на Поўнач. «На замок» мяжу ўзялі к 1933 г. Гэтаму паслужыла ня толькі ўзмацненьне яе аховы і «тэхнічныя мерапрыемствы», але і ўвядзеньне ў 1932 г. пашпартнай сыстэмы ў памежнай зоне. А таксама арышты мужчын у памежных вёсках (да 80 адсоткаў). Другая заўвага: такая арганізацыя, як БПС-Р «Маладая Беларусь», не існавала.

## А лідэр хто?

Аўтар спрабуе пабудаваць гіпотэзу, што «нейкая заканспіраваная арганізацыя, без фармальнага сяброўства для неўтаямнічаных сымпатыкаў, усё ж існавала», і стараецца знайсьці сярод дзяржаўных дзеячаў БССР магчымага правадыра «СВБ». Аднак неабходных падстаў, патрэбных для гіпотэзы, А.Аркуш не прад'яўляе. Таму пагодзімся, што мы маем справу адно толькі з праблемаю.

Апавядаючы нам пра Алеся Адамовіча, Антона Баліцкага ды Ўсевалада Ігнатоўскага, мімаходзь закрануўшы Аляксандра Чаравякова, А.Аркуш так і не паказаў нам, ці праводзілі гэтыя дзеячы нейкія нарады, ці хадзілі яны ў адну лазьню, ці ладзілі застольлі «для сваіх». «На агеньчык да Баліцкага» заходзілі адны людзі, а да Купалы завітвалі і тыя, хто хадзіў да Баліцкага (напрыклад, наркамзем Зьміцер Прышчэпаў). А да каго хадзілі Вацлаў Ластоўскі ды Аляксандар Цьвікевіч?

Тут паўстае і такое пытаньне: лідэр пэўнага гуртка (а мы бачым толькі гурткі) быў лідэрам ex officio ці з прычыны сваіх маральна-інтэлектуальных якасьцяў? У выпадку Купалы ў нас няма ніякіх сумненьняў: «старога» паважалі за тое, што ён Паэта. Аднак ён ня быў палітыкам. І хоць сустрэчы за ягоным сталом пазьней кваліфікавалі як нелегальныя сходы, гурткі там вяліся адкрытыя. Пра тую ж мангалаізацыю Беларусі. А вось Баліцкі? Ці разглядалі наркама асьветы як лідэра? Сьцяпан Некрашэвіч, Зьміцер Жылуновіч, Міхась Кудзелька маглі заходзіць да яго і таму, што ў ягоным ведамстве знаходзіліся і выдавецтвы, і галоўліт, і галоўмастацтва, і музэі, і Інбелкульт (потым Акадэмія). Чаму ж было не зайсьці, каб вырашыць пэўныя пытаньні ў нефармальнай размове? Ці заходзілі ўсе названыя дзеячы да Баліцкага пасьля таго, як ён перастаў быць наркамам? Калі так, то ГПУ павінна было б арыштаваць яго адным зь першых.

## Пасіўны Ластоўскі

У пераліку магчымых, з гледзішча ГПУ, лідэраў «СВБ» (Ластоўскі—Цьвікевіч—Смоліч) А.Аркуш прапусьціў Некрашэвіча. Паводле афіцыйнай вэрсіі, гэта ён быў кіраўніком да прыезду Ластоўскага. З Ластоўскім, праўда, ГПУ памылілася. Ідэалягічна няўстойлівы (пабыў і пэпэсаўцам, і грамадаўцам, і кансэрватарам, і эсэрам), пан Вацлаў, як паказваў Аркадзь Смоліч, «трымаўся надзвычай пасіўна». Не падыходзіў ён на ролю правадыра і таму, што зусім неймавернымі былі б зьвязкі «Ластоўскі—Купала», «Ластоўскі—Смоліч». Як і зьвязка «Ігнатоўскі—Цьвікевіч». «Карыфэй» Смоліч паводле сваіх інтэлектуальных якасьцяў мог бы падысьці на ролю лідэра, але… Паказальна, што яму, які шмат зрабіў для станаўленьня Інбелкульту і складу характарыстыкі на кандыдатаў у акадэмікі, самому не надалі званьня акадэміка. Ці Ігнатоўскі так адпомсьціў яму за сяброўства зь Цьвікевічам?

Наступным кандыдатам на лідэра быў Ігнатоўскі, ды ён пакінуў гэты сьвет. І вось ГПУ спыняецца на постаці Аляксандра Цьвікевіча. Менавіта яму яно дае партфэль прэм'ер-міністра ва ўрадзе, які «СВБ» нібыта мерыўся стварыць разам зь «Беларускім філіялам прампартыі», «Беларускім філіялам Працоўнай сялянскай партыі» і «Беларускім філіялам меншавікоў» (падрабязна пра гэта я пісаў у «НН» за 7 студзеня сёлета).

Зь дзеячаў БССР толькі аднаго Ігнатоўскага ГПУ бачыць на чале «СВБ». І затое — чатырох дзеячаў БНР (Некрашэвіча, Ластоўскага, Смоліча, Цьвікевіча), дарма што А.Адамовіч лічыў іх ненадзейнымі палітыкамі. Пра Баліцкага як лідэра «СВБ» я не чытаў, хоць яго, як піша А.Аркуш, «пачалі шукаць».

## Асаблівасьці нацыянальнага характару

Тое, што на чале «СВБ» «ставілі» менавіта дзеячаў БНР, тлумачыцца проста: «СВБ» разглядаўся як апошняе зьвяно ў ланцужку «сусьветны імпэрыялізм — польскі фашызм — беларускі нацыянал-фашызм (у Заходняй Беларусі) — нацдэмы (БССР)». Хто зь дзеячаў БССР кантактаваў з «імпэрыялістамі» і «фашыстамі»? Іншая справа Некрашэвіч, Ластоўскі, Смоліч, Цьвікевіч. Іншая справа Ігнатоўскі: і за мяжою трохі пабываў, і з многімі «нацыянал-фашыстамі» знаёмы, і, ведучы эсэраўскую працу паміж рэвалюцыямі, быў вядомы расейскім ды беларускім эсэрам, якія эмігравалі, «пайшлі на службу да імпэрыялістаў». Такога паслужнога сьпісу ня мелі ні Баліцкі, ні Прышчэпаў, ні Адамовіч. Дарма што адзін зь іх быў барацьбістам, другі эсэрам, а трэці пабываў у БСГ.

Такім чынам, А.Аркуш не прад'явіў нам неабходных фактаў для будаваньня гіпотэзы пра існаваньне нейкае заканспіраванае арганізацыі. Арганізацыя бязь лідэра ці калектыўнага кіраўніцтва існаваць ня можа. Усе разгледжаныя аўтарам пэрсаналіі не надаваліся на такую ролю. Да таго ж і этнапсыхалёгія такая, што беларусы 1) кепска самаарганізуюцца і 2) схільныя да канфліктаў па непрынцыповых пытаньнях. Узор такога канфлікту даў Ластоўскі. Калі 18 лютага 1918 г. Беларуская Рада ў Вільні прымала прапанаваную А.Луцкевічам рэзалюцыю аб разрыве дзяржаўных адносінаў з Расеяй, Ластоўскі «прычапіўся» да аднаго слова і толькі дзеля гэтага слова адзін з усяе Рады прагаласаваў супроць рэзалюцыі. Вядома, прычынаю такіх палітычных паводзінаў было ня слова, а тое, што праект рэзалюцыі склаў Луцкевіч. І тут мы маем справу з такою рысаю беларусаў, як уменьне ставіць *argumentum ad hominem* па-над усімі аргумэнтамі. Схільнасьць да канфліктаў па непрынцыповых пытаньнях і да прыярытэтнага карыстаньня *argumentum ad hominem* уласьцівая як панам (успомнім эпоху Рэчы Паспалітае), так і мужыкам. І сам А.Аркуш вымушаны мімаходзь згадаць «праявы ўнутранай барацьбы» сярод «нацдэмаў».

## Хвалю зьбілі загадзя

Давайце прымем рабочую вэрсію, што і Баліцкі, і Прышчэпаў, і Адамовіч былі лідэрамі ex officio. Рыхтуючы «рэвалюцыю зверху», у т.л. калектывізацыю, Сталін нэўтралізаваў сваіх галоўных праціўнікаў у Маскве. Мы ведаем, што ў красавіку 1929 г. ЦК ВКП(б) змусіў Мікалая Бухарына адмовіцца ад абвінавачаньня Сталіна і яго аднадумцаў у ваенна-фэадальнай эксплюатацыі вёскі. 20 жніўня Бухарына вывелі з выканкаму Камінтэрну. А цяпер працытуем хроніку, якую вёў Луцкевіч: «Прэзыдыюм Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР (ясна: па трэбаваньні Масквы…) звальняе: 31 жніўня 1929 г. — Антона Баліцкага з становішча *Народнага камісара асьветы* БССР; (...); 14 верасьня — Зьмітру Прышчэпава, былага

ПОШТА РЭДАКЦЫІ

## Лісты Васілю Лявонаву

Ва ўсім можна пагадзіцца з панам Лявонавым у артыкуле «Пад прыгнётам мужнее нацыя», апроч некаторых дэталяў. Я пэсымістычна стаўлюся да выказваньня, што тры мільёны грамадзян дабрахоць прачытаюць праект новай Канстытуцыі, пагатоў яшчэ й годна ацэняць яго. Абыякавай большасьці важна, хто трымае асноўны закон у руках, і тое, ці дбае ён пра народны дабрабыт. Грамадзка актыўных людзей няшмат, але іх ініцыятыва вартая ўвагі дзеля магчымай рэалізацыі ў кіраваньні краінай. І новая Канстытуцыя павінна гэта ўлічваць.

Новая Беларусь пачнецца ня з новай Канстытуцыі, а на папярэднім прыняцьцю Асноўнага закону этапе. Але каб прайсьці гэты этап ды зрабіць нешта прынцыпова новае, аднаго месяца, як прапануе пан Лявонаў, будзе замала.

Зьмены ў законы нельга рабіць на падставе ўсеагульнага апытаньня (рэфэрэндуму) — разуменьне дзеяньня законаў ды наступстваў патрабуе неабыякіх ведаў і аналітычнага мысьленьня. Рэфэрэндум пагэтаму мае праводзіцца толькі ў выпадках, лёсавызначальных для народу. Такім выпадкам зьяўляецца выбар канцэпцыі разьвіцьця, які павінен фармулявацца проста і зразумела. Што ж тады з законамі? Кожны з нас мае права рабіць прапановы і атрымліваць абгрунтаваныя адказы на іх. Кожны з нас мае права на рэалізацыю сваіх прапаноў. Адзіным грунтам, на падставе якога робяцца ацэнкі, ёсьць разьвіцьцё беларускага этнасу па сваіх форме і зьмесьце. Вось той канцэптуальны выбар, які варта зрабіць на рэфэрэндуме. Менавіта ён вызначае сэнс і цноту існаваньня нашай дзяржавы.

**Ігар Хаменка, Менск**

* * *

Я вырашыў падыскутаваць зь вельмі шаноўным сп.Васілём Лявонавым. Добра, што паважанага сп.Лявонава хвалюе праблема дзяржаўнага будаўніцтва пасьля сыходу Лукашэнкі. Але дзіўная размова — ставіць воз наперадзе каня. Ён гаворыць, што трэба прапанаваць грамадзянам новую рэдакцыю Канстытуцыі, якая павінна ясна вызначаць правы, абавязкі грамадзян па кіраваньні дзяржавай, устанаўліваць рэальную адказнасьць улады перад грамадзянамі.

Ці могуць быць у сёньняшняй Беларусі свабодныя, сумленныя выбары? Пры гэтым выбарчым законе, асабліва пры цяперашнім парадку фармаваньня камісій усіх узроўняў — ніколі. Але ж рэжым Лукашэнкі ня вечны, — гэта знае кожны думаючы грамадзянін Рэспублікі. Рэжым можа лопнуць як мыльная бурбалка. Сёньня галоўнае пытаньне — як законным шляхам адхіліць ад улады чалавека, які насуперак усякаму здароваму сэнсу шукае магчымасьці застацца пажыцьцёвым прэзыдэнтам.

На маю думку, бліжэйшыя 40 гадоў краіна Беларусь павінна быць толькі парлямэнцкая.

Другое пытаньне — адносіны з нашымі суседзямі. Тут наогул пытаньня няма. Дачыненьні маюць быць самыя добрыя, адкрытая мяжа з Эўропай, акрамя мафіёзнай Расеі. Захаваньне бясьпекі ў нашай частцы сьвету. Беларусь уваходзіць у склад NATO.

**Анастас Семяновіч, Бараўляны**

## Конкурс

Беларускі камітэт каледжаў міжнароднай супольнасьці абвяшчае конкурс на атрыманьне дзьвюх стыпэндый у міжнародных каледжах Нарвэгіі і Італіі.

У каледжах выкарыстоўваецца сыстэма міжнароднай перадунівэрсытэцкай адукацыі IB. Навучаньне вядзецца па-ангельску.

Мэта такіх каледжаў — усталяваньне ідэалаў міру, талерантнасьці і супрацоўніцтва паміж моладзьдзю розных краін праз адукацыю. Студэнт павінен як найбольш расказаць пра сваю краіну сябрам па вучобе з 150 іншых краін. Апроч выдатных акадэмічных ведаў, кандыдаты мусяць выдатна гаварыць па-беларуску, ведаць гісторыю і культуру Беларусі.

На першы тур конкурсу трэба даслаць **да 4 красавіка** заяву з сваім адрасам і нумарам школы, даведку аб стане здароўя, ліст пасьпяховасьці за мінулы і гэты навучальныя гады, характарыстыку, зьвесткі аб удзеле ў вучнёўскіх алімпіядах, самадзейнасьці, спартовых сэкцыях, копіі грамат, дыплёмаў, твор на тэму «Ліст зь Беларусі» (да чатырох старонак вучнёўскага сшытку) па-беларуску ці па-ангельску. Пераможцы будуць выкліканы на другі тур, які адбудзецца 15 красавіка.

Дакумэнты дасылаць на адрас: РГА «Таварыства беларускай мовы імя Ф.Скарыны», вул.Румянцава, 13, 220050, Менск (з пазнакай «На конкурс UWC»).

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні.
З прычыны вялікага аб'ёму пошты, мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы.
Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы.
Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.
Наш адрас: а/с 537, 220050, Менск. E-mail:nn@promedia.by. Факс: (017) 284-73-29.

# або Помнік камісарам

Народнага камісара земляробства БССР, з становішча *намесьніка старшыні Дзяржаўнае плянавае камісіі і члена Эканамічнае нарады БССР;* 17 верасьня — Зьмітру Жылуновіча, былага галаву першага ўраду Радавае Беларусі, з становішча *намесьніка Народнага камісара асьветы БССР;* А. Адамовіча — з стан. *намесьніка Народнага камісара земляробства;* Міхася Кудзельку (паэта, ведамага пад прозьвішчам Міхась Чарот, старшыню «Маладняку») — з становішча *адказнага рэдактара «Савецкае Беларусі»;* 10 кастрычніка — Ігната Масальскага з станов. *Народнага камісара сацыяльнага забесьпячэньня БССР.* А 16 кастрычніка Савет Народных Камісараў звальняе В.Ластоўскага з становішча *неадменнага сакратара Беларускае Акадэміі Навук* і Сьцяпана Некрашэвіча — з станов. *віцэ-прэзыдэнта Акадэміі.* І гэтак далей. А адначасна адбываецца выкіданьне з кампартыі найбольш актыўных камуністаўбеларусаў…» (Наперад! 1929. 12 сьнежня).

17 лістапада 1929 г. ЦК ВКП(б) выводзіць з Палітбюро Бухарына і папярэджвае Старшыню СНК СССР Аляксея Рыкава ды лідэра прафсаюзаў Міхаіла Томскага, а 19 сьнежня Бюро ЦК і Прэзыдыюм ЦКК КП(б)Б прымаюць рэзалюцыю «Аб пазыцыі тав.Чарвякова па пытаньнях барацьбы з правым ухілам і нацыянал-дэмакратызмам». 27 сьнежня «Зьвязда» друкуе ліст А.Чарвякова, які прызнае свае «памылкі». А раней — 20 сьнежня — у той самай газэце зьявіўся ліст З.Жылуновіча «Мае памылкі і іх карэньні».

Чакаць нейкага арганізаванага выступу «на хвалі незадаволенасьці калектывізацыяй», нават калі б «правыя» камуністы асьмеліліся на тое, не даводзілася. Хвалю зьбілі да таго, як яна магла ўзьнікнуць. Сталін прадбачліва нанёс прэвэнтыўны ўдар і, паўтаруся, нэўтралізаваў сваіх галоўных апанэнтаў у Маскве, а потым і ў Менску.

Нешта падобнае адбылося і ва Ўкраіне. На пачатку 1930 г. уся Беларусь лавіла весткі з працэсу «Спілки визволення України». Разумныя людзі казалі: і ў нас будзе такое.

## А ўзброеныя сілы?

Стары Энгельс вучыў, што да новага ладу лепш пераходзіць мірна, у рамках закону, што посьпех збройнага чыну — рэдкасьць, што для такога посьпеху патрэбна, каб войска (ці вельмі значная частка яго) перайшло на бок паўстанцаў.

Такім чынам, калі б Баліцкі, Прышчэпаў, Масальскі (вось дзе калярытная фігура!) ды іншыя захавалі свае пасады на момант пачатку калектывізацыі і надумаліся (што малаімаверна) узначаліць супраціў, на каго яны маглі б абаперціся? І А.Аркуш гэта разумее, калі піша, што ўрад БССР не кіраваў сілавымі структурамі. Ён мяркуе: «Каб яшчэ пару гадоў… Мо тады між Балтыйскім і Чорным морамі знайшліся б свае Манэргеймы…»

На жаль, А.Аркуш не разьвіў гэтае тэмы, бо яму замінае абсалютная нераспрацаванасьць сюжэту «кіраўнікі БССР і войска». А тым часам водгукі нездаволенасьці ў Чырвонай Арміі (яна складалася пераважна зь сялянскіх сыноў) да нас даходзяць. Вось вынятка зь нейкае газэты за 1931 г., што захоўваецца ў паперах Клаўдзія Дуж-Душэўскага (БДАМЛМ, ф.3, воп.1, адз. захав. 241):

«**Выкрыта вайсковая змова ў Беларусі**

Вільня, 31.3. (Радыё-Тэлефункен). У ноч на сёньня агенты менскага ГПУ правялі шматлікія арышты сярод вышэйшага камсаставу і беларускай інтэлігенцыі. Паводле паведамленьня з польскіх крыніц, зьвесткі пра вайсковую змову ў беларускай савецкай арміі (тэрытарыяльных злучэньнях? **— А.С.**) даўно ўжо цыркулявалі ў колах, блізкіх да менскага ГПУ. У выніку было наладжана высочваньне беларускіх нацыянальных дзеячаў, у прыватнасьці і сярод чырвоных афіцэраў беларускай нацыянальнасьці. Ці існавала вайсковая змова сапраўды або ў наяўнасьці новая чарговая правакацыя ГПУ, але пакуль што лічыцца арыштаваных — 17 чырвоных камандзіраў і 60 прыватных асобаў, галоўным чынам грамадзкіх дзеячаў».

Такім чынам, арыштоўвалі ня толькі «грамадзкіх дзеячаў» (гэта фігуранты справы «СВБ»), але і беларусаў-камандзіраў (слова «афіцэр» тады не шанавалася). Дзе яны служылі? У 2-й беларускай стралковай дывізіі, дзе беларусаў было больш за 60 адсоткаў, у Аб'яднанай беларускай вайсковай школе імя ЦВК БССР, у якой 83 адсоткі курсантаў былі зь Беларусі, ці ў іншых тэрытарыяльных злучэньнях і ўстановах? І што мы ведаем пра настроі ў асяродзьдзі вайскоўцаў? Вядома, усе дакумэнты знаходзяцца ў архіве расейскага міністэрства абароны. Але што-колечы маецца, мусіць, і ў нашых архівах. Сёе-тое прарывалася і ў друк. Вось і гэтае паведамленне пацьвярджае правіла, што дыму без агню не бывае, бо газэта, вынятка зь якое цытавалася, 17 лютага са спасылкаю на тое ж «Радыё-Тэлефункен» паведамляла, што Ігнатоўскі і Купала спрабавалі скончыць жыцьцё самагубствам і што Ігнатоўскі застрэліўся, а Купала цяжка паранены ў лёгкае.

Ды гэты сюжэт я закранаю мімаходзь, у парадку пастаноўкі праблемы.

## Пра знаёмствы

ГПУ зьдзейсьніла больш чым злачынства — яно зрабіла памылку. На самым пачатку трэба было арыштоўваць не Ільлючонка, які нападпітку хадзіў на партсход бараніць Жылуновіча, ня Смоліча, а — Ігнатоўскага.

Ігнатоўскі зьявіўся ў беларускім руху ў нашаніўскую пару. Ці ня першае яго публічнае выступленьне датуецца 12 траўня 1915 г. Тады ён, як паведамляла «Наша Ніва» 22 траўня 1915 г., быў маршалкам устаноўчага сходу Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны. У працы гэтага сходу бралі ўдзел браты Луцкевічы, Вацлаў Іваноўскі, Вацлаў Ластоўскі, Ігнат Буйніцкі, Эдвард Будзька ды іншыя беларускія дзеячы. Мабыць, усе яны ведалі Ігнатоўскага, а Ігнатоўскі — іх.

Першая сустрэча Ігнатоўскага з Антонам Луцкевічам, напрыклад, магла адбыцца ў 1910 г. у Дорпаце (Тарту), бо ў гэтым годзе першы пайшоў на апошні курс унівэрсытэту, а другі пасьля прыродазнаўства ў Пецярбургу пачаў вывучаць права ў Дорпаце. Да таго ж там вучыўся на лекара і трэці з братоў Луцкевічаў — Сьцяпан, які ў 1930 г. будзе ратаваць Купалу. А што яны сустракаліся ў Вільні, дзе Ігнатоўскі настаўнічаў да пераезду ў Менск, гэта вядома. (У 1913 г. адбылося знаёмства Смоліча з Ігнатоўскім.)

У канцы 1918 г., калі адбылася эвакуацыя Ўраду БНР, некаторыя яго сябры засталіся ў Менску. Іх задачаю было працягваць культурніцкую дзейнасьць. Перад ад'ездам А.Луцкевіч меў гутарку з Ігнатоўскім, бо ўсе былі ўпэўненыя, што «яго супрацоўніцтва з савецкаю ўладаю цалкам забясьпечана». Гутарыў Луцкевіч зь ім «як са старым знаёмцам». Гаворка ішла пра беларусізацыю школ, у прыватнасьці. Яны, Луцкевіч і Ігнатоўскі, «расстались дружески». Луцкевіч пакідаў Менск з упэўненасьцю, что «сотрудничество этого крупного деятеля» Савецкае Беларусі гарантаванае.

Гэта былі цытаты з уласнаручных паказаньняў А.Луцкевіча (1939 г.).

Не магу цяпер прыгадаць дзе, але я чытаў, што ў сакавіку 1919 г., завітаўшы з Горадні ў Вільню, дзе ў той час знаходзіўся ўрад Літбелу, Луцкевіч сустрэўся з намесьнікам наркама асьветы Чарвяковым. Пэўна, між імі ўсталяваліся добрыя адносіны, бо Чарвякоў зьвяртаўся да Луцкевіча на «ты» (я маю на ўвазе знакаміты ліст Чарвякова да Луцкевіча, які перахапіла польская вайсковая контрразьведка і які ўжо даўно цытавала Аляксандра Бэргман).

Зрэшты, дапускаю, што яны былі знаёмыя яшчэ ў нашаніўскі пэрыяд. На такую думку наводзіць і тое, што Чарвякоў вучыўся ў Віленскім настаўніцкім інстытуце, і тое, што, камэнтуючы ў дзёньніку ўтварэньне 1 студзеня 1919 г. БССР, Луцкевіч заўважыў у яе ўрадзе «Жылуновіча, Дылу, Фальскага, Чарвякова і іншых праўдзівых беларусаў». Мусіць жа, ведаў, пра каго і што пісаў.

**(Заканчэньне будзе.)**

# Роза Люксэмбург і беларускае пытаньне

На допіс гэты падварухнуў мяне Валодзя Конан сваім лістом-запрашэньнем да абмеркаваньня гісторыі і традыцый Беларускай сацыялістычнай грамады. Сустрэча зацікаўленых адмыслоўцаў мелася адбыцца, можа, і адбылася, у Менску на зыходзе лютага. Ня выпала, на жаль, скарыстаць з ласкавае прапановы даўняга сябры-пабраціма, хаця ў сваіх дасьледніцкіх засеках і адшукаў, здаецца, незацяганы матэрыял — здатны, мяркую, паглыбіць уяўленьні пра нашых пачынальнікаў-сацыялістаў, «грамадоўцаў», дакладней — пра міжнародны рэзананс іхняе дзейнасьці. Гаворка пра стаўленьне выбітнае дзяячкі польскага і нямецкага сацыял-дэмакратычнага руху да беларускага пытаньня. Скажам адразу: праблему гэтую яна заўважыла і на свой лад пракамэнтавала ў артыкуле «Нацыянальнае пытаньне і аўтаномія», надрукаваным у «Сацыял-дэмакратычным аглядзе» («Przegląd Socjaldemokratyczny». 1908. №6). З чвэрць веку таму падчас працы ў Варшаве скапіяваў я ў архіве некалькі старонак з гэтага рэдкага выданьня. Вось фрагмэнт з тае публікацыі ў маім перакладзе з польскае мовы:

«Найбольш шматлікую супольнасьць на тэрыторыі «Заходняга краю» прадстаўляюць беларусы, на долю якіх прыпадае ў Віленскай губэрні 61%, у Гарадзенскай 44% ад агульнага насельніцтва. Калі ж вычляняць беларускую нацыянальнасьць, то неабходна да чатырох згаданых літоўскіх губэрняў (Ковенскай, Віленскай, Гарадзенскай, Сувальскай. **— А.К.**) дадаць яшчэ губэрні Менскую, Магілёўскую, Віцебскую, а таксама Смаленскую — інакш кажучы, былыя ваяводзтвы Полацкае, Менскае, Віцебскае, Мсьціслаўскае і Смаленскае — колішнюю ўласна Белую Русь. Разам яны склалі б больш-менш поўны абшар гістарычнае Літвы, альбо пэўную тэрыторыю, адасобленую, прынамсі, гістарычнай традыцыяй і пэўнай грамадзка-эканамічнай супольнасьцю. Відавочна, гэтую тэрыторыю мае на ўвазе Беларуская грамада, дамагаючыся нацыянальнае аўтаноміі для «Заходняга краю» (або рэспублікі ў фэдэрацыі з Расеяй), уключна з тэрытарыяльна аўтаномным соймам у Вільні… Разам зь літоўцамі насельніцтва згаданых чатырох губэрняў складае ўнушальную лічбу 12 171 007 чалавек. Аднак з гэтае агульнае колькасьці на долю беларусаў прыпадае меней за палову — каля 5 і трох чвэрцяў мільёна (5 885 547). Нават зыходзячы з колькасных меркаваньняў, звужэньне аўтаноміі Літвы да беларускае нацыянальнасьці падаецца праектам вельмі праблематычным. Тым болей складанасьць пытаньня ўзрастае, беручы пад увагу эканамічна-грамадзкія варункі адпаведных нацыянальнасьцяў (апроч беларусаў у артыкуле разглядаюцца літоўская, габрэйская, польская супольнасьці краю. **— А.К.**). Беларусы на тэрыторыі свайго пражываньня прадстаўляюць насельніцтва выключна вясковае, сельскагаспадарчае. Да таго ж іх культурны ўзровень абумоўлены эканамічнымі абставінамі, вельмі нізкі. Непісьменнасьць настолькі пашырана, што Беларуская грамада вымушана была найперш пачаць ад заснаваньня «Асьветніцкага таварыства» дзеля пашырэньня элемэнтарнае асьветы сярод беларускіх сялян. Поўная адсутнасьць уласна беларускай буржуазіі, гарадзкой інтэлігенцыі ды самастойнага навукова-літаратурнага жыцьця на беларускай мове робяць ідэю нацыянальнай беларускай аўтаноміі проста невыканальнай».

Ня манімся палемізаваць зь небясспрэчнымі меркаваньнямі вядомай марксісткі — «арла рэвалюцыі» — скарэктаванымі, урэшце, далейшай хадой гісторыі і вызвольнай практыкай Беларускага Адраджэньня. Аднак варта адзначыць: на тагачасным марксісцкім абсягу (бальшавіцкага не чапаем) голас палымянае Розы быў ці ня першай праявай увагі да вызвольных парываньняў Беларускае грамады. Хаця яе дзеятворчы патэнцыял аўтарка яўна недаацаніла. Невыпадкова, Адольф Варскі, яе калега-пабрацім па рэвалюцыйным змаганьні, пазьней рэалістычна асэнсуе нігілізм свае таварышкі ў нацыянальным пытаньні, беларускім у прыватнасьці: «Гэта пэрспэктыва безнадзейнасьці, а не рэвалюцыі ў Літве і Беларусі» (A.Warski. Wybór pism. T.II. — Warszawa, 1958. S.499). Тым ня менш, з аднае гэтае акалічнасьці — засьведчанага нераўнадушша да Беларусі — можна пагадзіцца з прысутнасьцю на тапанімічнай мапе стольнага Менску імя Розы Люксэмбург, не раўнуючы прозьвішчам некаторых рэвалюцыяністаў «западнорусской» гадоўлі, для якіх беларуская нацыя наагул не існавала. Хоць згаданая акалічнасьць пакуль не адзначана ні ў гістарычных манаграфіях, ні ў энцыкляпэдычных даведніках. Цяпер гэты недагляд можна лічыць праз «Нашу Ніву» разьвязаным.

**Аляксей Каўка,**
**Масква**

# Законапраект адкліканы — рэформа вышэйшай адукацыі працягваецца

Доля платнікаў вырасла да 52%, бясплатныя паслугі ператвараюцца ў платныя, павышаюцца цэны на навучаньне. Адбываецца імклівая камэрцыялізацыя адукацыі. Такі кірунак рэформы задавальняе кіраўніцтва краіны, а з другога боку — адміністрацыі ВНУ, якія атрымліваюць права зарабляць. Аднак ён супярэчыць інтарэсам студэнтаў і доўгатэрміновым нацыянальным інтарэсам. Артыкул **Аляксея Тамаровіча**.


ГЛЕБ ЛАБАДЗЕНКА

Хоць праект закону «Аб вышэйшай адукацыі» адкліканы з парлямэнту на патрабаваньне кіраўніка дзяржавы, гэта не паўплывала на рэформу вышэйшай адукацыі. Рэформа, што пачалася ў сярэдзіне 1990-х, працягваецца і бяз гэтага закону, які, хутчэй. закліканы легітымізаваць зьмены, чым прапанаваць рэформы.

Апроч недарэчнага законапраекту ёсьць зацьверджаныя Саўмінам заканадаўчыя акты: з 2002 г. дзейнічае новая рэдакцыя закону аб адукацыі, Палажэньне аб ступенях вышэйшай адукацыі (2002 г.)

За гады рэформы дзеля яе ідэалягічнага абгрунтаваньня былі распрацаваны тры канцэпцыі пераходу на дзьвюхступеньчатую сыстэму адукацыі. Так, у Канцэпцыі разьвіцьця вышэйшай адукацыі (1998 г.) сярод мэтаў і задач удасканаленьня сыстэмы вышэйшай адукацыі было прапанавана ўвесьці тры ступені вышэйшай адукацыі. Першая, ня менш за два гады навучаньня, прадугледжвала агульнанавуковую падрыхтоўку, наступны ўзровень — атрыманьне вышэйшай адукацыі з наданьнем ступені «дыплямаваны спэцыяліст» (4—5 гадоў), і трэцяя ступень — магістратура, арыентаваная на падрыхтоўку да навуковай і выкладчыцкай дзейнасьці (агульны тэрмін навучаньня склаў бы шэсьць год).

## Дасягненьне задавальненьня пры зьніжэньні

Калі паводле гэтай канцэпцыі разьвіцьцё адукацыі на бюджэтнай аснове яшчэ заставалася прыярытэтным кірункам разьвіцьця вышэйшай школы, то Канцэпцыя пераходу на дзьвюхступеньчатую сыстэму вышэйшай адукацыі ўжо акрэсьлівае мэту рэформы іншым чынам: «дасягненьне больш поўнага задавальненьня адукацыйных патрэб грамадзян краіны і забесьпячэньня рынку працы спэцыялістамі **пры зьніжэньні грамадзкіх і асабістых выдаткаў на вышэйшую адукацыю»**. Гэтая мэта дасягаецца «**шляхам скарачэньня тэрмінаў навучаньня** пры адначасовым арганізацыйным, мэтадычным і структурным пераўтварэньні вышэйшай школы». І ўрэшце, Канцэпцыя ўкараненьня дзьвюхступеньчатай сыстэмы падрыхтоўкі спэцыялістаў з вышэйшай адукацыяй (2004) канчаткова ўводзіць пераход на дзьвюхступеньчатую сыстэму вышэйшай адукацыі і замацоўвае скарачэньне бюджэтнага фінансаваньня ВНУ. У ёй прадугледжаны наступныя этапы: падрыхтоўчы (2004—2007 г.), калі павінна распрацоўвацца неабходная нарматыўна-прававая і навучальна-мэтадычная база, экспэрымэнтальны (2005—2009 г.), падчас якога мае ажыцьцяўляцца «экспэрымэнтальная апрабацыя новых падыходаў», і этап масавага пераходу на дзьвюхступеньчатую сыстэму, які павінен пачацца з 2010 г., калі скончыцца перавод агульнаадукацыйнай школы на 12-гадовы тэрмін навучаньня.

## Апрабацыя на БДУ

Рэформа працягваецца. Таму ў БДУ, «пілётным унівэрсытэце», ажыцьцяўляецца экспэрымэнт з увядзеньнем ступеняў бакаляўраў і магістраў; таму скарачаецца колькасьць навучальных гадзін у БНТУ, напрыклад, за кошт профільных дысцыплін; таму ўзмацняецца кантроль над разьмеркаваньнем: сёлетнія выпускнікі змогуць паехаць за мяжу на працяглы тэрмін — дзеля працягу адукацыі — толькі зь пісьмовага дазволу ад Мінадукацыі.

Нагадаем, што 26 студзеня падчас пасяджэньня па структуры вышэйшай адукацыі, законапраект, які зьбіраліся ўхваліць увесну, быў раскрытыкаваны за «недакладнасьць тэрмінаў, якія выкарыстоўваюцца ў дакумэнце, і адсутнасьць адзінага падыходу ў вызначэньні парадку ўвядзеньня бакаляўрскай і магістарскай ступеняў навучаньня».

Такая аргумэнтацыя падаецца недастатковай, бо закон ня проста ўтрымліваў недакладнасьці — невядома, ці магчыма было яго наагул правесьці ў жыцьцё. Супярэчылі адзін аднаму падставовыя прынцыпы. Так, абавязковае разьмеркаваньне для бюджэтнікаў у законапраекце дзіўным чынам спалучалася з увядзеньнем такога рынкавага стымулу павышэньня пасьпяховасьці, як штогадовы перавод студэнтаў-бюджэтнікаў на платную форму адукацыі паводле вынікаў атэстацыі.

Магчыма, ролю адыграла і грамадзкая думка: законапраект выклікаў абурэньне. Магчыма, яго вырашылі часова зьняць з разгляду, каб не правакаваць выступаў студэнцтва і выкладчыкаў. Калі спрэчкі аціхнуць, праект можна будзе лёгка правесьці зь мінімальнымі касмэтычнымі зьменамі.

## Рука ВАКаўскага лобі

Ёсьць вэрсія, што настрой пасяджэньня па структуры вышэйшай адукацыі стаў адлюстраваньнем канфлікту дзьвюх адукацыйных груповак: прапанаваны законапраект закранаў інтарэсы Вышэйшай атэстацыйнай камісіі, бо ВНУ тады б атрымалі значную самастойнасьць. За два дні да пасяджэньня па БТ з крытыкай праекту выступаў старшыня ВАК Анатоль Рубінаў. Ён спыніўся на ўвядзеньні дзьвюхступеньчатай сыстэмы вышэйшай адукацыі (яна стала галоўным аб'ектам крытыкі з боку Лукашэнкі на пасяджэньні 26 студзеня) і прапанаваў замест ступені «бакаляўр» увесьці ступень «спэцыяліст», пакінуўшы тэрмін навучаньня ў магістратуры роўным году. Канфлікт паміж ВАК і радай рэктараў ВНУ, прадстаўнікі якога зацікаўлены ў пашырэньні паўнамоцтваў, прывёў на пасяджэньні па структуры вышэйшай адукацыі да часовай перамогі лобі ВАК, і законапраект адклікалі.

Аднак пад жорсткую крытыку падпала не дзьвюхступеньчатая сыстэма, а, хутчэй, назва першай, скарочанай ступені. Не падабаецца слова «бакаляўр» — і ўсё. Але ад дзьвюхступеньчатай сыстэмы адукацыі ніхто не адмаўляцца. 26 студзеня Лукашэнка даручыў разгледзець «магчымасьці скарачэньня тэрмінаў навучаньня ў шэрагу ВНУ на асобных спэцыяльнасьцях і ажыцьцявіць аптымізацыю навучальных праграм». Розьніцы паміж такім скарочаным дыплёмам і прапанаванай законапраектам ступеньню бакаляўра ніякай.

## Адукацыя масавая і элітная

Скараціць тэрміны атрыманьня вышэйшай адукацыі — значыць ахвяраваць яе якасьцю, аднак такое скарачэньне найлепшым чынам адпавядае галоўнай мэце рэформы — скараціць аб'ёмы бюджэтнага фінансаваньня ў сфэры адукацыі шляхам скарачэньня тэрмінаў навучаньня і праз наданьне большай эканамічнай самастойнасьці ВНУ. Сутнасьць увядзеньня дзьвюхступеньчатай сыстэмы ў тым, што яна выдатна дазваляе «эканоміць дзяржаўныя сродкі», бо прадугледжвае падзел вышэйшай адукацыі на масавую (першая ступень) і элітную (другая ступень), пры гэтым навучаньне на другой ступені будзе збольшага платным, а колькасьць навучэнцаў складзе 30% ад ліку выпускнікоў першай ступені.

Тое, як падзел на вышэйшую адукацыю першага і другога гатунку адбіваецца на якасьці адукацыі, можна прасачыць на прыкладзе БДУ, дзе на старшых курсах працягваецца экспэрымэнт з увядзеньнем ступеняў бакаляўра, дыплямаванага спэцыяліста і магістра. Ажыцьцяўленьне падрыхтоўкі на бакаляўра за чатыры гады стала магчымым за кошт скарачэньня аб'ёму навучальных праграм, скасаваньня шматлікіх спэцкурсаў, павелічэньня колькасьці матэрыялаў, якія пакідаюць на «самастойнае вывучэньне». Каб запоўніць усе прагалы, якія застаюцца ў выніку такой пасьпешлівай нізкаякаснай падрыхтоўкі, нібы прызначана магістратура, куды трапляюць адзінкі.

## Менш, чым у Гвінэі

Прэзыдэнт заявіў: «Аб'ём фінансаваньня вышэйшай школы ня зьменшыцца, а зэканомленыя сродкі можна будзе накіраваць на матэрыяльную падтрымку выкладчыцкага саставу, будоўлю і рамонт інтэрнатаў, набыцьцё абсталяваньня». Аднак статыстыка сьведчыць пра адваротнае: бюджэтныя выдаткі на адукацыю штогод зьмяншаюцца — летась у параўнаньні з 2003 г. яны скарацiліся амаль удвая (у 2003 г. гэтая сума складала 402 млрд ад 6,59 трлн, г.зн. 6,1%, а ў 2004 г. — 511 млрд ад 13,9 трлн — г.зн. толькі 3,7%). Дарэчы, доля бюджэту, што выдаткоўваецца на адукацыю, у Беларусі сёньня ніжэйшая, чым у такіх краінах, як Гвінэя-Бісаў (4,8%) ці Ярданія (5%). У Гішпаніі гэтая лічба складае 11,3%, а ў Нарвэгіі — 15,6%.

У нашай сытуацыі скарачаць выдаткі на адукацыю — значыць пазбаўляць краіну будучыні. Інвэстыцыі ў адукацыю і эканамічны рост шчыльна ўзаемазьвязаныя, як паказваюць вынікі дасьледаваньняў, якія ЮНЭСКО ды Арганізацыя эканамічнага супрацоўніцтва і разьвіцьця ажыцьцяўлялі ў 16 краінах, што сталі на шлях разьвіцьця. А Індэкс разьвіцьця чалавечага патэнцыялу ПРААН пацьвярджае, што якасьць жыцьця вышэйшая ў краінах, якія дасягнулі больш высокага ўзроўню адукаванасьці. Вынікі злачыннага грэбаваньня вышэйшай адукацыяй мы ўбачым гадоў праз 15—20, калі нястачу высокакваліфікаваных спэцыялістаў, жыцьцёва неабходных дзеля пераадоленьня бясконцага адставаньня ад краін, якія сёньня выдаткоўваюць на адукацыю значна большыя сродкі, ужо немагчыма будзе кампэнсаваць за кошт старых рэзэрваў.

Сёньня ж, ва ўмовах скарачэньня дзяржаўнага фінансаваньня, адміністрацыі ВНУ вымушаны эканоміць на якасьці адукацыі і шукаць іншыя крыніцы сродкаў, г.зн. перакладваць выдаткі на студэнтаў і бацькоў. Уласна адукацыйная дзейнасьць у ВНУ, якія ўсё больш нагадваюць камэрцыйныя ўстановы, адыходзіць на другі плян, а студэнтаў пачынаюць разглядаць як дойных кароў.

Павелічэньне колькасьці платнікаў (сёлета іх — 52%), скарачэньне набору на бюджэт пры росьце агульнай колькасьці студэнтаў, ператварэньне калісьці бясплатных паслуг у платныя, павышэньне цэн на навучаньне — усе гэтыя працэсы сьведчаць пра тое, што ў краіне адбываецца імклівая камэрцыялізацыя адукацыі, якая зьяўляецца вынікам скарачэньня фінансаваньня. Яна ў першую чаргу адбіваецца на прадстаўніках незаможных груп насельніцтва, для якіх цяжар платнай адукацыі непасільны.

Кірунак, у якім ажыцьцяўляецца рэформа, задавальняе, з аднаго боку, дзяржапарат, які дамагаецца магчымасьці скараціць выдаткі на адукацыю, а з другога — адміністрацыі ВНУ, якія ўзамен атрымліваюць эканамічную самастойнасьць і права зарабляць грошы на студэнтах, спасылаючыся на неабходнасьць пераводу вышэйшай адукацыі на рыначныя рэйкі. Аднак ён супярэчыць інтарэсам звычайных студэнтаў і выкладчыкаў.

## Маёмасная дыскрымінацыя пад папулісцкі шумок

Як зафіксавана ў артыкуле 13 Канвэнцыі ААН аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах, вышэйшая адукацыя зьяўляецца правам чалавека і павінна быць даступнай для кожнага, каму яна патрэбна. Увядзеньне платы за навучаньне — гэта замацаваньне маёмаснай дыскрымінацыі. Так, паводле меркаваньня ESIB, эўрапейскага аб'яднаньня 48 нацыянальных студэнцкіх прафсаюзаў, «у краіне, дзе ўводзіцца плата за навучаньне, абмяжоўваецца доступ да вышэйшай адукацыі для людзей зь нізкім сацыяльна-эканамічным падмуркам і тых, хто традыцыйна знаходзіцца па-за вышэйшай адукацыяй».

Яшчэ не вядома, ці дазволіць увядзеньне дзьвюхступеньчатай сыстэмы адукацыі ўвайсьці ў агульнаэўрапейскую адукацыйную прастору, але тое, што ў цяперашнім выглядзе яна дазваляе значна скараціць дзяржаўныя выдаткі на адукацыю за кошт скарачэньня тэрмінаў навучаньня і камэрцыялізацыі магістратуры, зразумела ўжо сёньня.

Звальненьне выкладчыкаў і скарачэньне шматлікіх дысцыплін ды навучальных курсаў таксама зьяўляецца вынікам зьмяншэньня дзяржаўнага фінансаваньня ВНУ. Такім чынам, бягучая рэформа ня толькі спрыяе камэрцыялізацыі адукацыі і несумяшчальная з правам на агульнадаступную і якасную адукацыю.

Між тым тое, што выдаткоўваецца зь бюджэту на сацыяльную сфэру, у тым ліку на адукацыю, фармуецца за кошт падаткаў грамадзян. Увядзеньне платы за адукацыю значыць, што грамадзяне вымушаны плаціць за права на вучобу двойчы.

Спэцыялісты, якія распрацоўваюць рэформу вышэйшай адукацыі, лічаць, што ня варта спыняцца на дасягнутым скарачэньні фінансаваньня ў два разы. Толькі застаецца незразумелым, чым абумоўлена гэткая патрэба эканоміць сродкі на вышэйшай адукацыі, якая, як вядома, зьяўляецца передумовай разьвіцьця і дабрабыту ня толькі кожнай асобы, але і ўсяго грамадзтва, у краіне, што з году ў год выхваляецца беспрэцэдэнтным і стабільным эканамічным ростам.

# Смачна есьці, таварышы салдаты!

СЯМЁН ПЕЧАНКО

**Працяг. Пачатак тэмы ў № 6, 9.**


PHOTO.BYMEDIA.NET

Са сталоўкай мне пашанцавала. Усе васямнаццаць месяцаў, пакуль я рыхтаваў гэты рэпартаж (ха-ха), быў прыстойны і разнастайны асартымэнт страў, дый гатавалі смачна. Ну, насамрэч дванаццаць месяцаў, а што друкаваць яго будуць усе васямнаццаць, то хто б сумняваўся (хе-хе).

Нават выбар быў: дзьве першыя стравы, дзьве другія. Кармілі кашамі — рысавай, грэцкай, гарохавай, панцаком, час ад часу макаронай. Бульбу часьцей давалі тоўчаную. Раз на тыдзень — дранікі. Сьвята для большасьці і бяда для тых, хто трапляў тады ў нарад у сталоўку — даводзілася звыш нормы абіраць бульбу. У дадатак да гарніру ішлі тушонка, катлеты, часам смажаная скварка ці якая-небудзь паліўка (бяда, калі з кансэрваванай кількі ў тамаце — сапраўднае вычварэнства), смажаная камбала. На абед — абавязкова нейкая салата. Масла двойчы на дзень — на сьнеданак і ўвечары па 15 грамаў. У выходныя — вараныя яйкі і сок альбо фруктовае пюрэ (50 г).

Раніцай і ўвечары салдаты п’юць гарбату, у абед — кампот.

Першыя паўгоду службы прыгадваюцца пастаянным пачуцьцём голаду. Нават пажылыя павярыхі ўжывалі вайсковы слэнг: «Што, **нехватос**?» — і як маглі падкармлівалі. Для тых, хто праходзіў вучэбку, у тых жа Печах, выклікала зьдзіўленьне тое, што ў нас можна было атрымаць дабаўку. Спачатку дзіўна было бачыць, як «старыя» недаядалі свае порцыі, амаль не краналі хлеба.

Асабліва няўтульна я пачуваўся пасьля вячэры, калі разумеў, што наступным разам буду есьці толькі раніцай. Потым зьявілася магчымасьць нешта набываць у краме перад заступленьнем у нарад, а бывала, частавалі мясцовыя сябры, да якіх раз-пораз наведваліся сваякі. Пры гэтым заўсёды ўзьнікала праблема з захоўваньнем прыпасаў, рабіць гэтага ў казарме нельга, а хацець есьці ад гэтага не перастаеш. Вось і шукаеш розныя схованкі, на якія потым палююць сяржанты. Знайшоўшы, у найлепшым выпадку дапамогуць тэрмінова зьнішчыць «кампрамат» — у горшым «гаспадарлівага» салдата чакае пакараньне — той жа нарад на службу. Магчыма, у сталоўку… Зрэшты, хоць і называюць дзе-ндзе гэты нарад грэбліва — **маслы**, гэта для маладога і вечна галоднага байца ў пэўнай ступені паратунак.

Як і ў кожнай сталоўцы, у вайсковай таксама штодня вывешваецца мэню, у якое дасьціпнікі ўносяць карэктывы.Да назвы супу «Ленінградзкі» прыпісваюць «блякадны», маючы на ўвазе тое, што ў гэтым супе крупіна за крупінай ганялася з дубінай. Нярэдкімі былі подпісы да катлет «хлебныя», што часам цалкам справядліва паказвала на галоўны інгрыдыент стравы.

Паход у сталоўку — вайсковы рытуал, з адмысловымі элемэнтамі страявой, выкананьнем песьні. Толькі пры адсутнасьці начальства афіцыйныя словы каманды ігнаруюцца, і тады можна пачуць: «Рота, падрыхтавацца да жору!» Але часьцей гучыць слова **пайка**, вядомае кожнаму.

Зьмяшаныя падразьдзяленьні, у якіх служаць розныя па пэрыядах вайскоўцы, маюць адпаведны парадак абслугоўваньня ў сталоўцы — старэйшы па пэрыядзе мусіць абслужыць малодшага. Лічыцца, што такім чынам зьнікае магчымасьць эксплюатацыі маладога папаўненьня старэйшымі.

Але як бы ні кармілі ў вайсковай сталоўцы, ніколі не зьнікае жаданьне паспытаць свойскай ежы. Па першым часе аж пахне салодкае — печыва, цукеркі, нейкая газвадзічка, садавіна. Гэта інфармацыя для тых, хто мае каго наведаць у войску, але ня можа вырашыць, што ўзяць з сабою. А часам хочацца звычайнага сала з цыбуляй і чорным хлебам. Гэты няхітры наедак палюбілі ў войску нават тыя, каго раней нізавошта б ня змусілі такое есьці.

Каб пад’есьці свойскіх страў, трэба як мінімум прычакаць родных у госьці. Але ёсьць і іншы варыянт — калі пашанцуе, трапіць у звальненьне. Звальненьні бываюць розныя: чарговыя — гэта калі ў вас няма нейкіх правіннасьцяў, ці, як тут кажуць, **засосаў**; нечарговыя — у якасьці ўзнагароды за добрую службу; дзённыя і сутачныя. Сутачныя (ад сутак да трох) даюцца за асаблівыя заслугі і могуць далучацца да адпачынку. Перш чым выправіць вас у звальненьне, дзяжурны па падразьдзяленьні сяржант са старшыною праверацъ ваш выгляд і наяўнасьць адпаведных дакумэнтаў. І няхай лепш яны адшукаюць у вас нейкія недахопы, чым гэта зробіць вайсковы патруль ужо падчас вашага знаходжаньня ў горадзе. Брудныя боты, нясьвежы падкаўнерык ці няголены твар лёгка могуць стаць нагодай для працягу адпачынку на **губе**. Яшчэ горш, калі ў звальненьне вы выправіліся, не папярэдзіўшы пра гэта нікога, — іншымі словамі, пайшлі ў **самаход**. Адсутнасьць **звальняшкі** ў часе праверкі — вельмі сур’ёзны аргумэнт для затрыманьня вас вайсковай камэндатурай, як і знаходжаньне ў нецьвярозым стане. Нешта раіць у такім выпадку бессэнсоўна, тут кожны мусіць выбіраць, ці не задорага вам абыдзецца тая пляшка піва коштам у 10 сутак дадатковай службы, бо зь нядаўняга часу знаходжаньне на гаўптвахце далучаецца да агульнага тэрміну — колькі прабыў на «курорце», столькі і даслужыш пасьля. Ёсьць над чым задумацца. Яшчэ варта быць пільным у звальненьні і не прапускаць без увагі іншых вайскоўцаў, асабліва старэйшых па званьні, зь якімі мусіш па-вайсковаму павітацца. У прынцыпе, вітацца, згодна са статутам, мусіш з усімі, у тым ліку і з роўнымі сабе, але тое на практыцы выконваецца не заўсёды. А вось афіцэр ці прапаршчык не абміне вас увагай, калі вы яго праігнаруеце. Пры гэтым ён мае паўнамоцтвы вярнуць вас у часьць, дзе вы мусіце растлумачыць свайму начальніку прычыну вяртаньня.

Варта загадзя прадумаць, што і дзе вы будзеце рабіць у звальненьні, каб своечасова вярнуцца ў часьць, бо спазьненьне са звальненьня без уважлівай прычыны знойдзе адпаведную «ўзнагароду». Не ўступайце ў непатрэбныя канфлікты з цывільнымі асобамі і прадстаўнікамі праваахоўных органаў. Паверце, нічога добрага з гэтага вы для сябе не атрымаеце. Неабходна ведаць, што ў войску ўсё нашмат стражэй. Тое, што ў цывільным грамадзтве ацэньваецца, як дробнае хуліганства, тут можа каштаваць вам некалькіх гадоў пазбаўленьня волі. Увогуле, уся служба — як сядзеньне на бочцы з порахам: трэба быць вельмі ўважлівым, каб не нашкодзіць сабе і родным.

Далей — пра службовыя нарады і вайсковую пошту.

**Працяг будзе.**

У артыкуле «ПДГ, прысяга і далей» (4 сакавіка 2005, №9) няправільна ўказаны нумар тэлефону для Менску, куды зьвяртацца вайскоўцам у выпадку парушэньня іх правоў. Замест ранейшага нумару (229-14-14) цяпер дзейнічае іншы — 297-29-14, паведаміла нам прэс-служба Міністэрства абароны.

# Сага пра выбарчую скрынку

апавяданьне—даклад

СЯРГЕЙ АСТРАВЕЦ

— Вось яны нам гавораць, што нават у гэтых азіятаў плястыкавыя скрыні для бюлетэняў, і ўсё відно, што там ляжыць і як. Ну што нам, яшчэ ў чарніла мачаць пальцы, як яны, ды адбіткі пакідаць?

Нашая скрынка праверана часам. Накшталт пасылачнай. Экалягічна бясьпечная — выкінуў яе, і яна растворыцца ў прыродзе. У нас усё з дрэва было — дамы, цэрамы, нават замкі некаторыя спачатку. Не кажу ўжо пра цэрквы, безь цьвіка зробленыя.

Дрэва — гэта наш матэрыял: лыжка драўляная, матрошка, дошка хлеб рэзаць, рыбу патрашыць. Нават яйкі драўляныя. А яны нам… Скрынка пасылачная — колькі ў іх сала пераслана адрасатам. Зь вёскі ў горад. З калгасу ў інтэрнаты, кватэры, у армію. Салдацкая пасылка — гэта асобная тэма, цэлы раман, можна сказаць. Што такое пасылка з дому для салдаціка? Гэта скарб, гэта цёплае прывітаньне, гэта навязаная лучнасьць з бацькамі. А яны нам гавораць — адмовіцца. Што яны ў гэтым разумеюць?

Прапануюць галасаваньне праз пошту, інтэрнэт. Можа, эсэмэскі яшчэ пасылаць? Або па тэлефоне галасаваць, як за песьню па тэлебачаньні? Гэтыя навамодныя штучкі хай сабе пакінуць. Мы — за традыцыі. Канечне, часам гэта можа быць выкарыстана. Касманаўты таксама галасуюць, то яны якраз могуць і па радыё — ім можна давяраць, іх няшмат. Наш траўлер, калі ў моры апынаецца на выбарах. Разьведчыку шыфроўку ўвогуле пасылаць можна — не ў пасольства ж яму ісьці на ўчастак. Але такіх людзей у нас, такіх выпадкаў ня так багата. Каб празь іх дровы ламаць, сыр-бор учыняць…

Мы — за традыцыі: чырвоны кумач на стале, графін, шклянка, чырвоная трыбуна з гербам — каласы пад сярпом тваім, партрэт на сьцяне, да болю знаёмы. Або, калі на ўчастку, вялікая (памятаеце?) чырвоная скрыня для бюлетэняў. У такой паўкабана пасылаць можна было б пры жаданьні. І такія самыя скрыні, толькі меншыя, у палярнікаў на льдзіне, у памежнікаў на заставе, ля самага калючага дроту: «Возле самой границы аўраг, можа, у чашчы скрываецца ўраг…» Там праз гэтых усякіх афраазіятаў няма калі прагаласаваць спакойна.

Партызаны нашы галасавалі — скрынку на кукурузьніку зь Вялікай зямлі прывозілі. Падпольшчыкі пад пагрозай жыцьцю бюлетэні зашывалі сабе ў падшэўку, каб пранесьці праз патрулі. Як шыфроўкі таксама насілі — дзе колькі ў акупантаў складоў, танкаў, эшалёнаў. Як самае дарагое — пісьмы, данясеньні, — скрынку зь бюлетэнямі кукурузьнік вёз назад. А зьнізу, падыспадам, — бах-бабах! Вось што такое для нас гэтая скрынка.

У нас усе галасуюць, апроч сымулянтаў. У спэцпрыёмнік арыштантам вазілі скрынку? Вазілі. Паставілі на калідоры, хто хацеў, выходзіў з камэры і галасаваў. А запэцкай яму пальцы чарнілам — дзе ён адмываць іх будзе? У выцьвярэзьнік калі хто трапляў на выбары, рабілі яму халодны душ і везьлі на ўчастак. Ва ўсіх бальніцах — закрытыя ўчасткі абавязкова. Каб усё канфідэнцыйна, сакрэтна, каб ніхто не даведаўся і не перашкаджаў. На ракетнай базе ў лесе — ім не адысьці нават на хвіліну, раптам які-небудзь Руст праляціць, ня дай бог.

Вось яны абураюцца: лічылі людзей, хто загадзя прыходзіў на ўчастак, а бюлетэняў у скрыні аказалася нашмат больш, і ўсе да аднаго — за начальніка. Ды хто ім паверыць? Брахня ўсё. Дзе сьведкі? Ды ніхто ня мог бачыць, як лічаць. Ніхто пабочны. Дык тады хто пацьвердзіць? Хто пячатку паставіць? Што яны тут пішуць? Яны самі не маглі бачыць, іх блізка ніхто не падпускаў да скрынак, ведаючы іхні прыкры характар.




PHOTO.BYMEDIA.NET

Скаргу сёньня разглядаем праз гэтае «ё-пэ-рэ-сэ-тэ» міжнароднае, час свой марнуем. Што яны тут пішуць? У вас парушаюцца дэмакратычныя прынцыпы. А хто вам гэта сказаў? У вас непразрыстыя выбары. У вас і скрынкі непразрыстыя… Выбары — гэта не казла забіваць, панове замежныя віжуны. Знаеце, што «цікаўнай Варвары на базары нос адарвалі»? Выбары — гэта інтымная справа, вы ж у спачывальні фіранкі не адвешваеце?

Яна падпісана, праштэмпэлявана, і пастаўлена дата — што яшчэ трэба? Раней, канечне, было інакш: бралі сургуч, награвалі агнём, дзьве вяровачкі — пячатка, якая застывала. Потым пячатку трэба было зламаць, бюлетэні вымалі, падлічвалі, і ўсё. Тады ўсе галасавалі за аднаго дэпутата. Сёньня ёсьць варыянты — чаго яшчэ трэба? І зь пячаткамі прасьцей — плясь, росьпіс. Або на паперцы адбіў, потым наклеіў, і ўсё ў ажуры.

Народ прызвычаіўся да нашай скрынкі са шчылінай — яна, як скарбонка для грошай, выклікае давер, прываблівае. Знаходзіцца нібыта ахвотных, каб яна была, як акварыюм. Магчыма, сапраўды ёсьць такія, але для большасьці лепей, каб яна захоўвала таямніцу — колькі там купюр і якой вартасьці: навошта адкрыта рэкламаваць? А як жа з таямніцай банкаўскіх ашчаджэньняў? Наш народ увогуле любіць яшчэ ў панчоху хаваць, каб ніхто ня ведаў. Галасаваньне ў нас адбываецца патаемна!

Скарбонку потым — лясь! Парсюка ці яшчэ кагось. А скрынку — расчынілі, высыпалі. Адсартавалі. Як пісьмы на пошце. Спачатку праехалі па паштовых скрынках сініх, якія мы таксама не мянялі. Усё сартуюць па адрасах, па прозьвішчах, па краінах урэшце. Нікому ня прыйдзе да галавы ня ў тую краіну дасылаць, не на той адрас. Ніякага мухляваньня, як думаюць нашы замежныя крытыканы, якім хочацца быць назіральнікамі. А мы самі справімся бязь іх, самі з вусамі. Самі пісьменныя, лацінскі шрыфт таксама ведаем, ня дурні, як камусьці здаецца.

Ёсьць прэтэнзіі і да нашага хатняга галасаваньня. Пішуць, што быў выклік да трох пэнсіянэраў, а прывезьлі назад бюлетэняў штук сто. А калі іншыя захацелі прагаласаваць, суседзі там? Што, адмаўляць людзям? У нас дэмакратыя. Людзі адпачываюць, выхадны дзень, чаго ім цягнуцца галасаваць? З дастаўкай на дом працуем, паляпшаем абслугоўваньне насельніцтва. Хай пасядзяць за сталом у нядзелю, адпачнуць, «Багатыя таксама плачуць» паглядзяць. А што да скрынак выязных — яны невялікія, зручныя, як паштарская сумка. Якія могуць быць прэтэнзіі?

Вось яны гавораць, што павінны быць перамяшаныя бюлетэні ўнутры, што не павінны стосамі ляжаць. А яны адкуль ведаюць? Яны ж самі абвінавачваюць, што іх не дапускаюць на пушчалны выстрал да працэдуры галасаваньня, тым больш да адкрыцьця і падліку. Гэта ўсё іхнія фантазіі. Нездаровыя фантазіі. Прыніжаных і абражаных, так сказаць.

Так і хочацца часам мацюкнуцца: займайцеся сваімі справункамі, ня суньце нос у чужы агарод. Мы арытмэтыку ня горш ведаем, вучыліся. Лепей разьбярыцеся са сваімі падлікамі — па паўгоду лічыце і ня можаце разабрацца. Лепш бервяно спачатку са свайго вока дастаньце. Усе гэтыя выбарчыя шоў — з шарыкамі, трубамі, трашчоткамі, са сьцягамі, партрэтамі, сырэнамі, раздачай гарачых сасісак, з шэсьцямі аркестраў, з паветранымі шарамі, зь півам, попкорнам. У нас выбары — гэта сур'ёзна, у іх — маскарад нейкі.

Дзякуй за ўвагу.

*24 сакавіка 2005 г.*



**СЯРГЕЙ АСТРАВЕЦ** — празаік, журналіст радыё «Свабода». Выдаў тры кнігі прозы. Жыве ў Горадні.

Падведзены вынікі нацыянальнага літаратурнага конкурсу для школьнікаў «Я маю твор…» («Дзень Зямлі-2005»). Дваццаць фіналістаў конкурсу запрошаны ў Менск на майстар-клясы, што адбудуцца з 31 сакавіка да 2 красавіка. Зьмяшчаем вершы некаторых фіналістаў.

**А.Хадановіч**

## Арцём Аладка

ЛЕТНЯЯ МЭЛЁДЫЯ

Падаўся ў лес працяжны гук струны
І водгаласак гучнага тамтама.
Смак лета — ён сунічны, крамяны,
З луговым пахам, дажджавым
таксама.

З крыніцамі стары напеў імчыць,
Над травамі палёў жалейка плача.
То летняя мэлёдыя гучыць
З сабачым выем, лямантамі качак.

Сьпявае конік песеньку маю,
Бы адзінока шэпча кастаньета...
Зачаравана, ўдумліва стаю
На скрыжаваньнях сонечнага лета.

*в.Бараўляны Менскага р-ну*

## Ірына Бельская

* * *

Шалее вецер на двары.
Зіма на волю рвецца.
З душою ты не гавары —
Яна не адзавецца.

Перад зімой апошні дождж
Я не пабачу, можа.
Ты сэрца лепей не трывож —
Яно не дапаможа.

Я восені скажу: «Бывай!» —
У вырай хай нясецца.
Ты галаву не забівай —
У ёй ня хопіць месца.

Шапоча вецер у лісьці.
Ты сэрца грэеш кавай...
А колькі мне яшчэ цвісьці —
Нікому не цікава.

*в.Чарневічы Глыбоцкага р-ну*

## Сяргей Завалокін

* * *

*Янку Купалу.*

Вецер на руінах, плач жалобна!
Плач, зімовы вецер, носьбіт змроку!
Плач перарасьце — у крык
вантробны,
бо сьвятла ня ўбачыць грэшным
вокам.

Над чужой магілай,
доляю нямілай,
праўдаю забітай
плач!
Як на папялішчы,
д'ябальскім ігрышчы,
сьсечанай бярозай
плач!

Хай жалобна з хмары льюцца сьлёзы
горкія на твар, узьняты ўгору!
Хай пякуць гарэлкай, бо цьвярозы,
бо не пераношу гэта гора...

Спадчыну згубіўшы,
галаву схіліўшы,
розум пахаваўшы,
плач!
Як зязюля ў лесе
й каня ў паднябесьсі,
па дзядоўскім краі
плач!

*Менск*

## Даша Кадамская

* * *

Зоры блішчаць пад нагамі.
Я іду, закаханая і пяшчотная,
Зёлка я, рыжая котка я.

Сёньня ноччу прысьніўся мне
вершнік,
Ён скакаў па пыльнай дарозе ля дому
старога...

А на небе ніводнай зоркі —
Усё ў сьнежным пыле.

Заблукаць у пошуках
У памкненьнях і думках сваіх...
Гэта час зор, гэта час мар,
Гэта час выбіраць свой штандар.

Абудзіць дотыкам,
Пацалункамі вочы амыць...
Гэта час жыць, гэта наш час.
Гэты час закахаўся ў нас.

І душой прагнаю
Дакрануцца да сэрца быцьця,
І адчуць ток, і адчуць пульс...
«Гэта крык, што жыве Беларусь!»

*Менск*

## Ульляна Маставая

* * *

Бог плакаў васковай сьвечкай,
А д'ябал сьмяяўся ля брамы.
Бог думаў, што ён — вечны,
І д'ябал думаў таксама.
Адчыніліся раптам дзьверы,
І ўбачылі нешта абодва,
Зразумеў Бог, што ён быў дрэнны,
А д'ябал — што ён быў добры.
Пацягнуліся разам да брамы —
І адскочылі, бы апякліся.
Хто зь іх быў сапраўды абраны?
Схамянуліся — і адышліся.
Д'ябал плакаў васковай сьвечкай,
А Бог сьмяяўся ля брамы.
Збаўленьне ад вечнасьці вечнай
Надзейна было схавана...

*Наваполацак*

## Соня Марозава

* * *

Не дае натхненьне жыць,
Растудыць яго тудыць!

* * *

Пакуль мы тужліва праменьчыка
жджом,
Сьвятло выпадае дажджом.

* * *

Ні прамацваю праклямацыю,
Ані мацаю анімацыю.
Лірай коцаю мікрасоцыюм —
Маю рацыю.

* * *

Б'ецца поўня ў сашчэпленых цапах
халоднага гольля.
Ты рымуеш бяздольна, здымаючы
пыл з навакольля.
Ты куеш і пільнуеш прылёту чароўнага
відма,
Што сталёвасьць кавадла размажа па
снох, як павідла.

* * *

Мы наладзілі лажу. Нам собіць яе
ўвасобіць.
Гэта шалы шальмоўства, сляпыя, як
танга мустанга.
Гэта мроі і сны, што ліюцца лікёрнай
ракою.
Гэта зманка.
А зрэшты...
А можа...
...Але!
ГЭТА ТОЕ.

*Менск*

## Аляксандра Папкова

* * *

Уночы я застыну ў белым суме
І буду назіраць за шчасьцем белым,
А ты і не падумаеш спытаць —
Навошта плачу гэтай зорнай ноччу...
Хутчэй мне шклянку падасі абсэнту
І не заўважыш нават, што я зьнікла,
Прапала, згінула, згубілася, растала...

З табою побач я — забытая цытата,
Я — месяц цьмяны, я — шэдэўр
фрыволны...
І з самай першай ледзяной сустрэчы
Адчула гэты смак спакусы ў сэрцы...
У нас з табой цяпер няма сакрэту:
Я — цень ад ценю, я, прынамсі, —
SHADOW.

* * *

Да маскараду кліча сэрца,
Я не іду супроць жаданьня.
Я крочу ціха па сюжэтах:

З сабой прызначыла спатканьне,
Бо не жывецца памяркоўна.
Адкрыла дзьверы я ў паветра,
Вядзьмаркай стала... Бессэнсоўна
У цемру ночы паляцела,
Бо ў чорным колеры хацела
Я падымацца да нябёсаў,

Дзе таямніцы і надзеі,
Духоўнасьць, вера, бестурботнасьць,
Дзе сутнасьць можа стаць камэтай,
Дзе сьвет — касматая бясконцасьць.

Пяшчотна-злая, зразумела,
Што трэба зёлкі,
Што прытомнасьць
Згубіла дзесьці ў цёмных фарбах.

Ды ёлкі-палкі, палкі-ёлкі,
Мне не жывецца памяркоўна,
Бо я — вядзьмарка, тут самотна
Жыву, як у турме, на волі...
Мне не знайсьці сябе ніколі
У межах левага паўшар'я.

*Ліда*

## Вераніка Садкоўская

СТАНЦЫЯ ЖЫЦЬЦЯ

Гэта станцыя жыцьця
Атрымалася складанай.
Я вярнуся зь небыцьця,
Але іншаю ня стану.
Мой гадзіньнік б'е дванаццаць,
Толькі гэта не пужае.
Я ня ў казцы. Што мне страціць?
А што маю — тое маю.
Сэрца, спаленае сонцам,
Душу, выпітую горам,
Верш на жоўценькай старонцы
І твой позірк, што з дакорам.
Маю лёс зусім ня просты,
Маю веру-ўратаваньне,
Маю зоркі і нябёсы,
Маю сьлёзы і каханьне.
Я зьбяру пачуцьцяў жменю,
Ды мне большага ня трэба.
Пакладу сабе ў кішэню
І са станцыі ад'еду.

ВЕРА Ў НЯБЁСЫ

Уратуй мяне, вера ў нябёсы,
Вобраз шчасьця мне намалюй.
Уратуй ад нядобрага лёсу,
Ад памылак мяне ўратуй.

Навучы маё сэрца змагацца,
Каб ня секлі галоў палачы.
Каб усюды магла дачакацца,
Ты цярплівасьці навучы.

Дай цяжкое выпрабаваньне
І у пекле доўга трымай,
Праблытай нянавісьць з каханьнем —
Толькі сілы для гэтага дай.

Уратуй мяне, вера ў нябёсы,
Засмучоную — пашкадуй.
Зараз льюцца апошнія сьлёзы.
Пакуль веру яшчэ... уратуй.

*Глыбокае*

## Ксенія Федаронак

* * *

Скамечыць, разьбіць, загубіць...
Скалечыць, забыць, апляваць...
Ня думаць, ня верыць, ня жыць,
Ня меиць, не любіць, не кахаць...

А потым: «Прабач, пачакай...»
А потым: «Кахаю, люблю...»
І сьлёзы, і боль, і адчай.
Чакаю, трываю, ня сплю.

І зноў абяцаньне, каханьне,
Сустрэча, размова, працяг,
Рука у руцэ — і прызнаньне,
І крылы, і неба, і шлях...

А потым — падман, адзінота,
Маўчаньне, адчай, забыцьцё,
Трывога, пакуты, маркота
І выбар: ці сьмерць, ці жыцьцё...

Ні гора, ні шчасьця, ні болю,
Ні сну, ні пакут, ні жыцьця...
Нікога, нікому, ніколі...
Ні мараў, ні сэрца біцьця...

*Паставы*

## Ася Ярмоленка

ВЯЗЬНІ РЭАЛЬНАСЬЦІ

...Ствараць казку ў рэальнасьці...
Як вязьні ў турме,
Галовамі круцім,
Каб адагнаць
Думкі аб хуткай
Сьмерці. Яна
Зьбірае даніну заўтра,
Калі трынаццаць з нас будуць
Пад ногі
Мядзьведзямі
Кідацца паўночнаму зьзяньню.
(Галава круціцца,
Як у каралевы,
Што трапіла ў келіх зь віном.)
Спаць.
І не стагні. Ты можаш
Левай рукою
Заплюшчыць мне вочы,
Калі я памру.

На вуліцы — сьнег і бруд.

*Магілёў*



*«Калі ўсе мы разам…»*
*М. Багдановіч*

**12 красавіка 2005**

у рамах вечарыны ка(сь)мічнай паэзіі

# Землякі: погляд з космасу

адбудзецца прэзэнтацыя кнігі Андрэя Хадановіча

**«Землякі, альбо Беларускія лімэрыкі».**

На арбіце Ўладзімер Арлоў, Кася Камоцкая, Максім Жбанкоў, Юрась Барысевіч, Вальжына Морт, Глеб Лабадзенка, гурты «Індыга», «Рацыянальная дыета» й «4.8», «Сны Юр'я Гагарына» ў пастаноўцы экспэрымэнтальнага тэатру «EYE», «сатурніянскія» паэты Вера Бурлак і Віктар Жыбуль ды іншыя землякі.

Месца дзеяньня:
**вялікі касмадром Дому літаратара (вул. Фрунзэ, 5).**
**Пачатак а 18.00. Уваход вольны.**

# Усю жызьню узьніца

**ТАЦЯНА БАРЫСІК**

22 чэрвеня 2003 году, пятая гадзіна раніцы. На гаўбцы шматпавярховіка стаіць паўнаваты дзядзька і галёкае на ўвесь двор:

— Вайна! Вайна!

З вокнаў высоўваюцца заспаныя спалоханыя суседзі. Убачыўшы такую зацікаўленасьць, дзядзька на хвіліну сьціхае і, набраўшы паветра ў грудзі, працягвае яшчэ гучней:

— 62 гады таму пачалася вайна!

Гэткім чынам псыхічна хворы інвалід па мянушцы Кампутар вось ужо два гады запар нагадвае сваім сучасьнікам аб векапомным дні ў гісторыі Бацькаўшчыны.

60 гадоў, як няма вайны, а беларуская прымаўка «Хай тое немцу» ніяк ня зьнікне з ужытку.

Летам 1992 году магілёўскія дзеці разам з выхавальнікамі выехалі на аздараўленьне ў Нямеччыну. Падчас адпачынку вырашылі зладзіць канцэрт. Адзін хлопчык вызваўся чытаць верш, запэўніўшы, што верш вучылі ў школе і ён добра яго памятае.

Выйшаў на сцэну. Выкананьне сапраўды было нічога сабе, але тэматыку твору для вечарыны хлопец падабраў няўдала. На ўсю глядзельную залю загучалі палымяныя радкі, прысьвечаныя барацьбе з фашысцкімі акупантамі.

Дзьве бабулькі, што ня дужа ладзілі міжсобку, выпадкова зайшлі да суседкі ў адзін і той жа час. У адной зь іх унучка выйшла замуж у Нямеччыну. Ну, тая і хваліцца суседцы:

— Вой, добра ўладзілася мая ўнучка! І дом у яе вялікі, і вучыцца яна там, і машыну сама водзіць. І муж у яе харошы, і сьвякрова харошая…

— А ўсё адно фашысты! — не стрывала хвальбы непрыяцелька.

— Гаварыць буду ўсё, пра што памятаю, толькі вы не пра ўсё пішыце, — папярэджвае вэтэран карэспандэнта раёнкі.

60 гадоў страху?

У другой палове 80-х напярэдадні чарговага 9 Траўня наведалі прадстаўнікі мясцовай улады вясковага вэтэрана і пытаюць:

— Якую вам патрэбна аказаць дапамогу?

— Нічога мне ня трэба. Толькі вазок гною, агарод засеяць.

— Гэтага мы ня можам.

— Ну, калі ўжо гаўна даць ня можаце, то й няма пра што гаварыць.

> Гаварыць буду ўсё, пра што памятаю, толькі вы не пра ўсё пішыце

У працоўным калектыве зайздросьнікі дражнілі яго Палонны Заяц. Заяц — гэта прозьвішча. А палонны, таму што немаўляткам роўна адны суткі на руках у маці пабыў у нямецкай няволі. Праз гэта цяпер меў ільготы, нават за сьвятло плаціў меней.

Задумалі жыхары маланаселенай вёскі купіць новае калодзежнае вядро.

Зьбіраць грошы даручылі Міхайлавічу, чалавеку адказнаму і вучанаму. Даведалася Валя, што й яна мусіць здаць грошы, прыбегла ў хату да Міхайлавіча і лямантуе:

— Грошы забіраеце! Зь сіраты ізьдзекуецеся, мой бацька на фронце загінуў!

На той час сіраціна мела каля пяцідзесяці пяці гадоў, зьбіралася на пэнсію. Васьмідзесяцігадовы Міхайлавіч паглядзеў на яе і з сумам зазначыў:

— Дык і я ж сірата.

Геня піў даўно і заўзята. Апошнія 15 гадоў нідзе не працаваў. Спачатку перабіваўся на матчыну пэнсію. А калі старая памерла, давялося парабкаваць на падворках пэнсіянэраў. У вайну маці была вязьнем канцлягеру. Прыйшлі маркі. Брат запатрабаваў палову:

— Ета і нашая матка. Мы каня купілі.

Другая палова засталася Геню. Цяпер можна было не працаваць на пэнсіянэраў. Ён і не працаваў, увогуле амаль нікуды не выходзіў. Здаралася, наймаў машыну, каб езьдзіць у мястэчка па гарэлку і піва. Піць самагон цяпер ён лічыў ніжэй свайго гонару. Найчасьцей купляў разьведзены сьпірт. У апошнія свае дні піў, не ўстаючы з ложка. Так і памёр, стаўшыся апошняю ахвярай вайны.

— Ета узьніца — канешне, узьніца, усю жызьню узьніца, замужам за паліцаем! — камэнтуе пажылая настаўніца знаёмае прозьвішча ў сьпісе вязьняў, дасланым у школу.

«Ніхто не забыты, нішто не забыта», — гавораць па тэлебачаньні.

«Усе забыты, усё забыта», — не згаджаецца вэтэран.

8 траўня 2002 году ў адным зь сельсаветаў на поўдні Магілёўшчыны арганізавалі сьвята ў гонар Дня Перамогі. Шмат хто пасьля афіцыйнай часткі баляваў за сталом. Дзябнуўшы, па хатах паразыходзіліся. Забыліся толькі на вэтэранаў з далёкіх вёсак. Давялося гаротнікам зьдзейсьніць пераход даўжынёй у 5—8 кілямэтраў.

У другой палове 80-х напярэдадні чарговага 9 Траўня наведалі прадстаўнікі мясцовай улады вясковага вэтэрана і пытаюць:

— Якую вам патрэбна аказаць дапамогу?

— Нічога мне ня трэба. Толькі вазок гною, агарод засеяць.

— Гэтага мы ня можам.

— Ну, калі ўжо гаўна даць ня можаце, то й няма пра што гаварыць.

НОВЫЯ КНІГІ

## Скрадзеныя кароны




Карона Вітаўта Вялікага: раманы, аповесьці, апавяданьні / Уклад. У.Сіўчыкава, А.Сіўчыкавай. — Менск: Мастацкая літаратура, 2004. — 510 с.

575 гадоў таму была сарваная каранацыя вялікага князя Вітаўта. На дзяржаўнай мяжы асьвечаную папам рымскім карону ў Вітаўтавых паслоў гвалтам адабралі паслугачы Ягайлы, а надалей гэтую пасечаную мячом карону выкарыстоўвалі кракаўскія біскупы.

Гісторыя пакладзена ў аснову дэтэктыўна-прыгодніцкай аповесьці Міраслава Адамчыка і Максіма Клімковіча «Каханка д'ябла, або Карона Вітаўта Вялікага». Частка назвы аповесьці сталася найменьнем і для велічэзнага (60 аўтарскіх аркушаў!) тому.

Уладзімер Караткевіч калісь заклікаў калег-літаратараў ствараць дэтэктывы і тэксты ў іншых чытэльных жанрах, каб пашырыць кола беларускіх чытачоў. Пры канцы 1980-х сябры літаратурна-грамадзкага аб'яднаньня «Тутэйшыя» адгукнуліся на гэты заклік — Міраслаў Адамчык, Адам Глёбус, Максім Клімковіч, Людміла Рублеўская ды інш. падтрымліваюць гісторыка-рамантычную Караткевічаву традыцыю і задаюць адпаведную танальнасьць зборніка.

У зборніку прадстаўлены разнастайныя жанры — ад клясычнага злачынства, учыненага ў «замкнёнай прасторы» («Сцэнар сьмерці» М.Клімковіча) да трылеру («Заўсёды сьветла каля турэмных муроў» У.Сакалова), ад містычнага дэтэктыву («Дзеці Гамункулуса» Л.Рублеўскай) да міліцэйскага раману («Сьмерць за сьмерць» М.Чаргінца).

Крыху бянтэжыць фармат выданьня, амаль роўны А4. Цяпер найбольш зручны фармат для дэтэктываў — гэтак званыя «пакет-букі». Але, мабыць, выдаўцы разьлічвалі, што пампэзны том разыдзецца на прэзэнты або што ў якасьці ўдарнага інструмэнту ім хораша будзе пераконваць скептыкаў, якія сумняваюцца ў жыцьцяздольнасьці беларускага дэтэктыву.

Сыгнальны асобнік зборніка дэтэктываў напаткаў крымінальны лёс. Пасьля прэзэнтацыі зборніка ў адной з тэлеперадач яго скралі ў дырэктара выдавецтва «Мастацкая літаратура» Ўладзіслава Мачульскага і галоўнага рэдактара Віктара Праўдзіна. Нецікавыя кнігі не крадуць.

**Андрэй Варонін**

**АДАМ ГЛЁБУС**



# Сучасьнікі

### 2004. С. і дождж

Сустрэча адбылася ўлетку, калі можна выпадкова трапіць пад залеву. Вуліцай Кірава я кіраваўся ва ўнівэрсытэт. Каля Міністэрства замежных спраў мяне і засьпеў дождж, ды такі, што давялося забегчы на ганак Палацу школьнікаў. Празь некалькі імгненьняў там зьявіўся і спадар С. Я ўважліва паглядзеў на чаравікі спадара С. і падумаў, як выдатна, што ў нашай краіне носяць такія цудоўныя чаравікі. С. таксама разглядаў мой абутак, ён разглядаў ня толькі мой абутак, ён разглядаў мяне з такім выглядам, нібыта я мушу яго ведаць і павітацца зь ім. Напэўна, мне варта было павітацца з добра апранутым незнаёмцам, але пасьля прывітаньня трэба было б пра нешта гаварыць, а гаварыць пра дождж я не хацеў. Я падумаў, што спадар С. ішоў з прэзыдэнцкага палацу ў Міністэрства замежных спраў — адпаведна, ён дыплямат. Пра беларускую дыпляматыю, як і пра залеву, гаварыць не хацелася. Мы прастаялі на ганку хвілін з дзьвацаць, але не сказалі адзін аднаму ніводнага слова. Дождж скончыўся, і мы разышліся ў супрацьлеглых напрамках. С. у бок МЗС, а я — у бок Нацыянальнай бібліятэкі. Недзе праз паўгоду я ўбачыў С. на тэлеэкране. Спадар Л. і спадар С. нешта там абмяркоўвалі. Закадравы голас сказаў, што чалавек, зь якім я хаваўся ад нечаканай навальніцы, — прэм'ер-міністар Сідорскі. Як цудоўна жыць і ня ведаць твар прэм'ера, а потым нечакана даведацца пра ягоны выдатны абутак. Я нават сам сябе пахваліў за канструктыўную апалітычнасьць.

*P.S.* Цяпер, калі інфармацыйная прастора перапоўнена тварамі ўкраінскіх прэм'ераў, я падумаў, ці пайшоў бы я галасаваць за С., каб ён вылучыўся ў прэзыдэнты? Не, не пайшоў бы.

*Напісаў 27.12.2004, 13:45.*

### 2004. Суша і сушкі

Музычны прадусар Алесь Суша частуецца каваю ў мяне і разважае пра стравы: «Дзе я толькі ні быў, і што я толькі ні каштаваў… Я ж аб'ехаў краін 40—50, а рэстаранаў наведаў незьлічоную колькасьць, толькі няма для мяне смачнейшай стравы за нашы беларускія сушкі. Асабліва я люблю ня круглыя, а такія крышку выцягнутыя, салодкія, і каб з ванільлю. Ты не паверыш, я заўсёды ў машыне трымаю пакет з сушкамі. Можа, таму і прозьвішча ў мяне — Су-ша».

*Напісаў 03.01.2005, 14:30.*

### 1987. Робертас і савецкае КГБ

Віленскі школьнік Робертас удзельнічаў у несанкцыянаваным мітынгу. Акцыя ладзілася літоўскімі нацыяналістамі, якія патрабавалі свабоды Літве. Міліцыянты той мітынг на Катэдральным пляцы разагналі. А празь некалькі дзён Робертасаву маці выклікалі ў КГБ, дзе паказалі фатаздымкі з акцыі. На фота быў і Робертас. «Так мама даведалася, што я куру!»

*Напісаў 11.01.2005, 14:23*

**АЛЯКСАНДАР ВОРВУЛЬ**



# Слоўнік скептыка

**Уздых** — нечытэльная фраза гісторыі каханьня.

**Узрост сярэдні** — калі ты вельмі малады для пэнсіі і вельмі стары для пошуку новай працы.

**Улада** — рэч, якая забівае тады, калі ты яе ня маеш.

**Уласнасьць інтэлектуальная** — стол, крэсла і асадка.

**Уменьне лётаць на мятле** — тое, што адрозьнівае ведзьму ад звычайнай жанчыны.

**Урад** — утрыманец прадпрымальніцтва.

**Урок** — пераход запісаў настаўніка ў запісы вучня без праходу праз чый-небудзь мозг.

**Усё** — гэта калі пад партрэтам зьяўляецца другая дата.

**Усёдаравальнасьць** — гэта калі ня помніш зла і крыўдаў, якіх прынёс іншым людзям.

**Ускладненьне мэдыцынскае** — раман з мэдсястрой.

**Усьміхацца** — рабіць зубы безабароннымі.

**Уяўленьне** — кволая зброя ў змаганьні з рэчаіснасьцю.

**Фантазія** — думка, якая разьвівaецца хутчэй, чым яе аўтар.

**Фантаст** — чалавек, якому не хапае фантазіі, каб зразумець рэчаіснасьць.

**Фізыка атамная** — навука, якая зрабіла альхімікаў нармальнымі людзьмі.

**Філязофія** — малаўцямныя адказы на невырашальныя пытаньні.

**Фінансы** — майстэрства перадаваць грошы з рук у рукі да тае пары, пакуль яны ня зьнікнуць.

**Фэміда** — жанчына, якая шукае тых, каму ўсьміхаецца Фартуна.

**Фэмінізм** — гэта калі да жаночых недахопаў дадаюцца мужчынскія.

**Фюрэр** — чалавек, які кожнаму абяцаў болей, чым усяму натаўпу.

# Час пускаць камяні

У нядзелю ў шатляндзкім Пэйсьлі завяршылася сусьветнае жаночае першынство па кёрлінгу. Выйграла яго зборная Швэцыі. А ўжо 2 красавіка ў Вікторыі (Канада) стартуе мужчынскі чэмпіянат сьвету. На заходнім узьбярэжжы Канады зьбяруцца 12 наймацнейшых камандаў плянэты — Аўстралія, Новая Зэляндыя, Канада, Шатляндыя, Фінляндыя. Гульні будзе трансьляваць канал «Эўраспорт».

## Новыя тэндэнцыі ў спорце

У сьвеце расьце цікавасьць да экзатычных відаў спорту — сплаву на байдарках па горных рэках, гарадзкога альпінізму, сэрфінгу, снаўборду або папулярнага апошнім часам цюбінгу. Прымета пераходу якога-небудзь віду з экзатычных у масавыя — уключэньне ў алімпійскую праграму.

Яшчэ адна з апошніх тэндэнцый — індывідуалізацыя ці зьмяншэньне колькасьці ўдзельнікаў таго ці іншага спаборніцтва. Прасьцей аматару-пачаткоўцу адшукаць аднаго напарніка і двух супернікаў для пляжнага валейболу, чым фармаваць дзьве каманды па шэсьць чалавек для яго клясычнага субрата. Або навошта ствараць хакейную каманду з дваццаці чалавек, калі можна «зьбіць» дружыну з чатырох чалавек для гульні ў кёрлінг. Пагатоў і пляцоўка трэба меншых памераў.

Нядобразычліўцы кажуць, што кёрлінг — страшэнна нудная гульня. Нехта асьцярожна пуляе камень па лядовай пляцоўцы, а іншыя апанtana ў гэтым момант шуруюць лёд швабрамі. Аднак варта ўсяго раз паглядзець гульню, каб захварэць на яе.


PHOTO.BYMEDIA.NET

## Свой/чужы дом

У кёрлінг гуляюць дзьве каманды па пяць чалавек (чатыры асноўныя і адзін запасны) — скіп (капітан), віцэ-скіп, лід (вядучы) і сэканд (другі). У залежнасьці ад катэгорыі спаборніцтваў гульня складаецца з васьмі—дзесяці эндаў (пэрыядаў), у кожным зь якіх запускаецца па восем камянёў.

Задача кожнай з каманд — паставіць як мага болей сваіх камянёў-бітаў у дом, дыямэтар знадворнай акружнасьці якога складае шэсьць футаў (182 см), як мага бліжэй да цэнтру. І заадно па магчымасьці павыбіваць адтуль камяні супернікаў. Маса каменя — 44 фунты (19,95 кг). Кіруюць дзеяньнямі скіпы — мозг і штаб каманды. Яны вырашаюць, як найзручней «трапіць» у дом, уваход куды можа быць зачынены камянямі суперніка.

Гульцы каманды па чарзе — лід, сэканд, віцэ-скіп, скіп — пускаюць камень. Двое калег у гэты момант апанtana паліруюць лёд шчоткамі-мётламі, ствараючы адмысловую дарожку, коцячыся па якой, камень ня толькі паўлічвае свой шлях, але нават мяняе траекторыю.

## З радзімы піктаў

Радзіма кёрлінгу — Шатляндыя. Паводле адных зьвестак, кёрлінг прыдумалі горцы, якім трэба было неяк бавіць час у перапынках паміж войнамі з ангельцамі. Паводле другой вэрсіі, гульню прыдумалі манахі, якія ня ведалі, куды сябе падзець доўгімі каледонскімі зімамі. Першыя зафіксаваныя згадкі пра гульню адносяцца да 1511 г. На адной з гравюр, датаванай гэтым годам, і быў адлюстраваны «камень у руху». Пазьней Пітэр Брэйгель-старэйшы адлюстраваў гульню на карціне, а шатляндзкія паэты раз-пораз праслаўлялі яе ў вершах.

Біты напачатку шукалі ў скалах, падбіраючы абломкі аднолькавай формы й вагі. Пасьля далучэньня Шатляндыі да Англіі ангельскія салдаты захапіліся гульнёй. Яны і далі назву — curling (вярчэньне) — і прыдумалі новыя правілы. У 1775 г. пачалі вырабляць круглыя камяні з мэталічнымі ручкамі. У 1838 г., калі быў заснаваны Каледонскі каралеўскі клюб, памеры й форма гранітных камянёў, якія рабілі з валійскага граніту, канчаткова стандартызаваліся.

Цяпер заканадаўца мод у кёрлінгу — Канада. У краіне з 30-мільённым насельніцтвам гульнёй стала займаецца адзін мільён чалавек. Большая аўдыторыя толькі ў хакею. Нацыянальныя чэмпіянаты зьбіраюць на стадыёнах па некалькі тысяч гледачоў, ёсьць нават адмысловыя тэлеканалы, што трансьлююць выключна кёрлінг, а ў некаторых правінцыях нават дзейнічаюць па некалькі спартовых асацыяцый.

## Ня наша

У Беларусь кёрлінг прыйшоў у 1997 г., калі была створана Асацыяцыя гэтай гульні. Цяпер праводзіцца мужчынскі чэмпіянат краіны, у якім бяруць удзел восем каманд — пакуль толькі сталічныя. Сталых спаборніцтваў для жанчын-кёрлераў няма.

На міжнароднай арэне зборная Беларусі гуляе ў дывізіёне «B» і пра выхад у сусьветную эліту можа толькі марыць. У сьнежні ў Баўгарыі на чэмпіянаце кантынэнту ў дывізіёне «B» айчынныя спартоўцы ў складзе Міхаіла Шайбака (скіп), Канстанціна Балакіна, Васіля Гарбачова, Юрыя Караневіча наогул атрымалі першыя ў сваёй гісторыі перамогі — над зборнымі Андоры й Польшчы.

Для небагатай Беларусі кёрлінг — нятанны спорт. На міжнародныя спаборніцтвы спартоўцы езьдзяць за ўласныя грошы, дый экіпіроўка вымагае немалых сродкаў. Адзін камень — а іх трэба мінімум восем — каштуе 300 даляраў. Праўда, зносу такім снарадам няма, яны служаць па пяцьдзясят гадоў. Шчотка таксама мусіць быць адмысловай — выраблена з сынтэтычнага матэрыялу ды здольнай круціцца ва ўсіх плоскасьцях (кошт — ад 40 даляраў). На адну нагу кёрлеры адзяваюць асаблівы галёш са сьлізгаючай паверхняй — слайдэр, на другую — антыслайдэр, які ня сьлізгае. Кошт слайдэра — ад 20 даляраў. Прафэсіяналы гуляюць у спэцыяльных чаравіках (кошт ад 200 даляраў). Патрабуецца адмысловая пляцоўка са спэцыяльнай кансыстэнцыяй лёду.

Праўда, у праект будаўніцтва пад Лагойскам спартовага комплексу ўнесена і прапанова па пабудове клюбу з дарожкамі для кёрлінгу, бо на менскіх пляцоўках сапраўдных прафэсійных спаборніцтваў не правядзеш.

Без дзяржаўнай заангажаванасьці кёрлінгу ў нас не разьвіць. Галоўнае — зацікавіць кіраўніцтва краіны, і палова справы вырашана. Шпурляць камяні можна нават пад вокнамі рэзыдэнцыі на К.Маркса. Кафля там гладзенькая-гладзенькая.

**Алег Раявец**

## СЬЦІСЛА

### Каня засьпелі на допінгу

Міжнародная фэдэрацыя коннага спорту пазбавіла залатога мэдаля Атэнскай алімпіяды ірляндца Шона О'Конара. У крыві каня спартоўца Ўотэфарда Крыстала былі знойдзены сьляды забароненых прэпаратаў — флюфазаніну і цыкляпэнтыксолу. Ірляндыя пазбавілася адзінага «золата» Алімпіяды, а О'Конар прапусьціць тры месяцы праз накладзеную дыскваліфікацыю. Ці будуць накладзены санкцыі на каня, не паведамляецца.

### Менскі фінал

У фінале Адкрытага чэмпіянату Беларусі па хакеі сышліся сталічныя «Юнацтва» і «Керамін». Першыя абыгралі ў паўфінале магілёўскае «Хімвалакно», другія — кіеўскі «Сокал». Фінальная сэрыя — да чатырох перамог. Матчы 31 сакавіка, 3, 4, 6, 8, 10 красавіка. Першы матч прайшоў у сераду. Як паведаміў «НН» у фэдэрацыі хакею, усе гульні сэрыі пройдуць у Палацы спорту на Машэрава. Пачатак у будныя дні ў 18.30, у выходныя — у 13.00. Летась менскія клюбы таксама гулялі ў фінале, тады «Юнацтва» выйграла зь лікам 3:0.

### Дзюдо па-беларуску

У мінулы ўік-энд у Менску і Таліне прайшлі этапы Кубку сьвету па дзюдо. У горадзе над Сьвіслаччу сабраліся спартоўкі з 12 краін. Два залатыя мэдалі заваявалі беларускі — Тацяна Масквіна (вагавая катэгорыя да 48 кг) і Юлія Барысік (звыш 78 кг). У Таліне прайшоў мужчынскі міжнародны турнір. Беларусы таксама прывезьлі адтуль два першыя месцы — «золата» здабылі Сяргей Шундзікаў (да 81 кг) і Аляксандар Шлык (да 66 кг).

### Шляхам Эрнста Рэма

Міністэрства спорту Нямеччыны пакарала сваіх футбольных фанатаў, якія літаральна разьнесьлі ў мінулую суботу горад Цэле, дзе праходзіў таварыскі (!) матч між зборнымі Славеніі й Нямеччыны, які скончыўся перамогай гасьцей — 0:1. «Учынкі гэтых хуліганаў — ганьба для нашай краіны. Сапраўдныя заўзятары міралюбныя і атрымліваюць задавальненьне ад футболу», — заявіў міністар спорту Ота Шылі.

**АР**

# ARCHE Самы дэфіцытны часопіс




**У новым нумары**: Віталь Сіліцкі пра беларускую рэвалюцыю, Юры Чавусаў, Віктар Корбут і Аляксей Бацюкоў аб Другой сусьветнай вайне, Пётра Рудкоўскі пра кнігу Ўладзімера Падгола «Куля для прэзыдэнта», гутаркі з Алегам Латышонкам і Леанідам Галубовічам, Уільям Фолкнэр у перакладзе Яна Максімюка, «Франкфурцкія лекцыі» Пэтэра Слотэрдайка.

312 старонак

**Шукайце ў незалежных распаўсюднікаў**

## ПАРТЫЯ З ГРОСМАЙСТРАМ



Сярод хадоў, якія даслалі чытачы, трапілася экстравагантнае 11...h5!? Усё-такі перавага аддадзена спакойнаму 11...Kd7-f8 — насамрэч, перш чым атакаваць на флянзе, лепш падцягнуць на яго свае сілы. Гросмайстар гуляе на іншым баку дошкі: 12. Фd1-b3. Як дзейнічаць чорным? Вашых адказаў чакаем да панядзелка, 19:00. E-mail: nn@promedia.by, SMS: 754-04-53, партыя ў І-нэце: bychess.narod.ru.

**Lybin12.pcx. З. Лыбін – чытачы «НН». Ход чорных.**

**Адказ**

1. Те6! Беларуска фарсіравала выгадныя для сябе разьмены: 1...Те6 2. de Фе6 3. Фd6 Фd6 4. Cd6 Tc8 5. Te1, адкрыўшы прастору сланам, захапіўшы лінію е. Неўзабаве белыя выйгралі пару пешак і прымусілі капітуляваць шматвопытную сэрбскую гросмайстарку.

## КАІСА

# Бляндынка, што зруйнавала стэрэатыпы

Адзін з судзьдзяў 49-га чэмпіянату краіны сярод жанчын, што скончыўся 21 сакавіка, зьедліва заўважыў: «У жаночых шахматах усё наадварот, і гэты чэмпіянат не выключэньне». Памылак у партыях шахматыстак хапала: аматары бліцу з клюбу «Ладзьдзя», што гуртаваліся побач з гульнявой заляй, актыўна зь іх пакеплівалі. Дзейнічаў нават падпольны таталізатар са стаўкамі 1:20.

Першае месца заняла адзіная ў Берасьці міжнародная майстарка Ганна Шарэвіч. Ейны вынік — 7,5 бала з 10. «Проста майстарка», чэмпіёнка сталіцы Тацяна Бондар, хоць і адстала на адзін бал, наблізілася да міжнароднага званьня. Рахіль Эйдэльсон зь Віцебску, вэтэранка турніру, выступіла няўдала — 10-е месца з 11. Няўпэўненай гульнёй зьдзівілі і іншыя гросмайстаркі — Генрыета Лагвілава, Вольга Герасімовіч. Падобна, што найвышэйшы тытул нададзены Вользе дачасна. Кіра Зварыкіна, напрыклад, атрымала яго ў 1978 г., пабыўшы чэмпіёнкай БССР, СССР і віцэ-чэмпіёнкай сьвету.

У леташнім першынстве Г.Шарэвіч пацярпела крыўдную паразу ў элемэнтарнай нічыйнай пазыцыі, дзе кожны з бакоў меў па слане і тры пешкі. Але ўдзельніца чэмпіянатаў Эўропы і сусьветных Алімпіяд, чэмпіёнка Беларусі-2002 умее працаваць над сабой: сёлета эндшпіль супраць Г.Лагвілавай яна правяла амаль бездакорна… Бацька Ганны — ён жа й трэнэр — кружляў вакол століку, натхняючы дачку.

Ганна Шарэвіч вучыцца ў Берасьцейскім унівэрсытэце. Мара бляндынкі, аблічча якой даўно кроіць сэрцы партнэрам, гучыць амбітна — «пакінуць добры сьлед на Зямлі». Нейкія разумнікі абвясьцілі конкурс прыгажосьці сярод шахматыстак і вывесілі ў сеціве фота навейстарой беларускай чэмпіёнкі. Калі яна выйграе і гэтае спаборніцтва, Беларусь набудзе шанец ператварыцца ў Нью-Васюкі жаночых шахмат. Усе сьцягі завітаюць да нас толькі дзеля таго, каб убачыць Ганну жыўцом.



«ПРЕССБОЛ»

Застаецца дадаць, што на ўзнагароджваньне прадстаўніц прыгожай паловы чалавецтва ў 2005 г. фэдэрацыя шахмат вылучыла ледзь не ўтрая менш сродкаў, чым на мужчынскі чэмпіянат. Праўда, акрамя грошай прадстаўнік міністэрства спорту ўручыў чэмпіёнцы каляровы тэлевізар.

**ВР**

### Як бы вы згулялі?

**Г.Шарэвіч — С.Пруднікава**
**Афіны, 2003. Ход белых.**



## ВАРТА ПАГЛЯДЗЕЦЬ

### Пятніца, 1 красавіка

**БТ, 12.15**

«Вясёлыя хлопцы».
Расея, 1934, рэж. Рыгор Аляксандраў.

Музычная эксцэнтрычная камэдыя.

Кіназказка пра савецкага пастуха з сэрцам Сымонамузыкі (Леанід Уцёсаў) і пакаёўку (Любоў Арлова), дэбютантку ў Вялікім тэатры.

Першы фільм савецкага камэдыёграфа Р.Аляксандрава. Першае зьяўленьне зоркі Л.Арловай. Першыя парасткі сталінскага кінабарока (пазычаныя ў Галівудзе).

У мэню — п'янае парася на талерцы, сьпевы з катафалкам і хуліганства на сцэне.

**БТ, 18.30**

«Мядзьведзь».
Беларусь, 1938, рэж. Ісідор Аненскі.

Кінавадэвіль.

У 1938 г. кінастудыя «Савецкая Беларусь» сядзела на чамаданах: яна пераяжджала зь Ленінграду ў Менск. Беспрытульны стан спрыяў умоўна-тэатральным творам.

У «Мядзьведзі» (паводле вадэвілю Чэхава) удоўка-памешчыца (першае зьяўленьне на экране Вольгі Андроўскай) сварыцца зь «нестарым памешчыкам»-жанчынаненавісьнікам (Міхаіл Жараў). Свара завершыцца дуэльлю на пісталетах і палкім пацалункам.

Выдатныя акторскія работы. Дэбют Ісідора Аненскага, аўтара «Вясельля».

Але беларускае кіно яшчэ доўга будзе хварэць на тэатар і непрытомнець ад расейскай клясыкі.

### Субота, 2 красавіка

**НТВ, 12.55**

«Чалавек-амфібія».
Расея, 1961, рэж. Генадзь Казінскі, Уладзімер Чабатароў.

Фантастыка, рамантычная мэлядрама.

Экранізацыя аднайменнага твору Аляксандра Бяляева. Іхтыяндар — юнак са шчэлепамі (Уладзімер Коранеў) — і прыгажуня (Настасься Вярцінская). Наіўная экзотыка, песьні і замілавальная шчырасьць падводных здымак.



**«Лад», 17.35**

«Альпійская баляда».
Беларусь, 1965, рэж. Барыс Сьцяпанаў.

Экзыстэнцыйна-гераічная мэлядрама.

Экранізацыя аповесьці Васіля Быкава. Сцэнар да фільму напісаў сам Быкаў, і карціна стала найбольш удалым кінаўвасабленьнем ягонай прозы.

Цнатлівае, трагічнае й сьветлае каханьне паміж беларусам Іванам (Станіслаў Любшын) і італьянкай Джуліяй (Любоў Румянцава) — у экстрэмальных умовах уцёкаў з канцлягеру і на фоне прыгожых Альпаў.

Прырода ажывае — бляск расы на лісьці, палёт пчалы па нэктар, пэйзажы (апэратар Анатоль Забалоцкі).

Калі ў кнізе галоўным героем быў Іван, то ў фільме на першы плян выйшла Джулія. Л.Румянцава стварыла адзін з самых жаноцкіх вобразаў у беларускім кіно: яе гераіня сьветлая, наіўная, запальчывая, добрая і сьмяшлівая, як знойдзеная і выратаваная душа спакутаванага вязьня.

Карл Юнг калісьці пісаў пра Аніму як патаемны жаночы вобраз. Італьянка Джулія ў фільме «Альпійская баляда» — гэта ўвасобленая беларуская Аніма.

**СТВ, 23.50**

«Прынцэса і воін».
Нямеччына, 2000, рэж. Том Тыквэр.

Рамантычная драма.

Мэдсястра Сысі (Франка Патэнтэ) сустракае былога жаўнера Бода (Бэна Фёрман). Але яна — Прынцэса, а ён — Воін. Яна — «тайная кіраўніца псыхіятрычнай клінікі», ён — воін, «бо вядзе бітву супраць самога сябе й сваіх пачуцьцяў».

Як дадае рэжысэр Т.Тыквэр (аўтар стужкі «Бяжы, Лола, бяжы»), «Прынцэса і воін» — «дакладная назва, бо надае гэтым дзіўным, адмысловым фігурам той маштаб, які звычайна характэрны для гістарычных герояў».

Два разьбітыя сэрцы мусяць знайсьці адно аднаго.

Карціна атрымала шэраг нямецкіх і міжнародных узнагарод.

### Нядзеля, 3 красавіка

**БТ, 22.05**

«Уцёкі з Шаўшэнку».
ЗША, 1994, рэж. Фрэнк Дарабонт.

Драма паводле апавяданьня Стывэна Кінга «Рыта Хейуорт і ўцёкі з Шаўшэнку».

Пасьпяховы банкір Эндзі Дуфрэсн (Цім Робінс) абвінавачаны ў забойстве жонкі й яе палюбоўніка і пажыцьцёва зьняволены ў турму Шаўшэнк. У турме Эндзі знаёміцца зь вязьнем Рэдам (ад ягонага імя вядзецца аповед). Рэд (Морган Фрымэн) выдатна прыстасаваны й дасьведчаны, але Эндзі ня траціць надзей на ўцёкі…

Фільмы пра турмы звычайна няўтульныя, але Фрэнк Дарабонт знаны выдатным пляценьнем інтрыгі, годнай працай з акторамі — і казачнымі, мэлядраматычнымі інтанацыямі (гледачы маглі бачыць ягоную карціну «Зялёная міля»).

Фільм «Уцёкі з Шаўшэнку» вылучаўся на шэсьць «Оскараў», у тым ліку за найлепшую карціну. На кінасайце «Imdb.com» карціна займае другое месца ў рэйтынгу.

**Андрэй Расінскі**

## СЬВЯТА

### Гуканьне вясны

**31 сакавіка** гурт «Ветах» супольна з Унівэрсытэтам культуры ладзіць Гуканьне вясны. У праграме — танцавальна-гульнёвая вечарына «Лё», канцэрт з удзелам фальклёрных калектываў «Берагіня», «Верабейкі», «Калыханка», «Жыцьцё». Т. для даведак: 253-24-54 і 754-70-74 (Алена Жукава).

### Дзень Зямлі

Падвядзеньне вынікаў нацыянальнага літаратурнага конкурсу для школьнікаў «Дзень Зямлі-2005» адбудзецца **1 красавіка** а 17.00. Літаратурная гасьцёўня а 19.00. Адрас: вул.-Макаёнка, 8, Рэспубліканскі экалягічны цэнтар.

## ВЫСТАВЫ

**Аўтатэхэкспа**
**Да 2 красавіка** ў павільёне НВЦ «Белэкспа» (вул.Я.Купалы, 27) працуе выстава «Аўтатэхэкспа-2005» — міжнародная выстава аўтатэхнікі, аўтазапчастак, абсталяваньня і аўтасэрвісу.

**ТІБО-2005**
**З 5 да 8 красавіка** ў выстаўным павільёне на Я.Купалы, 27 адбудзецца спэцыялізаваная выстава «Тэлекам. Інфа. Банк. Офіс. Бясьпека. ТІБО-2005».

**Кветачкі, кузурачкі**
**З 6 да 9 красавіка** ў павільёне на Машэрава, 14 адбудзецца V Міжнародная спэцыялізаваная выстава «Кветкі. Насеньне. Сад. Агарод-2005». Жывыя кветкі, зеляніна для аранжыроўкі, інструмэнты аранжаваньня, аксэсуары і ўпакоўка, штучныя расьліны, вырабы з лазы, саломкі…

**Менскі мэблевы салён**
**З 5 да 8 красавіка** ў павільёне НВЦ «Белэкспа» на Машэрава, 14 працуе XI Міжнародная спэцыялізаваная выстава «Менскі мэблевы салён», у рамках якой таксама рэалізуюцца праекты «Кухня» і «Мэблевыя тэхналёгіі».

**Chinese Musical Instruments**
**Да 22 красавіка** ў Нацыянальным музэі гісторыі і культуры (вул. К.Маркса, 12) можна наведаць выставу кітайскіх музычных інструмэнтаў. Квіткі: 2000.

**На сваёй зямлі**
**Да 10 красавіка** ў кінатэатры «Перамога» (вул.Інтэрнацыянальная, 20) працуе фотавыстава Марыны Дрожа «На сваёй зямлі». Уваход вольны.

**Новыя шэдэўры**
**Да 3 красавіка** ў Палацы мастацтваў (Казлова, 3) працуе выстава жывапісу Валер'я Песіна «Новыя шэдэўры». Квіткі: 1500.

## ІМПРЭЗЫ

**Нэда Малунавічутэ ў Менску**
**7 красавіка** ў Палацы прафсаюзаў (пр.Скарыны, 25) адбудзецца канцэрт «Нэда і гіганты балтыйскага джазу». Пачатак у 19:30. Квіткі: 12 500 — 30 000.

**Інтэрфільм-Усход**
**1—3 красавіка** ў Менску пройдзе трэці паказ фэстывалю кароткамэтражнага кіно «Інтэрфільм-Усход». У кінатэатры «Перамога» (вул.Інтэрнацыянальная, 20) штодзень будуць ісьці па два сэансы а 19-й і 21-й. За адзін паказ гледачы змогуць паглядзець адразу 12 новых фільмаў. Гэта будуць карціны з Францыі, Нямеччыны і Скандынавіі. У праграме — некалькі жанраў: іграваe кіно, камэдыя, экспэрымэнт і інш.

У клюбе «Bronx» **2 красавіка** (субота) пройдзе клюбная вечарынка, прысьвечаная фэстывалю.

## ТЭАТРЫ

**Опэра**
**2** (сб) — «Сэвільскі цырульнік».
**5** (аўт) — «Кармэн».
**7** (чц) — «Дзікае паляваньне караля Стаха».
**9** (сб) — «Чароўная флейта».
**10** (ндз) — «Багема».

**Купалаўскі тэатар**
**1** (пт) — «Ідылія».
**2** (сб) — «Кім».
**3** (ндз) — «Паўлінка».
**4** (пн) — «Парфён і Аляксандра».
**6** (ср), **7** (чц) — «Эрык XIV».
**8** (пт) — «Я не пакіну цябе…».
**9** (сб) — «Згублены рай».
**10** (ндз) — «Дзіўная місіс Сэвідж».
**Малая сцэна**
**2** (сб) — «Адчыніце кантралёру!».
**4** (пн) — «Саламея».
**8** (пт) — «Муж для паэткі».
**9** (сб) — «Беларусь у фантастычных апавяданьнях».

**Тэатар беларускай драматургіі**
**2** (сб), **3** (ндз) — «Трыбунал».
**5** (аўт) — «Понцкі Пілат».
**6** (ср) — «Нязваны госьць».
**7** (чц) — «П'емонцкі зьвер».
**8** (пт) — «Валянціна».
**9** (сб) — «Адэль».
**10** (ндз) — «Кабала сьвятош».

**Балет**
**1** (пт) — «Карміна Бурана».
**3** (ндз) — «Стварэньне сьвету».

**Тэатар імя Горкага**
**2** (сб), **3** (ндз) — «Дзядзькаў сон».

**Музычны тэатар**
**1** (пт) — «Арфэй і Эўрыдыка».
**2** (сб) — «Каралева чардашу».
**3** (ндз) — «Цыганскі барон».

**Моладзевы тэатар**
**1** (пт) — «Банкрут».
**3** (ндз) — «Хітрая закаханая».

**Тэатар-студыя кінаактора**
**1**, (пт), **2** (сб) — «Апошняя жанчына сэньёра Хуана».
**3** (ндз) — «Тэатар купца Япішкіна».

## КЛЮБНАЕ ЖЫЦЬЦЁ

**Bronx** (288–10–61, GSM Velcom: 103 і 105)
**31** (чц), 22.00 — dj Laurel.
**1** (пт), 22.00 — «Wally Lopez» (Pacha, Ibiza), dj Noche, dj Dasha Pushkina.
**2** (сб), 22.00 — dj-bar.

**Белая вежа** (84–69–22, 239–16–00)
**31** (чц), 23.00 — «WhiteTower Party»: dj Grizzly, dj Top.
**2** (сб), 23.00 — dj Mihel, dj Alex.
**3** (ндз), 23.00 — dj Dee.

**Ізюм** (206–66–18)
**1** (пт), 23.00 — «Паяц–парад»: dj Mitya, dj Lexa.
**2** (сб), 23.00 — «Freak–dance»: dj Top, dj Lexa.
**3** (ндз), 19.00 — «Pretty Sunday»: dj Noche, dj Laurel, dj Zagar & dj Ewan.

**X-Ray** (223–93–55)
**1** (пт), 22.00 — dj-bar.
**2** (сб), 23.00 — dj-bar.

## КІНО Ў МЕНСКУ

**«Аўрора»** (253–33–60)
«Турэцкі гамбіт» (прэм'ера, 2с): **1—3** (пт—ндз) 13.30 (іл), 16.00, 18.30, 21.00.
«Змотвай вуды»***: **1—3** (пт—ндз) 16.50.
«Жаніх напракат» (прэм'ера): **1—3** (пт—ндз) 19.00, 21.10.
**«Берасьце»** (272-87-91)
«Бой зь ценем»***: **1** (пт) 16.40 (іл), 19.00 (іл), 21.10; **2, 3** (сб, ндз) 16.40, 19.00, 21.10.
«Авіятар» (2с): **1—3** (пт—ндз) 13.30.
**«Дружба»** (240-90-13)
«Блэйд: тройца»***: **1** (пт) 17.00, 19.00, 21.00; **2, 3** (сб, ндз) 16.30 (іл), 19.00, 21.00.
**«Кастрычнік»** (232-93-25)
«Турэцкі гамбіт» (прэм'ера, 2с): **1** (пт) 18.20; **2, 3** (сб, ндз) 13.20 (іл), 18.20.
«Правілы здыманьня: мэтад Хітча» (прэм'ера): **1—3** (пт—ндз) 16.00, 21.00.
**«Масква»** (203-14-48)
«Турэцкі гамбіт» (прэм'ера, 2с): **1—3** (пт—ндз) 14.00 (іл), 18.40, 21.10.
«Правілы здыманьня: мэтад Хітча» (прэм'ера): **1—3** (пт—ндз) 16.30.
**«Мір»** (288-22-33)
«Бой зь ценем»***: **1** (пт) 16.00, 18.20, 20.40; **2, 3** (сб, ндз) 16.00 (іл), 18.20, 20.40.
«Блэйд: тройца»***: **1—3** (пт—ндз) 21.10.
«Жаніх напракат» (прэм'ера): **1—3** (пт—ндз), 17.00, 19.00.
**«Перамога»** (203-77-66)
«Дом лятаючых кінжалаў»***: **1** (пт) 14.20, 16.40; **2, 3** (сб, ндз) 14.20 (іл).
«Блэйд: тройца»***: **2, 3** (сб, ндз) 16.40.
«Інтэрфільм «Усход» — паказ фільмаў міжнароднага бэрлінскага фэстывалю кароткамэтражнага кіно (12 фільмаў за адзін сэанс): **1—3** (пт—ндз) 19.00, 21.00.
**«Піянер»** (227-64-87)
«Нявеста і забабоны»: **1—3** (пт—ндз) 19.00.
«Пракляцьце»***: **1—3** (пт—ндз) 17.00, 21.00.
**«Цэнтральны»** (200-34-16)
«Бой зь ценем»***: **1** (пт) 15.50, 21.00; **2, 3** (сб, ндз) 13.00 (іл), 15.50, 18.30, 21.00.
«Чароўная краіна»: **1—3** (пт—ндз) 13.00.
Кінавечар «Кінэматаграфісты жартуюць»: **1** (пт) 18.30.

(2с) — кінафільм падоўжанай працягласьці
(іл) — ільготны сэанс (зьніжка 50% для ўсіх гледачоў)
Рэйтынгавыя абмежаваньні:
*** — дзеці да 16 год не дапускаюцца;
**** — дарослым з 18 год.

## ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

**Опэра**
**3** (ндз) — «Казка пра Караколя, Вераніку і Горад майстроў».

**Музычны тэатар**
**2** (сб) — «Айбаліт-2002».
**3** (ндз) — «Бураціна.by».

**Тэатар юнага гледача**
**2** (сб) — «Неймаверныя прыгоды Мішуткі і яго сяброў у краіне Казак».
**3** (ндз) — «Паліяна».
**5** (аўт), **6** (ср) — «Гісторыя каханьня Паласатага Ката і сэньярыты Ластаўкі».
**7** (чц) — «Маленькія трагедыі».
**8** (пт) — «Якая стварыла цуд».
**9** (сб) — «Маленькі лорд Фаўнтлерой».
**10** (ндз) — «Папялушка».

**Купалаўскі тэатар**
**2** (сб) — «Афрыка».
**3** (ндз) — «Паўлінка».
**10** (ндз) — «Ажаніцца — не журыцца».

**Тэатар беларускай драматургіі**
**3** (ндз) — «Хрустальны туфлік».
**10** (ндз) — «Воўк-мараплавец».

**Кіно для дзяцей**
**«Аўрора»**
«Шчаўкунок»: **1, 2** (пт, сб) 10.30; **3** (ндз) 11.30.
«Падводная братва»: **1—3** (пт—ндз) 14.40.
«Гары Потэр і вязень Азкабану»: **1—3** (пт—ндз) 12.00.
**«Берасьце»**
«Пінокіё-3000»: **1** (пт) 11.00; **2, 3** (сб, ндз) 12.00.
**«Дружба»**
«Лемані Сьнікет: 33 няшчасьці»: **1** (пт) 10.30, 13.00; **2, 3** (сб ндз) 11.20, 13.00.
**«Масква»**
«Чароўны востраў»: **3** (ндз) 12.30.
**«Мір»**
«Лемані Сьнікет: 33 няшчасьці»: **1—3** (пт—ндз) 12.00.
«Дзеці шпіёнаў-3D: гульня скончана»: **1—3** (пт—ндз) 14.00.
«Супэрсямейка»: **1** (пт) 10.30, 13.00, 15.00; **2, 3** (сб, ндз) 13.00, 15.00.
**«Перамога»**
«Алёша Паповіч і Тугарын зьмей»: **1—3** (пт—ндз) 12.30.
**«Піянер»**
«Дунечка»: **1** (пт) 12.00; **2, 3** (сб, ндз) 14.00.
«Падводная братва»: **1** (пт) 10.20; **2, 3** (сб, ндз) 12.00.
«Палёт у краіну пачвар»: **1** (пт) 14.00.
«Шрэк-2»: **2, 3** (сб, ндз) 10.20.
**«Цэнтральны»**
«Гарфілд»: **1—3** (пт—ндз) 11.00.




## КІНО НА DVD

MASTER RECORDS

### «Доўгія заручыны»

Гістарычная мэлядрама, Францыя, 2004, рэж. **Жан-П'ер Жэнэ**.
У ролях: **Одры Тату, Джодзі Фостэр, Дамінік Пінон**.
Гераіня з сэрцам і паводзінамі Амэлі шукае жаніха, згубленага ў Першую сусьветную вайну. Каханьне, іронія і прыгоды ад Ж.-П.Жэнэ.

### «Знаёмцеся, ваша ўдава!»

Камэдыя, Францыя, 2003, рэж. **Катрын Карсіні**.
У ролях: **Джэйн Біркін, Эмілі Дэкен, П'ер Рышар**.
Бабуля даводзіць да сьмерці багатых мужоў. Да шлюбнага бізнэсу яна далучае й унучку…
Менск, Кісялёва, 12, тэл. 643-21-08

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Імпэрыя наносіць удар у адказ


WWW.KINOMANIA.RU

«Турэцкі гамбіт» («Турецкий гамбит»)
Расея, 2005, каляровы, 130 хв.
**Жанр:** ваенна-гістарычны дэтэктыў
**Адзнака:** 5 (з 10)

Карціна «Турэцкі гамбіт» замацоўвае нэаімпэрскі стыль расейскага кіно. Яговыя складнікі — касьцюмчыкі і настальгія ад «Сібірскага цырульніка» (стварала фільм студыя Міхалкова «ТрыТэ»), спэцэфэкты і кліпавыя выкрунтасы ад «Начной варты»; бульварнае начыньне і прыгоды — ад папулярнага Барыса Акуніна.

«Турэцкі гамбіт» — экранізацыя яго раману пра тытулярнага дарадцу Эраста Фандорына. Фільм — ня лепшы і ня горшы за пасьпяхова забытага гледачамі «Азазэля» — першы фільм з сэрыі пра расейскую міс Марпл у нагавіцах.

У «Гамбіце» Эраст Фандорын (Ягор Бяроеў) мусіць выкрыць шпега ў расейскім штабе падчас расейска-турэцкай вайны. У гэтым яму дапамагае імпэтная Варвара Суворава (Вольга Красько), якая прыехала ў адведкі да жаніха і пастаянна блытаецца пад нагамі.

Галоўныя героі — стандартныя тыпажы, надта неглыбокія, каб стацца адкрыцьцём, і не занадта павярхоўныя, каб выклікаць раздражненьне. На іх фоне лепей глядзяцца пэрсанажы другога пляну: нечакана аб'ёмным падаецца Гоша Куцэнка ў ролі турэцкага афіцэра, а Ўладзімер Ільін, хаця й апранае звыклую маску вайсковага апекуна, у фільме на сваім месцы.

Але нават таленавітыя акторы мусяць граць не напоўніцу: маскультавыя вобразы для расейскага спажываньня абавязваюць. Фільм Джаніка Фазіева — гэта ўдала апранутыя ў шаты гістарычнага дэтэктыву «Старыя песьні пра галоўнае-2» (Фазіеў быў стваральнікам знанага тэлепраекту).

Расстраляныя сланечнікі рапідам — гэта не Даўжэнка, а стэрыльна-глямурны намёк на Ван Гога, прыстасаванага да рэстараннай кухні; далікатна-бутафорскія галовы, адсечаныя башыбузукамі, — пікантная дэталь для нэрвовых дамачак; а сінія акуляры здрадніка скрадзены ў шпегаўскіх жанраў — і перафарбаваны для канспірацыі ды лепшага продажу.

Гераіня нават сьпявае песеньку, каб асобным прыхільнікам спадабалася, але самая «галоўная песьня пра старое» — расейскія жаўнеры ў Канстантынопалі.

У гісторыі не адбылося — затое ў кіно мары спраўдзіліся.

**Андрэй Расінскі**

ЛЕВЫМ ВОКАМ

# Калі б я быў Якубовічам


ГЛЕБ ЛАБАДЗЕНКА

Ня трэба змагацца з аксамітнымі рэвалюцыямі, трэба іх правільна асьвятляць. Фэльетон **Лёліка Ушкіна**.

На месцы паважанага спадара Якубовіча, паглядзеўшы сюжэты з Кыргызстану, я б адразу сабраў рэдакцыйную плянэрку і, запаліўшы брэндавую рэдактарскую люльку, разрадзіўся прамовай прыблізна наступнага зьместу: «Шаноўнае спадарства, я сабраў вас, каб выказаць незадавальненьне нашай формулай асьвятленьня фруктовых рэвалюцый. Напрыклад, у краіне X пачалася аксамітка. Што мы муцілі, прачытаўшы тэлефакс? Правільна, па-першае, пісалі, што апазыцыя — гэта ганг сорасаўскіх наймітаў, потым гналі пургу пра крымінальнае бязьмежжа і эканамічную дупу — натуральны вынік дэмакратычных перамен. Па ходзе перамогі дэмакратаў мы асьцярожна прызнавалі, што папярэдні рэжым нарабіў да храна фігні (як жа інакш, калі там не было рыначнага сацыялізму!) і пратэсты былі сапраўды абумоўленыя. Усё выходзіла быццам лягічна: нездаволены піпл выйшаў на пляц, і ўся іх праблема ў тым, што на Майдане не было трансьляцыі прэзыдэнцкай сэлектарнай нарады па правядзеньні пасяўной. У выніку людзі сталі зомбі нейкіх дэмакратычных трыбунаў.

У лякальным варыянце гэты падыход яшчэ канае. Аднак мары Лява Троцкога збываюцца: рэвалюцыйны працэс стаў пэрманэнтным. І паступова, як кажуць кампутаршчыкі, мы «падвісьлі».

Праз пару месяцаў пасьля падзей у краіне X аналягічныя працэсы распачынаюцца ў краіне Y. Адпаведна з напрацаванай схемай, мы ціскаем у газэце тое, што і раней, указваючы, што ў адрозьненьне ад краіны X у Y няма падстаў для рэвалюцыі. Але дэмакраты зноў перамагаюць. І мы вымушаны зноў прызнаваць наяўнасьць падстаў для фронды. У выніку выходзіць нейкая шыза. Яшчэ дзьве-тры рэвалюцыі — і сталыя падпісчыкі нашага бэабахтэру будуць думаць, што тут сядзяць нейкія тармазы, якім, каб дагнаць простую ісьціну, трэба некалькі месяцаў.

Закладнікамі нашага ноў-хаў становіцца ўрад, які вымушаны працаваць з дэмакратамі з суседніх краін. Пастаўце сябе на месца новага прэзыдэнта краіны X пана Ю., якога, вы, Каця Пранік, помніце, неяк параўналі з Франкенштайнам. Сядзіць ён неяк у сваёй рэзыдэнцыі, п'е сабе «Абалонь», а яму на стол хрась — тэлеграму ад Сідорскага з просьбай пашырыць квоту на імпарт бюстгальтараў «Мілавіца». Што скажа пан Ю. на прапанову Сідорскага? Скажа: «Няхай тыя станікі Каця Пранік і носіць». А ў выніку загібаецца ўвесь айчынны трыкатаж.

Час дыктуе шукаць новыя цікавыя канцэпты, тым больш што на носе новыя рэвалюцыі. Галоўная задача — выставіць іх як нешта абсалютна не пагражальнае, а наадварот, нават спрыяльнае для стабільнасьці нашай дзяржавы.

Правядзём трэнінг. Напрыклад, прыйшла навіна, што ў Казахстане пачалася рэвалюцыя. Апазыцыя выйшла на пляц і атакуе караван-сарай, ці як там у іх называецца назарбаеўская маліна? Якія могуць быць нашы трактоўкі працэсаў? Бачу некалькі падыходаў.

Можна выйсьці пад шапкай «Нябачаны для Казахстану ўраджай марыхуаны справакаваў выбух грамадзкай актыўнасьці». Гэта крайні варыянт. Аптымальна паднесьці апазыцыянэраў як фанатаў беларускай мадэлі. Накапаць некалькі цытат з Сораса, які, дарэчы, падаўся ў антыглябалізм, а мясцовую казаскую «Пору» прадставіць як аналяг БРСМ.

Пакуль ідэальнага выйсьця ня бачу. Трэба думаць. Адным словам, шаноўныя журналісты, ідзіце і раджайце прапановы. Каб кожны да заўтрашняй плянэркі падрыхтаваў рэзюмэ: «Чаму падзеньне рэжыму Назарбаева дапаможа трыюмфу беларускай зборнай на Алімпіядзе ў Пэкіне».

Вось што я б сказаў, калі б быў Якубовічам.


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Гэта не Кіргізія, гэта Арменія. Пра Кіргізію — старонка 4, пра Арменію — старонка 10.**

Матэрыял «Новы клопат МНС» (**старонка 2**) просім лічыць першакрасавіцкім жартам. Рэдакцыя віншуе ўсіх чытачоў з Днём сьмеху.



Прыватную абвестку ў «НН» (ня больш за 15 словаў) можна падаць звычайным лістом (а/с 537, 220050, Менск), а таксама электроннай поштай на адрас nn@promedia.by або разьмясьціўшы на форуме сайту www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ВІТАНЬНІ

**Ігара Мацьвеева і Тацяну Чабатарову** віншуем з Днём народзінаў. Зычым посьпехаў у сьвятой справе. Алесь і Зьмітрок

### КАНТАКТЫ

**Сапраўдная беларуская** дзяўчына з Мэдычнага ўнівэрсытэту (тая, што на фатаздымку знаходзіцца акурат пасярэдзіне, з кубачкам у руках), сапраўдны беларускі хлопец жадае з Вамі пазнаёміцца. Напішыце, калі ласка. E-mail: avija@tut.by

**Прашу парады** ў знаўцаў паэзіі — калі лепш праводзіць **сьвята вольнай беларускай паэзіі** сёлета ў Ляўках: з 25 на 26 чэрвеня ці з 9 на 10 ліпеня? E-mail: buongiorno@tut.by, Віктар

**Куплю ўзнагароды** БНР, БЦР, БКА, манэты ВКЛ, Рэчы Паспалітай, фота ваенных (беларускія нацыянальныя фармаваньні часоў 2-е сусьветнае вайны). E-mail: zmagar@yahoo.com. Т.: 722-46-04

**Цікавіць інфармацыя**, дакумэнты, фота, зьвязаныя з Булак-Балаховічам, «Зялёным дубам», «Чорным катом», беларускай партызанкай, — набуду. E-mail: zmagar@yahoo.com. Т.: 722-46-04.

### КНІГІ

**Новыя рэлізы ад «БМА-group»**: «Вандроўка» ад «Postscriptum», «Вясна-красна» ад «Яру», «Усё дзеля Вас» ад «Зьмяі», «Ігры багоў» ад «Guda», «Bionik@» ад «Zigzag» і інш. Маецца вялікі выбар беларускай музыкі. А/с 5, 220085, Менск; e-mail: w1979@tut.by; www.BMA.home.by; Т.: 649-08-88, 766-24-25

**Кнігі — поштай**. Замаўляйце каталёг: поштай — а/с 333, 220050, Менск, e-mail: exlibris@tut.by, www.knihi.net, т.: 643-57-33

**Кнігі — поштай. Новае**: «Arche-Пачатак» №1, №2/2005; «Дзеяслоў» №12—14; «Дзіцячая Біблія (біблейскія апавяданьні з малюнкамі)»; Б.Пятровіч, «Шчасьце быць...»; Ю.Станкевіч, «Сатырыкон»; В.Мэры, «Маршал Фінляндыі Карл Густаў Манэргейм»; Ц.Клыкоўская, «Саюз беларускай моладзі — вяртаньне з забыцьця»; Н.Гардзіенка, «Беларусы ў Аўстраліі: да гісторыі дыяспары». Т.: 643-57-33, e-mail: exlibris@tut.by

**Кнігі — поштай. Новыя CD**: «Стары Ольса» — «Скарбы літвінаў — Рэнэсанс» і «Скарбы літвінаў — Сярэднявечча», «Kamaedzitca» — «Дзеці лесу», С.Манюшка — «Песьні з-над Нёмна й Дзьвіны на вершы Яна Чачота», «Крамбамбуля» — «Радыё «Крамбамбуля» 0,33 FM». Т.: 643-57-33, e-mail: exlibris@tut.by

**Кнігаабмен**. Дапамагу знайсьці патрэбную кнігу. Т.: 753-91-96

**«Беларуска-расейскі слоўнік»** Байкова ды Некрашэвіча, «Слоўнік лінгвістычных тэрмінаў» Юрэвіча, «Расейска-беларускі вайсковы слоўнік», энцыкляпэдыі «Этнаграфія Беларусі», «Архітэктура Беларусі», іншыя кнігі. Аўдыё, відэа, CD на Румянцава, 13 (ТБМ) ад панядзелка да суботы (13:00—18:40). Т.: 707-40-01

**«Нацыяналізм у XX ст»** Э.Сьміта, кнігі ды энцыкляпэдыі па этнаграфіі, архітэктуры. Для дзяцей, слоўнікі. Аўдыё, відэа, CD на Румянцава, 13 (ТБМ) ад панядзелка да суботы (13:00—18:40). Т.: 707-40-01

**Прадам кнігі**: энцыкляпэдыя «Археалёгія і нумізматыка Беларусі», «Наша Ніва» (факс. выд. 1910 г.), «Армія Краёва», «Дуліна ад Барадуліна», В.Грыцкевіч, «Міты і гісторыя», «Беларускі народны арнамэнт», аўт.Кацар, ды інш. Т.: 753-70-05

**Прадам кнігі**: творы Я.Пушчы, У.Галубка ў 2-х т., Я.Дылы, А.Лойкі ў 2-х т., Г.Гайнэ, С.Грахоўскага, У.Уітмэна. Т.:753-70-05

**Прадам** «Этымалягічны слоўнік беларускай мовы» (т.3—7), «Гістарычны слоўнік беларускай мовы» (т.2). Т.: 213-73-62

**Прадам** «Гісторыю беларускага мастацтва» (т.1—5), «Морской энциклопедический справочник». Т.: 213-73-62

**Набуду слоўнік** Насовіча, слоўнік Ластоўскага, энцыкляпэдыю Беларусі, кнігі па гісторыі, архітэктуры, фальклярыстыцы, ткацтве, арнамэнталістыцы, краязнаўстве. Т.: 229-27-89

**Новыя ды старыя** нумары «Arche», кнігі па гісторыі, архітэктуры, мовазнаўстве, літаратуры, падручнікі, слоўнікі, календары, значкі на Румянцава, 13 (ТБМ) ад панядзелка да пятніцы (12:30 — 18:30). Т.: 707-40-01

**Куплю** 4-ты том Энцыкляпэдыі гісторыі Беларусі. Т.: 288-14-52 (увечары) альбо 402-56-78

### ПРАЦА

**Якасна выканаю** пісьмовыя работы па беларускай гісторыі, літаратуры і мове. Зьвяртацца загадзя пасьля 17-й. Т.: 235-18-72. Юры

**Наша Ніва**
незалежная газэта
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| галоўны рэдактар | Андрэй Дынько |
| фотарэдактар | Арцём Лява |
| нам. галоўнага рэдактара | Андрэй Скурко |
| тэхнічны рэдактар | Андрэй Чык |
| мастацкі рэдактар | Сяргей Харэўскі |
| выдавец і заснавальнік | Фонд выданьня газэты «Наша Ніва» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.
Наклад 3528. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 21.30 30.03.2005.
Замова № 1777.
Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а